Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

1 КАСТРЫЧНІКА 2008 г.
СЕРАДА
№ 185
(26298)

Кошт 500 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 Г.

Прамая лінія

НАШ АДКАЗ ДЗІЦЯЧЫМ ІНФЕКЦЫЯМ

Як засцерагчы дзіця ад інфекцыйных хваробаў і прадухіліць ускладненні, выкліканыя апошнімі? Якія інфекцыі будуць «уладарыць» гэтай восенню і зімой? Аб усім гэтым можна распытаць **Іну Генадзьеўну ГЕРМАНЕНКУ, дацэнта, загадчыцу кафедры дзіцячых інфекцыйных захворванняў Беларускага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта, галоўнага пазаштатнага спецыяліста Міністэрства аховы здароўя Рэспублікі Беларусь па дзіцячых інфекцыйных захворваннях.**

Задаць свае пытанні можна па нумарах рэдакцыі: 8 (017) 292 38 21 і 292 38 92 СЁННЯ, з 13.00 да 14.00.

Беларусь і Еўропа павінны пачаць нармальны палітычны дыялог і ўстараніць штучныя бар'еры, якія гэтаму перашкаджаюць

Аб гэтым заявіў 30 верасня Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр Лукашэнка на сустрэчы з Віцэ-старшынёй Парламенцкай Асамблеі АБСЕ, кіраўніком місіі кароткатэрміновых наглядальнікаў АБСЕ на парламенцкіх выбарах у Беларусі Ан-Мары Лізен.

Прэзідэнт Беларусі заклікаў наглядальнікаў ад АБСЕ не спяшацца даваць якую-небудзь ацэнку парламенцкім выбарам у Беларусі пад дыктоўку якой-небудзь дзяржавы. Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што беларускі бок «не чакаў рэвалюцыйных прызнанняў».

«З майго пункту гледжання, вы сказалі самае галоўнае: нашы выбары праведзены ў адпаведнасці з нацыянальным заканадаўствам. Якія ні былі б законы ў краіне, іх трэба выконваць. Пакуль існуюць законы і яны не зменены, краіна і яе грамадзяне павінны жыць выключна па гэтых законах. Гэта аксіёма. Горш было б, калі вы сказалі б, што ў Беларусі гэты важны працэс не адпавядаў нацыянальным законам. Вось тады людзі ідуць на лаву падсудных», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Прэзідэнт нагадаў, што ў рэспубліцы адказнасць за парушэнне выбарчага заканадаўства была ўзмоцнена двойчы і цяпер яна вельмі высокая.

«Для мяне як кіраўніка дзяржавы, які з'яўляецца гарантам Канстытуцыі і выканання закона, гэта прызнанне, што выбары прайшлі ў адпаведнасці з нацыянальным заканадаўствам, — самая галоўная ацэнка. Дзіўна было б, калі яны прайшлі б у адпаведнасці з іншымі законамі», — дадаў беларускі лідар.

Аляксандр Лукашэнка таксама адзначыў, што ўважліва азнаёміўся з папярэднім заключэннем наглядальнікаў ад АБСЕ. «Думаю, вы павінны яшчэ вельмі сур'ёзна аналіць усё, што зроблена ў Беларусі ў перадвыбарны перыяд, перш чым пісаць канчатковае заключэнне», — сказаў Прэзідэнт.

«Будзе вельмі вялікай памылкай Еўропы, калі ад нас будуць патрабаваць паляпшэння адносінаў з Еўрасаюзам за кошт пагаршэння адносінаў з Расіяй. У нас традыцыйна добрыя адносіны з расіянамі. І не думаю, што Еўропе будуць выгадны дрэнныя адносіны Беларусі з Расіяй. Як бы там ні было, сама Еўропа разлічвае на паляпшэнне адносінаў з РФ. Таму, калі ад нас будуць патрабаваць, каб мы палепшылі адносіны з вамі за кошт расійскага вектара, мы на гэта ніколі не пойдзем», — падкрэсліў Прэзідэнт.

Пры гэтым Аляксандр Лукашэнка выказаў упэўненасць, што беларускі бок зможа «знайсці тую раўнадзейную, якая будзе цікавая і Беларусі, і Еўропе, і Расіі».

«Мы ў гэтым напрамку гатовы зрабіць усё. Але не хачу, каб вы ўспрымалі гэта так, што ў нас ужо такая сітуацыя, што мы гатовы паўзком паўзці ў Еўрапейскі саюз або ў АБСЕ, ПАСЕ і г.д. У нас такой сітуацыі няма», — дадаў кіраўнік дзяржавы.

Беларусь чакае ад Еўропы адмены ўсякіх санкцый, якія еўрапейцы ўвялі, пакрыўдзіўшы краіну.

«Трэба зняць «жалезную заслону» і не размаўляць пра агароджу як дрэнныя суседзі, а пачаць нармальны палітычны дыялог», — перакананы кіраўнік дзяржавы.

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што Беларусь ніколі не парушала ўзятых абавязацельстваў. «Вы павінны ведаць, што калі мы дамовімся, беларусы заўсёды сваё слова стрымаюць. І калі ў палітычным і эканамічным супрацоўніцтве Еўропа зробіць два крокі, то мы зробім пяць», — заявіў Прэзідэнт.

Кіраўнік беларускай дзяржавы адзначыў, што чакае паслядоўнасці ад Еўропы. «Вы заўсёды крытыкавалі Савецкі Саюз за тое, што ён выбудаваў на граніцы нейкую «жалезную заслону» і адгарадзіўся ад усяго свету і Еўропы. Правільна! Дык навошта ж вы цяпер вакол нас гэту металічную агароджу ўзвялі? Мы чакаем адмены ўсякіх санкцый, якія вы ўвялі, пакрыўдзіўшы беларускі народ», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Паводле яго слоў, Еўропа «прынамсі, па дзвюх прычынах не мела права ўвесці супраць беларусаў нават самых нязначных санкцый». «Па-першае, у Другой сусветнай вайне мы страцілі кожнага трэцяга чалавека, мы абаранялі ўсю Еўропу. Па-другое, чарнобыльская трагедыя: не мы будавалі станцыю, не мы яе абслугоўвалі і не мы яе ўзарвалі. Але 85 працэнтаў няшчасцяў выпала на нашу галаву. Навошта ж вы яшчэ нам падкідваеце нейкі «еўрапейскі чарнобыль», уводзячы санкцыі і прэсінгуючы нашу краіну, наш народ? У чым жа беларускі народ вінаваты перад Еўропай? Мы цудаў ад вас не чакаем і не просім, як іншыя дзяржавы, каб нам давалі грошы, каб нас прымалі ў Еўрасаюз. Давайце нармальна супрацоўнічаць», — сказаў Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка асабліва падкрэсліў, што беларусы не хочуць жыць за кошт еўрапейцаў, а могуць самі зарабіць сабе на жыццё. «Але размаўляць трэба. Яшчэ раз падкрэсліваю: калі Еўропа не гатова да гэтага, вы нам скажыце, мы зразумеем і не будзем настойваць на іншым», — дадаў кіраўнік дзяржавы. Ён таксама заўважыў, што візавыя абмежаванні ў адносінах да асобных афіцыйных асобаў Беларусі «ў шэрагу праблем стаяць на апошнім месцы».

«У Еўропе пачынаюць ужо разумець, што зрабілі вельмі неразумны крок. Гэта проста не характэрна для старой Еўропы. Што гэта за пазіцыя: мы не пусцім вас у Германію, Аўстрыю, Нідэрланды. Не пусціце — не трэба, а мы вас усіх будзем пускаць у Беларусь! Гэта такі асіметрычны адказ», — заявіў Аляксандр Лукашэнка.

Кіраўнік дзяржавы таксама назваў ганьбай Еўропы візавыя абмежаванні. «А паставіць наш народ у іншыя ўмовы ў параўнанні з Украінай і Расіяй па візах — гэта наогул уніжэнне Еўропы», — лічыць Аляксандр Лукашэнка.

«Я не раіў бы Еўропе глядзець на Беларусь вачамі асобных збанкрутаваўшых палітыкаў ад так званай апазіцыі ў нашай краіне. Што такое апазіцыя? Вы бачылі. І калі вы да выбараў гаварылі нам і сігналізавалі аб тым, што мы павінны даць магчымасць грамадзянам краіны абмеркаваць вынікі выбараў на плошчы і ні ў якім разе не разганяць і не выкарыстоўваць сілу, я сам сабе падумаў: дзякуй Богу, што наглядальнікі ўбачаць, як нашы грамадзяне на плошчы будуць абмяркоўваць вынікі выбараў. Я папярэдзіў кіраўнікоў сілавых органаў, каб ніводнага з сілавікоў і блізка там не было: няхай пані Лізен са сваімі калегамі паглядзіць на нашу апазіцыю. Я чакаў там 400 чалавек (гэта заўсёды быў іх колькасны склад), прыйшлі 250. Я гэта гавару таму, каб вы ні ў якім разе не ацэньвалі нас з падачы гэтай кучкі людзей», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы.

Аляксандр Лукашэнка дадаў, што гэта частка беларускага грамадства, безумоўна, мае права голасу. «Няхай яны выказваюць свой голас, але майце на ўвазе, што ў нас акрамя іх ёсць яшчэ 10 млн чалавек. І гэтыя 10 млн сваё слова сказалі дэмакратычным чынам на выбарах», — дадаў беларускі лідар.

Звяртаючыся да віцэ-старшыні Парламенцкай Асамблеі АБСЕ, Прэзідэнт падкрэсліў: «Мы чакаем ад вас большага, чым вы сказалі папярэдне. Нягледзячы нават на тое, што на вас будзе аказвацца вельмі жорскі націск з боку асобных членаў АБСЕ. Так здарылася, што ад вашага слова будзе многае залежаць у развіцці Еўропы, таму што сёння нельга праіграваць Беларусь, якая знаходзіцца ў вашым сярцы — цэнтры Еўропы».

Беларусь будзе ўдзячная заходняму свету за прадаўжэнне супрацоўніцтва ў пераадоленні наступстваў чарнобыльскай аварыі.

Аляксандр Лукашэнка падзякаваў Ан-Мары Лізен за дапамогу ў вырашэнні чарнобыльскіх праблем. «Для нас гэта вельмі актуальнае пытанне, таму што гэта звязана са станам здароўя, дабрабытам, перш за ўсё, нашых дзяцей. Таму, калі ў гэтым напрамку будуць нейкія прапановы, пажаданні, просьбы штосьці яшчэ сумесна зрабіць і будзе жаданне далей сумесна працаваць, накіраваць магчымасці заходняга свету на дапамогу нашым людзям, мы былі б вельмі ўдзячны», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы.

Ён прапанаваў Ан-Мары Лізен выказаць свае пажаданні па чарнобыльскай праблематыцы да ад'езду з Беларусі на сустрэчы з міністрам замежных спраў нашай краіны. «Усё, што вы скажаце па чарнобыльскай праблематыцы, мы неадкладна рэалізуем», — запэўніў Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка таксама выказаў меркаванне, што пункт гледжання, што выказваюць наглядальнікі АБСЕ адносна выбараў, не заўсёды супадае з пунктам гледжання пяці дзесяткаў дзяржаў — удзельніц.

«Я думаў над вашымі словамі аб тым, што перадвыбарная кампанія ў Беларусі праходзіць не зусім так, як на Захадзе і неяк сумнавата. Тут я з вамі на 100 працэнтаў згодны. Але таму ёсць тлумачэнне. У нас парламенцкія выбары — не галоўныя. Галоўныя — прэзідэнцкія выбары. Калі б мы аб'ядналі выбары і выканаўчай і заканадаўчай улады, то ў нас было б шуму і трэску столькі!» — сказаў беларускі лідар.

(Заканчэнне на 2-й стар.)

КАПЯЛЮШ ДЛЯ СЛАНЕЧНІКА

Жыхар вёскі Ціхаволя Свіслацкага раёна Мікалай МІЛЬКО «апранае» сланечнікі ад птушак.

Фота Анатоля КЛЕЩУКА

Выбары ў Беларусі прайшлі свабодна і ў адпаведнасці з міжнароднымі стандартамі

Выбары ў Беларусі прайшлі свабодна, дэмакратычна, у адпаведнасці з нацыянальным заканадаўствам і міжнароднымі стандартамі, якія прад'яўляюцца да арганізацыі выбараў. Такую ацэнку даў у час сустрэчы з Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь Аляксандрам Лукашэнкам старшыня Выканкама СНД — выканаўчы сакратар Садружнасці Сяргей Лебедзеў.

Аляксандр Лукашэнка падзякаваў наглядальнікам СНД за аб'ектыўную ацэнку праведзеных у краіне парламенцкіх выбараў.

Пры гэтым Прэзідэнт падкрэсліў, што ні ў адной краіне выбары не могуць быць ідэальнымі, але разам з тым была пастаўлена задача правесці іх адкрыта, празрыста, што і было зроблена.

«Мы хацелі паказаць усім, хто сюды прыехаў, рэальную сітуацыю, бо на Захадзе часта кажуць, што мы, маўляў, так трымаем выбарчы працэс пад кантролем, што ён, быццам бы, фальсіфікаваны ад пачатку да канца. І галоўнае, каб паглядзелі, што гэта за апазіцыя такая, якая манапалізавала адносіны з Захадам, і ў выніку Захад размаўляў з намі мовай апазіцыі. Вельмі было важна, каб убачылі рэальную сітуацыю», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

Прэзідэнт адзначыў, што ён быў рады пачуць пазітыўныя ацэнкі ўбачанага ад віцэ-старшыні Парламенцкай асамблеі АБСЕ, кіраўніка місіі кароткатэрміновых наглядальнікаў АБСЕ на парламенцкіх выбарах у Беларусі Ан-Мары Лізен. На сустрэчы з ёй Аляксандр Лукашэнка заявіў аб немагчымасці пабудовы адносінаў з Еўропай ва ўрон адносінам Беларусі з Расіяй. «Яна сказала, што Захаду гэта абсалютна не трэба», — дадаў Прэзідэнт.

Пры гэтым Аляксандр Лукашэнка запэўніў, што зробленыя наглядальнікамі заўвагі будуць улічаны. «Для нас гэта будзе своеасаблівая работа над памылкамі. Будучыя выбары стануць ідэальнымі з пункту гледжання выбарчага працэсу», — падкрэсліў кіраўнік беларускай дзяржавы.

Сяргей Лебедзеў заявіў, што, з пункту гледжання місіі СНД, выбары ў Беларусі прайшлі свабодна, дэмакратычна, у адпаведнасці з нацыянальным заканадаўствам і міжнароднымі стандартамі, якія прад'яўляюцца да арганізацыі выбараў.

Паводле слоў кіраўніка Выканкама СНД, пазітыўная ацэнка выбарчай кампаніі заснавана на аб'ектыўнай інфармацыі, якая штодзень на працягу двух месяцаў паступала ад больш як 400 наглядальнікаў місіі Садружнасці, што прадстаўляюць усе краіны гэтай арганізацыі. Наглядальнікі ад СНД пабывалі ва ўсіх 110 акруговых выбарчых камісіях, і ў іх была цудоўная магчымасць назіраць ход выбараў у цэлым па краіне. «У наглядальнікаў ад СНД было больш магчымасцяў для назірання, чым у прадстаўнікоў заходніх місій, паколькі мы прыехалі раней і колькасць нашай місіі на першапачатковым этапе была большая», — сказаў Сяргей Лебедзеў. Ён выказаў удзячнасць беларускаму боку за ўсямерную падтрымку і магчымасць доступу да любой інфармацыі ў час правядзення выбараў. «Мы сустракаліся з выбаршчыкамі, прадстаўнікамі палітычных партый, участковых выбарчых камісій, іншымі наглядальнікамі», — сказаў старшыня Выканкама СНД.

Сяргей Лебедзеў адзначыў, што ў прадстаўнікоў краін СНД агульны менталітэт, ёсць разуменне сітуацыі ў краіне. Ён выказаў іх агульны пункт гледжання, што ў Беларусі за апошнія гады адбылася пазітыўная змяненні ў арганізацыі выбарчага працэсу. І заходнія наглядальнікі таксама канстатавалі, што ёсць істотныя пазітыўныя зрухі ў выбарчым працэсе.

Паводле слоў Сяргея Лебедзева, да вечара 28 верасня не было разыходжанняў у ацэнках ходу выбарчай кампаніі з боку місіі СНД і еўрапейскіх наглядальнікаў. Яны адзначалі пазітыўны ход выбараў, і вечарам канстатавалі агульныя ацэнкі. Мяне здзівіла, калі раніцай 29 верасня яны гаварыць, што не могуць канстатаваць, што выбары адпавядаюць нормам АБСЕ. Міжвольна ўзнікае адчуванне, што захоўваецца двайны падыход, двайная мараль або ў іх ёсць нейкая на гэта ўстаноўка», — сказаў Сяргей Лебедзеў.

Пры гэтым ён падкрэсліў, што місія ад СНД задаволена тым, як у Беларусі рыхтаваліся да выбараў і як яны праходзілі. Ён сам пабываў у чатырох абласцях — Брэсцкай, Гомельскай, Магілёўскай і Мінскай. Асабіста размаўляў з выбаршчыкамі, пытаўся пра іх меркаванні. Ніякіх заўваг наконт парушэння правоў выбаршчыкаў і перашкоды іх волевыяўленню адзначана не было.

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Народы Беларусі, Расіі і Украіны маюць непарыўныя духоўныя і культурныя сувязі

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка павіншаваў арганізатараў і ўдзельнікаў выстаўкі «Праваслаўны абраз Расіі, Украіны, Беларусі» з адкрыццём экспазіцыі ў Мінску.

Гэты ўнікальны праект, які праходзіць у год святкавання 1020-годдзя Хрышчэння Русі, сімвалізуе непарыўныя духоўныя і культурныя сувязі брацкіх народаў, іх адданасць праваслаўным традыцыям, ідэалам і каштоўнасцям, гаворыцца ў віншаванні.

«Упершыню ў гісторыі экспазіцыя аб'ядноўвае шэдэўры іканапісу з найбуйнейшых музейных збораў трох краін — найвялікшыя святыні і выдатныя ўзоры высокага мастацтва, — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы. — Правядзенне выстаўкі з'яўляецца яшчэ адным важным крокам на шляху асэнсавання бясцэннай спадчыны славянскай культуры, якая ўвасабляе аснову адзінства беларусаў, рускіх і ўкраінцаў».

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 01.10.2008 г. (для б/н разлікаў)

1 долар ЗША	2 111,00
1 еўра	3 032,35
1 латвійскі лат	4 281,51
1 літоўскі літ	878,45
1 чэшская крона	122,54
1 польскі злоты	888,11
1 расійскі рубель	83,20
1 украінская грыўня	415,02

Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў

Цэнтрабанк РФ

USD	25,3718
10 UAH	50,0529
1000 BYR	12,0046
EUR	36,4999

Курс у гандлёвых кампаніях (на 30.09.2008 г.)

USD ..... 2135 / 2210

Агенцтва Уладзіміра Граўцова

Падпішыцеся на часопіс «Главный Бухгалтер. ГБ» на 2008 год у рэдакцыі па самай выгаднай цане. Тэлефон рэдакцыі: 209-69-01.

ААТ «Агенцтва Уладзіміра Граўцова» УНП 100024047 Ліцэнзія Мінсувязі № 02140/0172806 выд. 03.05.2004 да 02.05.2009

ВОСЬ І ПАСТОЙ НА ДВАРЫ...

У в. Чамерын Пінскага раёна трактарыст СВК выпіў і сеў на трактар К-700, але не справіўся з кіраванне і, збіўшы плот, наехаў на 82-гадовага пенсіянера, які стаяў на двары. Цяжка траўмаваны чалавек загінуў, а трактарыст, які быў раней асуджаны, сядзе на лаву падсудных.

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

ISSN 1990 - 763X

РОЗГАЛАС

АПОШНЯЯ ІНФАРМАЦЫЯ СУТАК

ТЫДЗЕНЬ «ГРЫБНОГА» НАДВОР'Я

На гэтым тыдні надвор'е ў нашай краіне будзе вызначацца актыўнай Атлантыкай, якая прынясе да нас атмасферныя фронты, паведаміў начальнік службы гідраметэапрагнозаў Рэспубліканскага гідраметцэнтра Дзмітрый Рабаў.

Да суботы захаваецца воблачнасць з праясненнямі, час ад часу будуць ісці кароткачасовыя дажджы, месцамі працяглыя. Тэмпература паветра ўначы 5—11 цяпла, удзень — 8—15, па паўднёвым усходзе на 2 градусы цяплей. У суботу дажджы пройдуць ужо паўсюдна па краіне, у нядзелю — месцамі. Тэмпература паветра ўначы 3—9 градусаў, удзень — 9—15 цяпла.

Сяргей КУРКАЧ.

E-MAIL — ЗАЎСЁДЫ АКТУАЛЬНА

З 1 па 10 кастрычніка ў Мінску пройдзе тыдзень пажылых людзей, у рамках якога ў шэрагу раёнаў горада адбудуцца сустрэчы кіраўніцтва раённых адміністрацый з прадастаўнікамі ветэранскіх арганізацый, выставы-конкурсы сельскагаспадарчай і кандытарскай прадукцыі, святочныя сустрэчы ў тэрытарыяльных цэнтрах сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва, канцэрты.

Цяпер у сталіцы налічваецца 380 тысяч пенсіянераў — кожны пяты жыхар горада. Пры гэтым 19,2 тысячы пажылых мінчан з'яўляюцца адзінокімі, а амаль 55 тысяч — пражываюць асобна ад блізкіх працаздольных сваякоў. Як паведаміла карэспандэнту «Звязды» намеснік начальніка аддзела арганізацыйна-кадравай работы Камітэта па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Мінгарвыканкама Іна Сямёнава, менавіта пажылыя людзі з'яўляюцца найбольш частымі наведвальнікамі тэрытарыяльных цэнтраў сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва, дзе па неабходнасці аказваецца матэрыяльная, юрыдычная і псіхалагічная дапамога, паслугі сядзелак і бытавыя паслугі: дастаўка дадому прадуктаў харчавання, лекаў, аплата камунальных паслуг, уборка кватэры. Адначасова пры цэнтрах працуюць 78 клубаў і гурткоў па інтарэсах. Прычым апошнім часам з'явіўся значны попыт на навучанне ў групах камп'ютарнай грамаце, дзе ў мінскіх пенсіянераў ёсць магчымасць бясплатна асвоіць Word, Excel, электронную пошту.

Між тым, нагадала Іна Сямёнава, ужо некалькі гадоў у сталіцы дзейнічае гарадская праграма падтрымкі асобных катэгорый грамадзян — у яе рамках робяцца даплаты да пенсій інвалідам і ўдзельнікам вайны, асобам, што даглядаюць нямоглых інвалідаў I групы і асобаў ва ўзросце больш за 80 гадоў, мінчанам, якія дасягнулі 95-гадовага ўзросту. Апроч таго, заўважыла Іна Сямёнава, пачалася выплата пажылым жыхарам сталіцы аднаразовай дапамогі на выхтоўку сельгаспрадукцыі. У прыватнасці, права на такую дапамогу ў памеры 105 тысяч рублёў атрымалі пенсіянеры, што маюць пенсію ніжэй за 3 бюджэты пражыткавага мінімуму.

Сяргей ГРЫБ.

МІНУС ЗМЯНШАЕЦЦА, СТАЛІЦА — ПЛЮСУЕ

Па стану на 1 верасня насельніцтва Беларусі складала 9 млн. 676,2 тыс. чалавек — на 20,8 тысячы менш, чым за аналагічны перыяд летась.

Як паведаміла карэспандэнту «Звязды» прэс-сакратар Міністэрства статыстыкі і аналізу Алена Кандраценка, за студзень—жнівень сёлета ў Беларусі нарадзілася 71,3 тыс. чалавек, або на 2 тысячы больш, чым у такі ж час летась. У той жа час паказчык смяротнасці зменшыўся на 1,1 тысячы — за студзень—жнівень гэтага года паўсюль з жыцця 88,6 тыс. нашых грамадзян.

Дарэчы, паводле звестак статыстыкі, у параўнанні з мінулым годам колькасць насельніцтва Брэсцкыны зменшылася з 1 млн. 438,7 тыс. да 1 млн. 435,5 тыс., Віцебшчыны — з 1 млн. 277,5 да 1 млн. 268,5 тыс., Гомельшчыны з 1 млн. 472 тыс. да 1 млн. 466,3 тыс., Гродзеншчыны — з 1 млн. 111 тыс. да 1 млн. 105,2 тыс., Мінскай вобласці — з 1 млн. 467,5 тыс. да 1 млн. 460,2 тыс., Магілёўскай — з 1 млн. 132,5 тыс. да 1 млн. 126 тыс. жыхароў. Адначасова колькасць насельніцтва сталіцы павялічылася з 1 млн. 797,8 да 1 млн. 814,5 тыс. чалавек.

Пры гэтым, паводле апошніх звестак, у Беларусі налічвалася 14 гарадоў-«стотысячнікаў». Апроч Мінска, да іх адносіліся Гомель (насельніцтва — 495 тыс.), Магілёў (371 тыс.), Віцебск (354 тыс.), Гродна (326 тыс.), Брэст (315 тыс.), Бабруйск (218 тыс.), Баранавічы (168 тыс.), Барысаў (150 тыс.), Орша (139 тыс.), Пінск (130 тыс.), Мазыр (112 тыс.), Наваполацк (107 тыс.) і Салігорск (101 тысяча чалавек).

Сяргей ГРЫБ.

«Беларусь будзе рабіць усё, каб спыніць спробы разваліць сістэму міжнароднай бяспекі»

Аб гэтым заявіў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка на сустрэчы з міністрам нацыянальнай абароны В'етнама генералам арміі Фунг Куанг Тханем.

«Мы вымушаны ўмацоўваць Узброеныя Сілы, і гэта, перш за ўсё, звязана з тым, што дзеянні блока НАТА вымушаюць нас гэта рабіць», — адзначыў кіраўнік дзяржавы.

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што, наведваючы В'етнам у красавіку гэтага года, ён быў уражаны відавочным прагрэсам у развіцці гэтай краіны з часу яго папярэдняга візіту. «Дружба нашых двух народаў заснавана на гістарычным мінулым, якое недалёка ад сучаснасці, — лічыць Прэзідэнт. — У тыя часы мы былі разам, таму нядзіўна, што мы займаем адны і тыя ж пазіцыі па ключавых міжнародных праблемах».

Беларусь і В'етнам выступаюць за фарміраванне справядлівага светапарадку, за прызнанне разнастайнасці шляхоў прагрэсіўнага развіцця дзяржаў і супраць прымянення сілы ў вырашэнні спрэчных пытанняў. Краіны актыўна супрацоўнічаюць у рамках Руху недалучэння. Паводле слоў Аляксандра Лукашэнкі, для Беларусі важна супрацоўніцтва з В'етнамам у ваеннай і ваенна-тэхнічнай сферы з улікам вялікага вопыту гэтай краіны ў названая галіне.

Прэзідэнт падкрэсліў, што В'етнам адносіцца да ліку краін, з якімі ў Беларусі няма закрытых тэм.

Міністр нацыянальнай абароны В'етнама ў сваю чаргу заявіў, што в'етнамскі народ высока цэніць мужнасць беларускага народа, які выстаяў у гады Вялікай Айчыннай вайны. Ён таксама адзначыў «вельмі добрыя тэмпы развіцця эканомікі» Беларусі.

БЕЛТА.

Ва Ўрадзе

СТЫМУЛ ДЛЯ ВЯСКОЎЦА

Нягледзячы на тое, што ў краіне дзейнічае праграма развіцця і падтрымкі асабістых падсобных гаспадарак на 2006—2010 гады, толькі летась колькасць асабістых падсобных гаспадарак скарацілася на 17 тысяч (на 1,5 працэнта), змяншаецца і колькасць жывёлы, якую вяскоўцы трымаюць у асабістых гаспадарках. Гэта значыць, падкрэсліў кіраўнік Урада, згаданая праграма працуе пакуль неэфектыўна. Ход яе выканання абмяркоўваўся ўчора на пасяджэнні Прэзідыўма Саўміна пад старшынствам С. Сідорскага.

На думку міністра сельскай гаспадаркі і харчавання Сямёна Шапіры, зніжэнне долі вясковых падворкаў, што займаюцца вытворчасцю сельгаспрадукцыі не толькі для асабістых мэтаў, але і для продажу, тлумачыцца аб'ектыўнымі эканамічнымі прычынамі. У прыватнасці, спецыялісты звязваюць гэта з нязначнымі даходамі насельніцтва і высокімі выдаткамі вытворчасці прадукцыі сельскай гаспадаркі, асабліва жывёлагадоўлі.

Каб змяніць сітуацыю і зацікавіць вяскоўцаў у нарошчванні вытворчасці ўласнай прадукцыі, міністэрства прапануе прыняць шэраг мераў. У прыватнасці, кіраўнік галіны ўзгадаў пра неабходнасць павелічэння надбаўкі да закупачных цэнаў на сельгаспрадукцыю асабістых падсобных гаспадарак. З пачатку наступнага года прапануецца ўвесці надбаўкі ў памеры 50 працэнтаў ад закупачнай цаны на малако першага гатунку, а надбаўкі да закупачных цэнаў на бульбу для прамысловай перапрацоўкі — у памеры 150 рублёў за кілаграм. Улічваючы, што сёння закупачная цана 1 кілаграма малака першага гатунку — 665 рублёў, надбаўка складзе 332 рублі. Акрамя таго, у міністэрстве лічаць, што неабходна даць магчымасць вясковым жыхарам набываць не менш як 2 тоны грубых кармоў па льготных цэнах, або зусім бясплатна. Пры гэтым гранічную гандлёвую надбаўку да адпускных цэнаў заводаў, што вырабляюць камбікармы, прапануецца ўстанавіць у памеры 15 працэнтаў. Што датычыцца грошай, якія патрабуюцца на рэалізацыю падобных мераў, то міністр назваў суму ў 208 мільярдаў рублёў. Яшчэ адна ініцыятыва, якая, праўда, не зайшла падтрымкі ў Міністэрстве працы і сацабароны, — залічваць у працоўны стаж грамадзян на пэўных умовах працу ў асабістай падсобнай гаспадарцы. Гэта, мяркуюць спецыялісты Мінсельгасхарчу, стане стымулам для вяскоўца павялічыць пагалоўе жывёлы ў асабістых гаспадарках. Сямён Шапіра патлумачыў, што цяпер у грамадскім сектары на кожнага працаўніка сельскай гаспадаркі прыходзіцца па тры каровы. Прапанова ж міністэрства наступная: у тым выпадку, калі вясковец будзе трымаць 5 кароў і здаваць малака ў два разы больш, чым прыходзіцца ў сярэднім на аднаго працуючага ў сельскай гаспадарцы, то гэта будзе залічвацца яму ў стаж.

Свой пункт гледжання на ўзнятыя праблемы выказаў на пасяджэнні старшыня праўлення Нацыянальнага банка Пётр Пракаповіч. Паводле даных, што прагучалі ўчора, цяпер у асабістых падсобных гаспадарках знаходзіцца звыш 1 мільёна гектараў зямель, якія не заўсёды выкарыстоўваюцца эфектыўна. У такім выпадку, запытаўся галоўны банкір, чаму ў краіне не стварыць такую сістэму, якая б дазваляла вяскоўцу здаваць сваю зямлю ў арэнду сяльгасарганізацыі і атрымліваць за гэта плату? Да таго ж у вёсцы цяпер пражывае шмат старых людзей, якія не маюць сілаў апрацоўваць зямлю, і яны з задавальненнем пагадзіліся б з гэтым, пры тым што ў якасці аплаты ім прапаноўвалася б пэўная частка ўраджаю — збожжа ці бульба.

Яшчэ адзін перспектыўны напрамак — вытворчасць садавіны і гародніны. Паводле агучанай на пасяджэнні інфармацыі, рэспубліка імпартуе на сотні мільёнаў долараў гэтай прадукцыі. А таму, ліцыць Пётр Пракаповіч, неабходна прастымуляваць тых вяскоўцаў, якія вырошчваюць садавіну і гародніну, — гэта прадукцыя запатрабаваная на рынку. Як заўважыў банкір, арганізацыям у такім выпадку, напрыклад, можна будзе заключаць з вяскоўцам дагавор, каб ён на сваім участку пасадзіў і вырасціў, напрыклад, дурніцы, а потым здаў іх на перапрацоўку.

Прэм'ер-міністр Сяргей Сідорскі, падводзячы вынікі ўчарашняга абмеркавання, заўважыў, што меры па падтрымцы і развіцці асабістых падсобных гаспадарак не павінны зводзіцца да просьбаў аб выдзяленні грошай. «Прыйсці ва Урад і ўзяць грошы — гэта самае простае», — падкрэсліў ён. — Праблема павінна вырашацца комплексна: праграму неабходна ўважліва разгледзець, прадставіць дакладны аналіз развіцця асабістых падсобных гаспадарак за два гады і выпрацаваць пытанні па паляпшэнні сітуацыі з улікам двухгадовага вопыту», — запатрабаваў кіраўнік Урада. Прычым ён папярэдзіў пра тое, што прымушаць вяскоўца весці падсобную гаспадарку не трэба. «Выбар застаецца за селянінам. Хоча механізатар пасля працы займацца сваёй гаспадаркай — гэта яго права і выбар. А задача дзяржавы — стварыць умовы для такой работы», — канстатаваў прэм'ер. Сяргей Сідорскі даў даручэнне на працягу месяца дапрацаваць праграму.

Ігар ШЧУЧЭНКА.

Пытальнік

Каляндар ужо ў гандлі. І... амаль распрададзены

Паважаная «Звязда»! Надрукуйце на сваіх старонках, ці будзе прадавацца каляндар «Родны край»? Калі не будзе, дык хто не хоча, хто супраць «Роднага краю»? Абыякавыя, недалёкія, неадукаваныя людзі так могуць рабіць. Ці не праўда?

Міхаіл Трафімавіч Чарняўскі, *к.п. Нарач Мядзельскага раёна*

Як паведаміў у адказ на наш запыт намеснік міністра інфармацыі Ігар Лапцёнак, адрыўны каляндар «Родны край» паступіў у гандлёвую сетку краіны з месяц таму. Больш за тое, амаль увесь тыраж календара ўжо... распрададзены.

Пытанні ад чытачоў адносна выпуску адрыўных і перакідных календароў на роднай мове паступалі ў рэдакцыю апошнія некалькі гадоў: чаму іх не знайсці ў продажы, калі ёсць попыт? У свой час мы давалі адказ са спасылкай на міністэрства: ды таму, што, нягледзячы на цікаўнасць, у прыватнасці, нашых заяўнікаў, адзін з апошніх тыражоў календара на роднай мове не быў цалкам рэалізаваны, выдавецтва панесла страты.

Работнікі міністэрства таксама прыгадалі той выпадак, калі з тыражу перакіднога календара на 10 тысяч экзэмпляраў незапатрабаванымі пакупнікамі засталіся больш за 3,7 тысячы экзэмпляраў, у выніку чаго выдавецтва панесла страты ў памеры 8 мільёнаў рублёў. А за два гады — 2005-ы і 2006-ы — нераспрададзенымі засталіся больш за 6,2 тысячы календароў (і перакідных і адрыўных) на суму каля 12 мільёнаў рублёў.

— Аднак, нягледзячы на гэта і ідучы насустрач пажаданням пакупнікоў, было вырашана: каляндар трэба выпускаць. Нам удалося паўплываць, скажам так, на выдавецтва «Беларусь». Да таго ж, яму была выдзелена пад гэтыя мэты дзяржаўная паэзія, — сказаў намеснік міністра інфармацыі. — Да яго выпуску добра падрыхтаваліся і каляндар аказаўся вельмі прывабным.

Тыраж «Роднага краю» на 2009 год — 7 тысяч экзэмпляраў. Дзякуючы фінансавай падтрымцы, яго кошт склаў у гандлёвай сетцы з улікам гандлёвай надбаўкі 2230 рублёў (раней ён даходзіў да 3 тысяч), што зрабіла яго больш канкурэнтаздольным перад аналагічнай расійскай прадукцыяй, якая цяпер прадаецца па 2,3 тысячы рублёў.

Як зазначылі ў міністэрстве, каляндар карыстаецца ў пакупнікоў добрым попытам, яго адразу пасля выпуску заказалі шматлікія арганізацыі з усёй краіны. Цяпер ужо прымаюцца заяўкі на аналагічны каляндар на 2010 год, у прыватнасці, іх сабрана на больш чым 10 тысяч экзэмпляраў. Ці можна выдаць дадатковы тыраж на 2009 год? Як нам адказалі, у гандлі яшчэ засталіся рэшткі першай партыі, да та

Беларусь і Еўропа павінны пачаць нармальны палітычны дыялог і ўстараніць штучныя бар'еры, якія гэтаму перашкаджаюць

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Пры гэтым ён дадаў, што ў Беларусі яшчэ няма ўстойлівай традыцыі, выпрацаванай на аснове практыкі, па частцы выбарных кампаній. «Гэта заўсёды, на мой погляд, пагражае нейкай дэстабілізацыяй унутрыпалітычнай сітуацыі і можа прывесці да негатыўных наступстваў у эканоміцы і сацыяльным жыцці. У гэтым маё апасенне. І, як вы разумееце, яно сёння яшчэ ўзмоцнена фінансавым крызісам у Еўропе і Амерыцы. Таму ў час гэтай кампаніі я як кіраўнік дзяржавы спрабаваў усё ўтрымліваць у такіх рамках, каб не расхістаць абстаноўку ў краіне, каб не было негатыўных наступстваў», — дадаў Прэзідэнт.

Ан-Мары Лізен падзякавала Кіраўніку дзяржавы за прадастаўленую магчымасць свабоднай работы назіральнікаў АБСЕ ў Беларусі. «Мы былі абсалютна свабодныя. Мы не можам адзначыць ніводнага абмежавальнага аспекту ў нашай дзейнасці ў Беларусі. І мы вельмі гэтым задаволены», — падкрэсліла яна.

Прадстаўнік АБСЕ паведаміла, што наведвала Беларусь у 1987 годзе, пасля чарнобыльскай катастрофы. «І памятаю зусім іншы перыяд у жыцці гэтага горада. І на гэтай падставе бачу сваімі вачамі розніцу. І гэтага ж пункту гледжання прытрымліваюцца ўсе, з кім мы гаворым тут. Яны выказваюцца ў гэтым жа пазітыўным сэнсе, гаворачы пра абнаўленне горада, пра рост дабрабыту людзей, пра паляпшэнне іх узроўню жыцця, змяненні стылю жыцця. Таму што для Еўропы вельмі важна ведаць і ўсведамляць, што еўрапейскія суседзі прагрэсіруюць у сваім развіцці, ідуць уверх, па нарастаючай», — заявіла Ан-Мары Лізен.

«Але хацела б, каб Вы разумелі, што калі мы дзейнічаем у рамках АБСЕ, калі прыязджаем у складзе місіі АБСЕ, што адрозніваe, як бы, ад фармату ЕС, мы назіраем за жыццём краіны толькі ў вельмі кароткі прамежак часу. І вось менавіта гэта — мэта, з якой мы прыязджаем у любую краіну, збіраем у нашу каманду вялікую колькасць назіральнікаў — гэта для таго, каб убачыць галоўныя рэчы. Але, углядаючыся ў гэтыя галоўныя рэчы, мы заўсёды імкнёмся заставацца канструктыўнымі, працуючы на будучыню. І нават, нягледзячы на тыя нейкія магчымыя крытычныя рэчы, якія выказваем, мы ў любой краіне, уключаючы Беларусь, імкнёмся пакідаць дзверы адчыненымі для таго, каб заставалася магчымасць для дыялогу, для прадаўжэння работы ў будучым», — дадала Ан-Мары Лізен.

Паводле яе слоў, людзі, якія працуюць у місіі АБСЕ, прадстаўляюць розныя краіны. У іх ва ўсіх свае погляды на палітычныя працэсы, на палітычную культуру.

«Мы ўсе ўяўляем сабой свет, які знаходзіцца ў руху, у прагрэсіі. І для нас, і ў Еўропе вельмі важна, што мы ўсе лічым, што сённяшнія адносіны з Беларуссю знаходзяцца ў той стадыі, калі яны могуць быць палепшаны», — сказала Віцэ-старшыня Парламенцкай Асамблеі АБСЕ.

Паводле паведамленняў прэс-службы Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь і БЕЛТА.

Школа падаткаплацельшчыка

Ільготы па падатках, калі кватэру здымае малады спецыяліст

Рэдакцыя працягвае адказваць на самыя актуальныя пытанні нашых чытачоў. Сёння нашаму выданню адказваюць спецыялісты галоўнага ўпраўлення падаткаабкладання фізічных асобаў Міністэрства па падатках і зборах.

— Ці вызваляюцца ад падаткаабкладання даходы, атрыманыя ад здачы ў наём жылых памяшканняў маладым спецыялістам, а менавіта: выпускнікам вышэйшых ваенных навучальных устаноў?

Антон Піскун, *Мінская вобласць*

— У адпаведнасці з падпунктам 1.41 пункта 1 артыкула 12 Закона Рэспублікі Беларусь «Аб падаходным падатку з фізічных асобаў» не падлягаюць падаткаабкладанню даходы, атрыманыя ад здачы ў наём жылых памяшканняў маладым спецыялістам.

У адпаведнасці з артыкулам 10 Закона Рэспублікі Беларусь «Аб адукацыі» маладымі спецыялістамі лічацца выпускнікі ўстаноў адукацыі, якія атрымалі прафесійна-тэхнічную, сярэднюю спецыяльную ці вышэйшую адукацыю на дзённай форме навучання за кошт сродкаў рэспубліканскага і (або) мясцовых бюджэтаў і накіраваныя на працу па размеркаванні. Маладыя спецыялісты павінны адпрацаваць па размеркаванні адзін год пасля атрымання прафесійна-тэхнічнай адукацыі, два — пасля атрымання сярэдняй спецыяльнай або вышэйшай адукацыі. Тэрмін, на працягу якога вайсковец можа быць прызнаны маладым спецыялістам, вызначаны толькі Законам «Аб адукацыі».

Атрымліваецца, што для мэтаў падаткаабкладання выпускнікі вышэйшых ваенных навуковых устаноў будуць лічыцца маладымі спецыялістамі на працягу двух гадоў пасля заканчэння ваеннай навучальнай установы.

— Сёлета мая дачка 18-гадовага ўзросту будзе працягваць навучанне ў сярэдняй школе. Ці даецца бацькам такога дзіцяці ў гэтым выпадку стандартны падатковы вылік у памеры 2 базавых велічынь?

Алесь Лагун, *г. Брэст*

— Стандартны падатковы вылік у памеры 2 базавых велічынь даецца на кожнае дзіця да 18 гадоў і (або) на кожнага ўтрыманца. Да ўтрыманцаў у тым ліку адносяцца навучэнцы дзённай формы навучання старэйшыя за 18 гадоў, якія атрымліваюць сярэднюю адукацыю, а таксама першую прафесійна-тэхнічную адукацыю. Відавочна, што ў вашым выпадку бацькі маюць права на атрыманне стандартнага падаткоўага выліку ў памеры 2 базавых велічынь. Такі вылік даецца на падставе даведкі з навучальнай установы (сярэдняй школы, ПТВ) аб праходжанні дзіцем навучання на дзённай форме і атрыманні ім сярэдняй адукацыі.

Падрыхтаваў Сяргей КУРКАЧ.

Калектыў рэдакцыі газеты «Звязда» выказвае шчырыя спачуванні рэдактару аддзела журналісцкіх расследаванняў газеты «Рэспубліка» Леаніду Юнчыку ў сувязі з напаткаўшым яго непапраўным горам — смерцю БАЦЬКІ.

Гучная справа

БУХГАЛТЭРЫЯ З ДВАЙНЫМ ДНОМ:

другім налічыць і сябе не пакрыўдзіць

На працягу трох гадоў у цэнтралізаванай бухгалтэрыі ўпраўлення адукацыі адміністрацыі Фрунзенскага раёна г. Мінска васьмёрка службовых асобаў ажыццяўляла рэгулярныя крадзяжы грошай. Як высветлілася, парушальнікі, а дакладней, парушальніцы закона, налічвалі сабе неблагія прыбаўкі да заробкаў.

Удзельніцы арганізаванай групы — галоўны бухгалтар, яе намеснікі, старшыня пярвічнай прафсаюзнай арганізацыі, загадчыцы сектараў і бухгалтар — кралі грашовыя сродкі, выдаткаваныя з дзяржаўнага бюджэту для выплаты заробкаў работнікам сярэдніх і спартыўных школ, дзіцячых садкоў, дзіцячага дома, прыёмных сем'яў, супрацоўнікаў апарату ўпраўлення адукацыі, у тым ліку атрыманых ад пазабюджэтнай дзейнасці ў выглядзе аплаты за тыя ж гурткі, арэнду памяшканняў і г.д. Механізм крадзяжу быў досыць просты і добра заканспіраваны. У афіцыйныя бухгалтарскія дакументы, у тым ліку ў спісы на залічэнне заработнай платы — плацежныя ведамасці — дадаваліся і падманныя звесткі аб асобах і сумах для выплат. На падставе гэтых дакументаў, якія перадаваліся ў банкаўскі філіял, грашовыя сродкі пералічваліся банкам на карт-рахункі вышэйзгаданай «васьмёркі», пасля чаго рабілася іх абнаяўка ў банкаматах. Адным словам, у разліковых паперах былі ўказаныя адны сумы — ад 300 тысяч да 1 300 тысяч рублёў, што было цалкам законна, а на карткавыя рахункі штомесяц дадаткова налічвалася ад 100 тысяч да 8 мільёнаў рублёў.

На чале несумленнай групы значыліся галоўны бухгалтар Воранава (усе прозвішчы зменены) і яе намеснік па планава-эканамічнай рабоце Барадзіна. Менавіта яны размеркавалі паміж іншымі супрацоўніцамі непасрэдныя абавязкі і вызначылі грашовую долю кожнай у злачыннай «сістэме». Наогул цэнтралізаваная бухгалтэрыя налічвала заработную плату больш як 10 тысячам супрацоўнікаў 110 падведамасных устаноў упраўлення адукацыі адміністрацыі Фрунзенскага раёна. Кіраўніцы будучай злачыннай групы разважалі на пачатку прыкладна так: ва ўпраўленні адукацыі шмат школ, дзе працуе вялікая колькасць людзей, так што скрадзеныя сумы ў агульным аб'ёме ніхто і не заўважыць...

Падманныя звесткі траплялі ў афіцыйныя дакументы пасля іх падпісання кіраўніцтвам упраўлення адукацыі шляхам дубляжу нумароў карт-рахункаў і прозвішчаў атрымальнікаў грошай разам з сумамі грашовых сродкаў, якія налічваліся ў банкаўскім філіяле, а таксама шляхам дадрукоўвання нумароў карт-рахункаў і прозвішчаў разам з грашовымі сумамі ў загадзя пакінутыя незапоўненыя радкі.

Спадарыня Барадзіна поўнасцю валодала звесткамі па эканоміі фонду аплаты працы ўстановамі ўпраўлення адукацыі. Ведаючы аб сумах грашовых сродкаў, якія ўтвараліся па эканоміі заробку і якія маглі атрымаць у выглядзе прэміі тыя ж настаўнікі, выхавальнікі і іншыя супрацоўнікі ўстаноў адукацыі, Барадзіна з Воранавай планавалі крадзяжы так, каб не перавысіць планавы фонд заработнай платы ў цэлым па ўпраўленні.

Як ужо было сказана, у кожнай з васьмі жанчын была свая роля ў злачыннай гульні. Так, другі намеснік галоўнага бухгалтара — Арцюхова, якая штомесяц складала мемарыяльны ордэр 5 — збор разліковых ведамасцяў на заработнай плаце ўпраўлення адукацыі — уносіла ў раздзелы «школа» і «дзіцячыя садкі» падманныя звесткі аб сумах грашовых сродкаў, налічанай і выплачанай заработнай платы дзеля хавання фактаў незаконнага пералічэння грошай на карт-рахункі «васьмёркі».

Намеснік галоўнага бухгалтара Дзятлава з'яўлялася адначасова і старшынёй камісіі па прэміяванні супрацоўнікаў цэнтралізаванай бухгалтэрыі. Членамі гэтай жа камісіі былі і Барадзіна з Арцюховай. Усе яны валодалі інфармацыяй аб крыніцах сродкаў для прэміявання, а старшыня прафсаюзнага камітэта, загадчыца сектара планава-эканамічнага аддзела Бяляева ўзгадняла з імі загады аб прэміяванні супрацоўнікаў цэнтралізаванай бухгалтэрыі. Кожны з удзельнікаў арганізаванай групы разумеў, што ажыццяўляе крадзеж грошай з фонду заработнай платы падведамасных устаноў, якія не з'яўляюцца фондам заработнай платы і таму не могуць быць выплачаны ім у якасці прэмій.

Прэмію магла атрымаць настаўніца, а «перападала» бухгалтарцы, якая налічвала апошняй законны заробак.

У лістападзе 2005 года Воранава, Барадзіна і Дзятлава вырашылі не пакінуць без належнага догляду астатак па фондзе заработнай платы — 12 мільёнаў рублёў. Было вырашана пералічыць гэту суму на карт-рахункі на працягу двух месяцаў. Палову сумы Воранава, Барадзіна, Дзятлава, Арцюхова і Бяляева дадалі на свае карткі ў лістападзе, а другая трапіла на карткі Воранавай, Барадзіной, Арцюховай і Дзятлавай у снежні.

Несумленны сіндыкат, які меў доступ да звестак аб планавым фондзе заработнай платы, фактычных расходах, эканоміі фонду аплаты працы, даходах і расходах па пазабюджэтнай дзейнасці, дакладна ведаў, што на іх карткавыя рахункі 1-3 разы ў месяц без загадаў незаконна налічваюцца грошы ўпраўлення адукацыі, і што грошы гэтыя не з'яўляюцца аплатай іх працы і не адлюстраваны ў разліковых паперах. Пры гэтым абвінавачаныя дакладна ведалі, што ў фондзе заработнай платы на год плануецца агульная сума на прэміяванне, прызначэнне надбавак і вылучэнне матэрыяльнай дапамогі, а таксама той факт, што паводле калектыўнага дагавора надбаўка за складанасць і напружанасць працы ўстанаўліваецца да 50 працэнтаў службовага акладу супрацоўнікаў цэнтралізаванай бухгалтэрыі. Выплата матэрыяльнай дапамогі ажыццяўляецца адзін раз на год у памеры 1,7 службовага акладу і можа выплачвацца ў памеры 0,3 акладу ў сувязі з невытворчымі матэрыяльнымі цяжкасцямі. Прэмії, матэрыяльная дапамога, у тым ліку надбаўка разам са штомесячнай заработнай платай з'яўляюцца аплатай працы работнікаў. Іншыя выплаты работнікам цэнтралізаванай бухгалтэрыі не робяцца.

— Складанасць расследавання заключалася ў правядзенні зверкі паміж банкаўскім філіялам, дзе знаходзіліся карткавыя рахункі супрацоўнікаў бухгалтэрыі, і самой бухгалтэрыяй, дзе былі іх асабовыя рахункі, — кажа намеснік начальніка галоўнага следчага ўпраўлення папярэдняга расследавання Міністэрства ўнутраных спраў Дзмітрый ДАНІЛЬЧЫК. — Мы звярнуліся ў Камітэт па адукацыі Мінгарвыканкама. Больш як паўгода яго рэвізоры сумесна са следчым і аператыўнікамі правяралі цэнтралізаваную бухгалтэрыю Фрунзенскага раёна. Вынікі гэтай работы дазволілі раскрыць механізм выкрадання грошай і прыцягнуць да крымінальнай адказнасці восем чалавек. Цяпер крымінальная справа знаходзіцца ў судзе Фрунзенскага раёна сталіцы...

Святлана БАРЫСЕНКА.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Ну і ну!

Бабры падтапілі жылы дом

Гэта здарылася ў вёсцы Тартак Астравецкага раёна, адкуль у абласное ўпраўленне МНС паступіла паведамленне аб падтапленні жылога дома, які выкарыстоўваецца як дача, і трох гаспадарчых пабудоў.

Паводле інфармацыі з Гродзенскага абласнога ўпраўлення МНС, вінаўнікамі гэтага здарэння аказаліся бабры. Яны пабудавалі сапраўдную дамбу ў двух паралельна размешчаных прапускных трубах ракі Тартак. Дыяметр кожнай з іх — паўтара метра, а даўжыня — восем. Звычайна глыбіня ракі ў гэтым месцы не перавышае двух метраў, аднак з-за перакрыцця трубаў яна прыкладна ўдвая павялічылася. Бабры прымусілі работнікаў ДРБУ-159 і вадалазаў Смаргонскага райаддзела па надзвычайных сітуацыях на працягу шасці гадзін з дапамогай ламоў, багроў і вяровак прачышчаць трубы. Інакш вада прадоўжыла б свой пад'ём.

Барыс ПРАКОПЧЫК.

П'ЯНАМУ ШАНЦУЕ?

У гарбальніцу Пінска хуткая дапамога даставіла 38-гадовага траўмаванага мужчыну ў шокавым стане.

Дзіўна, што п'яны жыхар пас. Садовага, які выпаў з акна 5-га паверха, не загінуў на месцы. Пашанцавала?

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

Атрута ў заменніках груднога малака

— Малочная прадукцыя кітайскай вытворчасці ў беларускім дзяржаўным гігіенічным рэгістры не зарэгістраваная, адпаведна, яна не рэалізуецца і праз гандлёвую сетку, — аб гэтым заявіла Галоўны дзяржаўны санітарны ўрач Беларусі Валянціна Качан, каментуючы паведамленні аб масавых атручэннях у Кітаі дзяцей, што спажывалі сухія малочныя сумесі. Па апошніх даных Сусветнай арганізацыі аховы здароўя, з-за прысутнасці ў заменніках груднога малака такога таксічнага рэчыва, як меламін, у Кітаі пацярпелі каля 53 тысяч дзяцей і трое немаўлят загінулі.

Для даведкі: меламін выкарыстоўваецца ў вытворчасці пластмас, лакаў, клеяў, электраізаляцыйных матэрыялаў і г.д. Высокая ж канцэнтрацыя гэтага рэчыва ў арганізме выклікае фарміраванне ў нырках і мачавым пухіры камянёў, да таго ж дробныя крышталікі могуць закупорваць ныркавыя канальцы і з'явіцца прычынай вострай ныркавай недастатковасці, а ў некаторых выпадках — і смерці. Зразумела, што ў прадуктах харчавання прысутнасць гэтага рэчыва катэгарычна не дапускаецца. Дык якім жа чынам таксічнае рэчыва трапіла ў дзіцячыя малочныя сумесі? Высветлілася, што меламін дадаваўся для таго, каб схаваць факт фальсіфікацыі малака шляхам дабаўлення ў прадукт вады для павелічэння яго аб'ёму. Але ў гэтым разе ў прадукце змяншаецца ўтрыманне бялку. Дабаўленне ж маламіну павялічвае ўтрыманне азоту ў малацэ і скажае вынікі вызначэння колькасці бялку ў прадукце, які паступае для далейшай перапрацоўкі.

У сувязі са скандалам вакол атручанага сухога малака Еўракамісія заклікала ўзмацніць кантроль за ўсімі пастаўкамі харчовай прадукцыі з КНР, каб папярэдзіць кантрабандныя пастаўкі. Валянціна Качан параіла беларусам не купляць харчовую прадукцыю, у тым ліку і малочную, у месцах несанкцыянаванага гандлю. А пры пакупцы малочнай прадукцыі замежнай вытворчасці звяртаць увагу на маркіроўку і абавязковую наяўнасць дакументаў, якія пацвярджаюць іх якасць і бяспечнасць.

Надзея НІКАЛАЕВА.

Перамога сярэдняга класа выяўляецца ў тэатры

Славуты літоўскі рэжысёр Эймунтас Някрошус у Мінск не прыедзе. Але сенсацыя не гэта: спектакль «Атэла» яго тэатра «Мена фортас» усё-такі адбудзецца. Жорсткія ўмовы кантракта ў Маскве, дзе Някрошус працуе ў Вялікім тэатры над пастаноўкай оперы, не дазволілі яму вырвацца ў Беларусь. Хоць на прапанову ад арганізатараў новага тэатральнага фестывалю ў Беларусі ён пагадзіўся амаль адразу ж.

— Мы даўно шукалі магчымасцяў прыехаць у Мінск, — сказаў дырэктар тэатра «Мена фортас» Таўрус Чыжас. — Вядома ж, прапаноў у нас было шмат. Але Эймунтас разважаў так: у Бразілію не паеду, бо далёка. У Мексіку таксама, бо там горача. У Мінск — так!

Як і яшчэ адзін літовец Альгердас Латэнас, які пасля прэм'еры ў Купалаўскім тэатры трагедыі «Макбет» да цяперашняга часу сваю пастаноўку не бачыў. У той час як Валянціна Еранькова можа сачыць за жыццём камедыі «Утаймаванне свавольніцы» ў Рускім тэатры. Увогуле ў праграме ёсць поўны баланс паміж трагедыямі і камедыямі, што ў айчынных спектаклях, што ў пастаноўках гасцей. Фестываль на шэкспіраўскую тэму ўзнік у Беларусі не ў малой ступені з-за таго, што пастаноўкі паводле Шэкспіра ёсць у айчынных тэатрах. І што зусім неверагодна — спонсар пайшоў на тое, «што не ўсе прадукты, якія выпускаюць банкі, могуць быць прыбытковымі». Старшыня праўлення ААТ «Белгазпрамбанк» Віктар Бабарыка адзначыў: «Гэты фестываль укладваецца ў агульную стратэгію і місію банка — спрыяць фарміраванню сярэдняга класа. А сярэдні клас вызначаецца не толькі тым, колькі складае яго гадавы даход, але і тым, як ён траціцца. Адна са складовых якраз культурная».

Калі меркаваць па наяўнасці ў касах білетаў на замежныя спектаклі, то атрымліваецца, што ў Беларусі сярэдні клас даўно і беззваротна перамог, з чым нас і можна павіншаваць.

Ларыса ЦІМОШЫК.

КОЛЬКІ БУДЗЕМ ПЛАЦІЦЬ?

У Беларусі памер усярэдненай платы за жыллёва-камунальныя паслугі ў двухпакаёвай кватэры з пачаткам ацяпляльнага сезона складзе каля Br142 тыс. (летам каля 93 тыс.). Аб гэтым паведаміў намеснік міністра жыллёва-камунальнай гаспадаркі Мікалай Ліпень.

«Ніякіх рашэнняў у сувязі з павышэннем тарыфаў на жыллёва-камунальныя паслугі з пачаткам новага ацяпляльнага сезона не прымалася. Пытанне павышэння тарыфаў цяпер не разглядаецца», — адзначыў ён. Паводле яго звестак, аплата ЖКП у аднапакаёвай кватэры ў ацяпляльны перыяд складзе ў сярэднім Br95 тыс. (летам каля Br61,9 тыс.), у трохпакаёвай — Br196,9 тыс. (Br126,4 тыс.).

Паводле слоў намесніка міністра, сістэма ЖКГ у цэлым гатовая да ацяпляльнага сезона.

Рашэнне аб уключэнні ацяплення ў жылым фондзе будуць прымаць мясцовыя выканаўчыя органы выходзячы з сярэдняй тэмпературы вонкавага паветра — на працягу пяці сутак яна павінна быць не вышэй за 8 градусаў цяпла.

Сёлета тарыфы на аплату жыллёва-камунальных паслуг павялічваліся двойчы — з 1 студзеня і з 1 мая.

Наталля ВЯРБІЦКАЯ, БЕЛТА.

Абзац

■ Дом-інтэрнат для сталічных ветэранаў вайны і працы на 150 месцаў плануецца адчыніць да канца наступнага года. Для гэтых мэтаў перапрафілюецца былы санаторый-прафілакторый «Світанак», што размешчаны ў вёсцы Трэскаўшчына Мінскага раёна, на маляўнічым беразе ракі Іслач.

■ Расійскія выратавальнікі працягваюць пошук грамадзяніна Беларусі, які знік 27 верасня ў раёне Геленджыка. У той дзень 60-гадовы жыхар Мінска разам з 45-гадовым краснадарцам выйшлі ў Чорнае мора на гумавай лодцы на рыбалку. Спачатку надвор'е было добрае, а потым рэзка пагоршылася. Іх кампаньён, які застаўся на беразе, узняў трывогу. Пошукавыя работы пачаліся адразу. Пошук ішоў на адлегласці 10 міляў ад берага, абследаваная ўся прылеглая берагавая тэрыторыя. Пошукавым работам перашкаджае шторм — вышыня хвалі дасягае 2 м. Пакуль пошукі вынікаў не далі, але яны працягваюцца.

■ Супрацоўнікі міліцыі затрымалі чатырох студэнтаў мінскіх ВНУ па падазрэнні ў спекуляцыі білетамі на футбольны матч БАТЭ — «Ювентус», які адбыўся ўчора. Студэнты зараней набылі білеты ў касах стадыёна «Дынама» за Br30 тыс., а спрабавалі прадаць іх за Br150 тыс. Складзены адміністрацыйныя пратаколы.

■ Ва Узброеных сілах Расіі праходзяць службу ў якасці кантрактнікаў 295 замежных грамадзян. Паводле расійскага заканадаўства, праз тры гады яны маюць права атрымаць расійскае грамадзянства. Сёння ва УС Расіі служаць 22 грамадзяніны Азербайджана, 22 — Арменіі, 8 — Беларусі, 1 — Грузіі, 12 — Казахстана, 11 — Кіргізіі, 17 — Малдовы, 89 — Таджыкістана, 66 — Узбекістана, 9 — Туркменіі, 9 — Украіны.

■ Па меншай меры 113 чалавек сталі ахвярамі даўкі, што адбылася ў храме горада Джодхпур на Захадзе Індыі. У храме сабраліся напярэдадні індускага фестывалю больш за 25 тыс. вернікаў. Паводле папярэдніх даных, даўка пачалася, калі нехта паслізнуўся. Гібель паломнікаў у даўцы каля храмаў — не рэдкасць у Індыі, так як падчас рэлігійных святаў туды накіроўваюцца сотні тысяч чалавек.

■ Супрацоўнікі аддзела па барацьбе з кантрабандай Віцебскай мытні спынілі партыю вырабаў з каляровага металу ацэначным коштам амаль Br250 млн. Аўтамабіль «Івека», якім кіраваў грамадзянін Беларусі, перавозіў у Расію больш за 100 тыс. латунных загатовак для ключоў, у адрас расійскай юрыдычнай асобы, пры гэтым у вадзіцеля адсутнічалі неабходныя дакументы на вываз вырабаў з каляровых металаў. Вядзецца расследаванне. Вінаватым пагражае штраф да 300 базавых велічыняў і канфіскацыя тавару, рашэнне аб чым прымае суд.

■ У Цярнопальскай вобласці да трох гадоў пазбаўлення волі асуджаны манах, які ўкраў у манастыры каля 17 тыс. еўра і прайграў іх у казіно. Калі ў манастыры рабілі рамонт, ён зрабіў дублікат ключа ад келлі манаха-святара і ў зручны момант прабраўся туды. Ён украў тры канверты з грашыма, якія былі схаваныя ў скрыні. У канвертах аказалася амаль 17 тыс. еўра, 60 долараў, 2 тыс. грн. і 350 польскіх злотых. Пасля гэтага манах выклікаў таксі і з'ехаў у суседнюю вобласць. Выявіўшы прапажу грошай і знікненне манаха, кіраўніцтва манастыра звярнулася ў міліцыю. Збеглага манаха знайшлі ў гасцініцы суседняй Львоўскай вобласці, але грошай у яго ўжо не было — ён прагуляў іх у казіно. На судзе ён прызнаў сваю віну.

■ У Егіпце турэмныя зняволеныя цяпер могуць заказваць ежу ў рэстаранах. Гэтыя абавязкі ўскладзены на кіраўніцтва турмаў. Паводле спецыяльнага судовага рашэння, такія паслугі будуць распаўсюджвацца на асуджаных падчас посту. Аднак, як заявіў прадстаўнік адной з турмаў, такі дазвол будзе дзейнічаць і пасля заканчэння посту. Па словах чыноўнікаў, зняволеныя самі аплачваюць свае заказы, а часцей за ўсё яны заказваюць кебаб і піцу.

■ Кожнага замежніка, што прыбывае ў Вялікабрытанію, пры прызямленні ў аэрапорце цяпер будуць частаваць кубкам сапраўднай англійскай гарбаты з традыцыйным печывам. Так улады спрабуюць палепшыць першае ўражанне ад краіны, вядомай сваім зменлівым надвор'ем, а таксама перабоямі, з якімі працуюць буйныя брытанскія аэрапорты. Такую ідэю прапанавала кіраўніцтва адной з буйнейшых сетак прадуктовых магазінаў, і яна з энтузіязмам была ўспрынятая ўладамі. Сярод існуючых на Брытанскіх астравах гатункаў печыва выбар быў зроблены на карысць знакамітага «Джэмі Доджэрс» з маліновай начынкай.

Поўны абзац

■ Помнік украінскай жабе ўстанавілі ў горадзе Голая Прыстань Херсонскай вобласці. Упрыгожыць 200-кілаграмовай скульптурай было вырашана любімае месца адпачынку гараджан — набярэжную мясцовай ракі. Напярэдадні арганізатары аб'явілі конкурс сярод мясцовага насельніцтва на лепшае выяўленне недахопаў украінцаў. У выніку народнага галасавання было ўстаноўлена, што найбольшай бядой нацыі з'яўляюцца сквапнасць і зайздрасць. Акрамя гэтага, за паўгода да адкрыцця помніка аб'явілі конкурс на лепшы подпіс да кампазіцыі, што ўвасабляе гэтыя недахопы. Перамаглі ў конкурсе такія вершаваныя радкі: *«Якби вас жаба не давила, І щоб була у нас ще сила, І ще щоб мудрості додати — Яку б країну можна мати!»* Скульптура з'яўляецца народнай, яна зробленая з падручных матэрыялаў: пенапласту, цэменту, фарбы.

■ Малады брытанец, які выклікаў свайго прыяцеля на кулінарны паядынак, каб высветліць, хто можа з'есці болей вострага соусу, памёр праз некалькі гадзін пасля таго, як пакаштаваў сваю страву з чылійскіх перцаў. 33-гадовы грузчык, у якога было выдатнае здароўе і які да ўсяго нядаўна прайшоў медыцынскае абследаванне на працы, пайшоў у заклад з братам сваёй дзяўчыны — хто болей з'есць прыгатаванага з хатніх перцаў чылі соусу. Апанент грузчыка змог з'есці толькі адну лыжку, у той час як сам аўтар стравы праглынуў поўную талерку стравы. Праз некаторы час пасля гэтага ён памёр ад сардэчнага прыступу. Урачы нічым не змаглі яму дапамагчы.

Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармагенцтваў.

«Гарачы» тэлефон «Звязды» 287 17 41

Заявы на высяленне — хутчэй, проста пагрозы. А доўг па «камуналцы» можна пагасіць некалькімі спосабамі

Сям'я нашай заяўніцы са Слуцка (прозвішча па этычных меркаваннях называць не будзем) патрапіла ў даволі складаную жыццёвую сітуацыю. Дакладней, жыллёвую. Самастойна яе вырашыць не атрымалася, таму чытачы і вырашылі звярнуцца па дапамогу ў рэдакцыю.

— Пасля смерці бацькоў майму мужу і яго брату дасталася трохпакаёвая непрыватызаваная кватэра, яны там былі прапісаны. Фактычна ж у ёй пражывала наша сям'я: муж, я і старэйшае дзіця, — расказвала чытачка. — У 2007 годзе мы вырашылі зрабіць у кватэры рамонт і з гэтай нагоды з'ехалі жыць у катэдж да маіх бацькоў. У брата мужа ад жылля былі ключы і, скарыстаўшыся момантам, яго сям'я пераехала ў кватэру: муж, жонка, яе дзіця ад першага шлюбу і іх агульнае дзіця. Сям'я гэта — неспрыяльная, з даходаў у іх фактычна толькі пенсія старэйшай дачкі па страце карміцеля. Нідзе не працуюць, хоць, напрыклад, муж двойчы спрабаваў працаўладкаваць брата. І вось яны жывуць у кватэры ўжо больш за год, не плацячы ніякіх камунальных плацяжоў. Доўг склаў 780 тысяч рублёў. Урэшце мы вырашылі раздзяліць асабовыя рахункі, што і было зроблена ў адпаведнасці з рашэннем выканкама. Нашай сям'і дасталося 2/3 кватэры, але ў такой жа прапорцыі быў падзелены і доўг за «камуналку». Яго мы ўжо часткова выплацілі, засталося толькі 280 тысяч рублёў у месяц, балазе, нейкіх жорсткіх тэрмінаў нам не ўстанавілі. Але чаму мы павінны плаціць за паслугі, якімі не карыстаемся, бо жылі не ў гэтай кватэры?! Да таго ж за гэты час я нарадзіла яшчэ адно дзіця (яго прапісалі ў памянёную кватэру), цяпер знаходжуся ў водпуску па яго доглядзе. Чаму я павінна фактычна адбіраць грошы ў сваіх дзяцей, каб заплаціць за сям'ю брата мужа, дзе нікто не хоча працаваць? Мы неяк звярталіся ў сацыяльную службу з просьбай аказаць матэрыяльную дапамогу, дык адмовілі: даход на члена сям'і на той момант перавысіў на 20 тысяч вызначаны памер, пры якім мы маглі б разлічваць на такую падтрымку. А тут яшчэ брат мужу пагражае ўвогуле выпісаць яго з кватэры зусім... Дапамажыце, калі ласка.

Па просьбе рэдакцыі падрабязную праверку выкладзеных фактаў правяла начальнік жыллёвага аддзела Слуцкага райвыканкама Людміла Папчэня.

— Так, сапраўды, засталіся два браты, ёсць дзяржаўная кватэра, у якой яны прапісаны ці зарэгістраваны, як цяпер больш правільна гаварыць. Там жа прапісаны і малодшы сын вашай заяўніцы, — пацвердзіла Людміла Міхайлаўна. — Першапачаткова прыборы ўліку ў гэтай кватэры ўстаноўлены не былі і ўсе разлікі вяліся паводле нарматыву, зыходзячы з колькасці зарэгістраваных у ёй. Людзі маглі не аплачваць частку камунальных плацяжоў, калі нейкі час не пражывалі ў кватэры і прадаставілі наконт гэтага дакументы. Тут версіі камунальнікаў і вашых заяўнікаў разыходзяцца: апошнія сцвярджаюць, што папярэджвалі пра адсутнасць вусна, першыя кажуць, што гэтага не было. Пісьмовай заявы сапраўды не знойдзена.

Дарэчы, нават пры яе наяўнасці адлічэнні на капітальны рамонт і тэхнічнае абслугоўванне ўсё роўна даводзілася б уносіць. Але агульная сума доўгу магла быць меншай.

— Нарэшце ў кватэры ўстанавілі лічыльнікі і сёлета ў ліпені рашэннем выканкама асабовыя рахункі былі раздзелены. Сям'я заяўнікаў сапраўды пагасіла ўжо частку доўгу, — сказала начальнік жыллёвага аддзела райвыканкама.

Што можна параіць гэтай сям'і, улічваючы не самае шыкоўнае матэрыяльнае становішча? Ёсць некалькі варыянтаў. Па-першае, зноў паспрабаваць звярнуцца ў органы сацыяльнай абароны, паспрабаваць атрымаць, з улікам ужо сённяшніх даходаў на члена сям'і, адрасную дапамогу. Па-другое, можна аплаціць асноўны доўг — 94 тысячы рублёў, а на суму пені (за доўгі час яе «набегла» амаль на 180 тысяч рублёў) напісаць заяву з просьбай аб скасаванні. Менавіта пры ўмове пагашэння сумы асноўнага доўгу адлічэнні на капітальны рамонт будуць спыненыя. Трэцяе — падаць заяву ў суд з патрабаваннем аб падзеле лічавога рахунка. Праўда, пры гэтым не трэба забывацца аплачваць і бягучыя плацяжы — важна, каб запазычанасць не павялічвалася.

Што да пагрозаў аднаго брата выпісаць з кватэры другога...

— Падставай для гэтага можа быць, напрыклад, адсутнасць, нез'яўленне ў памянёнай кватэры на працягу паўгода мужа вашай заяўніцы. Тады, у тым ліку і на падставе паказанняў сведак, можна паспрабаваць гэта зрабіць, але праз суд. Я размаўляла з мужчынам. Ён рэгулярна з'яўляецца ў жыллі, так што падстаў для хвалявання няма, — зазначыла Людміла Міхайлаўна.

Думаецца, што ўсё гэта не больш чым пагрозы. Да таго ж пры звароце ў суд патрэбны сродкі, каб аплачваць гэтую працэдуру. Як высветлілася, з люта га — яшчэ да падзелу асабовых рахункаў — у кватэры адключана ацяпленне, халодная і гарачая вада. Тэарэтычна ўсё гэта можна падключыць толькі пасля аплаты доўгу кожным з бакоў. Калі сваю частку аплаціць толькі сям'я заяўнікаў, паўстане пытанне аб падачы вады і цяпла толькі на іх частку жылля (што на практыцы таксама можа выклікаць пытанні). Другая ж сям'я пакуль не мае магчымасці з-за адсутнасці сродкаў пагасіць нават сваю частку запазычанасці.

Сяргей РАСОЛЬКА.

На слыху

БІРЖЫ ЗНОЎ ЗАЛІХАМАНІЛА...

Учора праца расійскіх біржаў пачалася з абвалу: федэральная служба па фінансавых рынках (ФСФР) вымушана была нават прыпыніць таргі літаральна ў першыя хвіліны. Ліхаманка на сусветных фондавых пляцоўках у чарговы раз выклікала перапалох і на расійскім фондавым рынку.

Двух гадзін, што доўжылася паўза ў таргах, хапіла, каб зняць напружанне: пасля іх пачатку катыроўкі пачалі ўзнаўляцца. Тым не менш, цэны большасці расійскіх ліквідных акцый панізіліся. Паводле меркавання экспертаў, падставай для ўзрушэння на расійскіх біржах стаў абвал індэксаў на сусветных, прычым падзенне амерыканскіх Dow Jones і Nasdaq было рэкордным за ўвесь час іх існавання. Што датычы

МЕСТНОЕ САМОУПРАВЛЕНИЕ

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

1 кастрычніка 2008 г. № 37 (140)

ДЫЯЛОГ З УЛАДАЙ

«АДЧУЦЬ» СВАЮ ТЭРЫТОРЫЮ

Апошнім часам аб павышэнні ролі сельскіх і пасялковых Саветаў у вырашэнні праблем вёсак і невялікіх гарадоў гаворыцца шмат. І гэта правільны падыход — хоць бы часткова перанесці адказнасць за вырашэнне мясцовых праблем на пярвічны ўзровень улады. Каб менавіта на гэтым узроўні непакоіліся пра забеспячэнне людзей цяплом, святлом, вадой, працоўнымі месцамі, бытавымі паслугамі і г.д.

Старшыня Чэрвеньскага раённага Савета дэпутатаў Генадзь ЗАВАДСКІ, з якім мы не так даўно гутарылі, лічыць, што змены на ўзроўні пярвічнага звяна ўлады сапраўды адбываюцца, і змены заўважныя. У першую чаргу яны датычацца стаўлення кіраўнікоў сельскіх Саветаў да гэтага самага жыццезабеспячэння. І, безумоўна, да людзей.

— Адыходзіце паступова ад «казёншчыны»?

— Цяпер яе і сапраўды стала менш. Уся работа мясцовай улады будуецца на цесным кантакце з насельніцтвам. Формы работы — тыя ж сходы, прыёмы, «прамыя лініі» — засталіся ў асноўным ранейшымі, што тут вынайдзеш? Але «загучалі» яны па-іншаму, сталі больш зразумелымі людзям і набліжанымі да іх патрэб. А работа з актывам — я маю на ўвазе старэйшын — і ўвогуле набыла другое дыханне. Людзі на «пасады» вясковых «мэраў» падабраліся такія, якія менавіта жывуць інтарэсамі сваёй вёскі. Яны заўсёды «ў курсе», і калі нейкая праблема абвастраецца, адразу звязваюцца са старшынёй сельскага Савета: прыміце меры!

— І ў навядзенні парадку на сваёй сядзібе, наколькі я ведаю, яны прыклад паказваюць...

— Не толькі на сваёй сядзібе. Змяніць знешні выгляд населеных пунктаў — адна з асноўных нашых задач. Ад таго, у якім асяродку жыве чалавек, многае залежыць — яго стаўленне да працы, яго выхаванасць, унутраны свет... Таму трэба змяняць знешні выгляд не толькі населеных пунктаў, але і вытворчых памяшканняў тых жа СВК, дзе ў асноўным працуюць вяскоўцы. Мы паставілі перад сабой мэту — навесці парадак на ўсіх фермах, на ўсіх вытворчых аб'ектах. Усе нашы мехдвары заасфальтаваныя, вакол фермаў наводзіцца парадак... Хоць сказаць, што мы дабіліся ўсяго, чаго хацелі, яшчэ нельга. Праблем таксама хапае.

— З чым, напрыклад?

— Наш раён мяжуе з Мінскім раёнам і знаходзіцца недалёка ад сталіцы... Людзі ад'язджаюць у пошуках лепшых заробкаў, умоў працы — і гэта натуральна. Але ж застаецца шмат пустых дамоў, участкаў, якія з цягам часу прыходзяць у заняпад, а гэта не можа садзейнічаць паляпшэнню знешняга выгляду вёскі. Прычым, многія ўладальнікі пустых дамоў вядомыя, ды толькі сельскаму Савету не так проста знайсці «рычагі ўздзеяння» на іх. Паводле новага Адміністрацыйнага кодэкса, сельвыканкам не мае права накладаць штрафныя санкцыі. А вось, напрыклад, экалагічная служба мае. І мы выкарыстоўваем гэта — вельмі цесна супрацоўнічаем і з экалагічнай, і з санітарнай, і з землеўпарадкавальнай службамі раёна. Разам з імі перыядычна праводзім рэйды па добраўпарадкаванні — ствараем некалькі груп і за адзін-два дні аб'язджаем усю тэрыторыю сельсавета, кожны населены пункт. Натуральна, даём прадпісанні і па кожным пустым доме ці ўчастку. Запрашаем у рэйд і прадстаўніка раённай газеты, фотакарэспандэнта — адлюстроўваем у мясцовай прэсе і добрае, і дрэннае. А гэта, паверце, дае эфект.

Старых, трухлявых дамоў у нас на тэрыторыі крыху больш за 190, а пустых — за 440.

(Заканчэнне на 2-й стар. «МС».)

У ПОЛАЦКУ ЁСЦЬ УСЁ,

АБО АМАЛЬ УСЁ. АЛЕ ГЭТА «АМАЛЬ» ГАРАДСКІЯ ЎЛАДЫ АБЯЦАЮЦЬ НЕЎЗАБАВЕ ВЫПРАВІЦЬ

Ёсць у нашай краіне такі горад, вельмі падобны на Грэцыю. Тым, што там таксама «ўсё ёсць» — усё, што цікава турысту. Гэта старажытны Полацк, калыска Беларусі.

Курс на «турыфікацыю»

Гісторыя, культура, прырода... Наогул усё гэта было ў Полацку і раней. Турысты прыязджалі, але каб масава — не скажаш. Усё больш школьнікі — для пацвярджэння ведаў, атрыманых на занятках.

З прыходам на пасаду старшыні Полацкага гарвыканкама Уладзіміра Тачылы мясцовыя ўлады ўзялі курс на «турыфікацыю» і цяпер ажыццяўляюць ужо другую комплексную праграму развіцця Полацка як гісторыка-культурнага турыстычнага цэнтра. Мэта зразумелая — Полацк павінны наведваць не менш як тры мільёны турыстаў у год, а даходы ад турызму павінны стаць значнай часткай гарадскога бюджэту. І гэтыя чаканні апраўданыя, бо сёлета вучоныя даказалі: менавіта ў Полацку знаходзіцца геаграфічны цэнтр Еўропы.

Пакуль што лічба наведванняў у тры разы меншая, але ўжо ёсць шмат ідэй для таго, каб яе павялічыць. Найперш развіваецца турыстычная інфраструктура. Змяніла сваё аблічча, прапаноўвае шэраг сучасных паслуг гасцініца «Дзвіна», у планах — будаўніцтва новых гасцінічных будынкаў. Бурна развіваецца гандаль: тут не пабаяліся даць прастору прыватнай ініцыятыве, і ў горадзе з'явіліся новыя гандлёвыя комплексы і рынкі. У разы павялічылася колькасць кафэ, дзе можна цудоўна павячэраць па прымальнай цане і адпачыць, стаміўшыся ад разглядвання славутасцяў.

Дзе можна даведацца аб славутасцях незнаёмага горада? Да паслуг турыстаў у Полацку турбюро, інфармацыйныя тумбы, мноства даведнікаў, фотаальбомаў, ёсць і спецыяльны сайт у інтэрнэце. Куды лепш адправіцца, можна параіцца і з мясцовымі жыхарамі.

Вядома ж, як гаворыцца, дзеду міла, а ўнуку гніла, але ў Полацку такая вялікая колькасць варыянтаў маршрутаў, што кожны знойдзе штосьці па душы для сябе.

Полацк паломніцкі...

«На Беларусі бог жыве», і магчыма, менавіта тут, у Полацку. Гэты горад можна параўнаць з Меккай або Іерусалімам для беларусаў. Тут была заснавана першая беларуская епархія, пабудаваны адзін з трох Сафійскіх сабораў Старажытнай Русі, адсюль родам святая заступніца Беларусі Ефрасіння. Духоўны цэнтр Полацка — манастыр, заснаваны ёй. Да яго вядзе вуліца, названая ў гонар святой. І ў выхадныя, і ў будні ў манастыры шмат наведвальнікаў. У царкве Святога Спаса, які пабудаваў дойлід Іаан на заказ Ефрасінні, знаходзяцца яе нятленныя мошчы ў спецыяльнай сярэбранай раце, нядаўна адноўленай па ранейшых фатаграфіях беларускім майстрам-ювелірам Мікалаем Кузьмічом — гэтак жа, як і знакаміты крыж Ефрасінні Полацкай, першапачаткова выраблены Лазарам Богшам. На сценах царквы яшчэ захаваліся і рэстаўруюцца фрэскі XII стагоддзя. На адной з іх выяўлены лік і самой святой.

Можна пачаць маршрут ад Сафійскага сабора, дзе правяла юнацтва Ефрасіння, калі яшчэ яе звалі мірскім імем Прадслава. Перайсці на другі бераг Палаты па перакідным мосце, прайсці сцяжынкамі да другога моста, ужо аўтамабільнага, па вуліцы, названай у гонар святой, дайсці да манастыра і папрысутнічаць на малебне. Паставіць свечку за здароўе сваіх блізкіх і адчуць сябе лёгка і светла.

(Заканчэнне на 2-й стар. «МС».)

Унікальны горад-музей быў заснаваны ў IX, а паводле апошніх археалагічных звестак, у VIII стагоддзі там, дзе рака Палата (ад якой і пайшла назва горада) упадае ў Заходнюю Дзвіну, што нясе воды да Балтыйскага мора. Размешчаны на знакамітым гандлёвым шляху «з варагаў у грэкі», горад квітнеў. Развіваліся рамёствы, гандаль, культура. Полацк быў жамчужынай у кароне гарадоў Вялікага Княства Літоўскага і Рэчы Паспалітай. Тут жылі многія культурныя дзеячы, самыя вядомыя з іх — святая Ефрасіння і першадрукар Францыск Скарына. І таму тут, як заўважаюць яго госці, такі непаўторны дух.

Сёння Полацк — буйны прамысловы і культурны цэнтр, адзін з найпрыгажэйшых гарадоў Беларусі. Тут жыве прыкладна 80 тысяч чалавек. Зусім невялікі, але чысты і прыгожы, Полацк цяпер параўноўваюць з турыстычнымі гарадамі Еўропы.

ПОСЛЕ ВЫСТУПЛЕНИЯ «МС»

СРЕДСТВ НЕТ. ИНВЕСТОР ОТ ОБЪЕКТА ОТКАЗАЛСЯ...

В № 33 «Местного самоуправления» (за 03.09.08) был опубликован критический материал «Напісанаму — верыць?..», в котором речь шла о столичном «долгострое» — магазине по улице Геологической, 133, который вот уже двадцать лет находится в состоянии «полуготовности» и никак не может открыться. Редакция получила реагирования на статью.

«Геологоразведочное республиканское унитарное предприятие «Белгеология»... рассмотрело материал «Напісанаму — верыць?..» и сообщает следующее.

Строительство встроено-пристроенного магазина по ул. Геологической, 133 в г. Минске было начато в 1994 году и приостановлено в 1996 году из-за отсутствия финансовых средств. Для окончания строительства жилого дома в 1998 году был создан ЖСК «Геолог». В марте 2001 года дом был сдан в эксплуатацию. В 2001 году из средств, выделенных ПО «Белгеология» (15 млн руб.), был завершен монтаж плит, покрытий и устройства кровли магазина в целях консервации объекта.

В сентябре 2001 года Геофизической экспедицией ПО «Белгеология» был заключен договор с УП «Авторемпромпроект» с целью определения технического состояния магазина. В 2007 году в связи с корректировкой проекта УП «Авторемпроект» вторично было проведено обследование конструкций. По данному проекту было получено положительное заключение экспертизы.

В 2008 году РУП «Белгеология» заключило договор с ЗАО «Полесская инновационно-строительная компания» на строительство и инвестирование магазина (торгово-офисного центра).

В июле 2008 года ЗАО «Полесская инновационно-строительная компания» приступила к выполнению строительно-монтажных работ. Однако в процессе работы (после разборки кирпичной кладки) были выявлены дефекты несущих конструкций, не отраженные в проектной документации.

УП «Авторемпроект» в третий раз произвело обследование строительных конструкций и определило, что техническое состояние характеризуется IV категорией (предварительное состояние). Согласно СНБ 1.04.01-04, IV категория — неработоспособное состояние, требуется срочное ограничение нагрузок, капитальный ремонт и усиление или замена элементов, конструкций.

С 8 сентября 2008 года, из-за сложного состояния объекта незавершенного строительства, ЗАО «Полесская инновационно-строительная компания» отказалась от исполнения договора.

В настоящее время УП «Авторемпромпроект» вторично выполняет проект усиления конструкций с необходимыми расчетами. Окончательное решение по завершению строительства данного объекта будет определено после проведения обследования и выдачи проектного решения.

23 сентября 2008 года состоялось совещание у Главы Администрации Партизанского района г. Минска с участием директора Департамента по геологии В.В. Карпука и главного инженера РУП «Белгеология» Г.И. Скачкова по указанной проблеме. В связи с отсутствием в РУП «Белгеология» собственных средств на завершение строительства данного объекта в ходе совещания было принято решение о его продаже и незамедлительной подготовке документов на отчуждение в установленном законодательством порядке.

А.Н. ШУРАВИН,
генеральный директор геологоразведочного республиканского унитарного предприятия «Белгеология».

* * *

«Министерство природных ресурсов и охраны окружающей среды Республики Беларусь рассмотрело статью «Напісанаму — верыць?..» и сообщает следующее.

В феврале 2008 года РУП «Белгеология» заключила договор с ЗАО «Полесская инновационно-строительная компания» на строительство и инвестирование магазина (торгово-офисного центра).

В июле 2008 года ЗАО «Полесская инновационно-строительная компания» приступила к выполнению строительно-монтажных работ. Однако в процессе работы (после разборки кирпичной кладки) были выявлены дефекты несущих конструкций, не отраженные в проектной документации.

В связи с этим РУП «Белгеология» предложила УП «Авторемпромпроект» как автору проекта произвести дополнительное обследование строительных конструкций. При обследовании определили, что техническое состояние характеризуется IV категорией. Согласно СНБ 1.04.01-04, IV категория — неработоспособное состояние, требуется срочное ограничение нагрузок, капитальный ремонт и усиление или замена элементов, конструкций.

В связи с непредвиденным увеличением объемов работ ЗАО «Полесская инновационно-строительная компания» отказалась от дальнейшего инвестирования и строительства торгово-офисного центра. В настоящее время руководству РУП «Белгеология» поручено обеспечить оформление проектного решения по усилению несущих конструкций здания и до 15 октября 2008 года провести поиск нового инвестора через средства массовой информации для дальнейшего строительства торгово-офисного центра и ввода его в эксплуатацию.

За непринятие эффективных мер по окончанию незавершенного строительства магазина руководство РУП «Белгеология» будет привлечено к дисциплинарной ответственности.

А.Н. АПАЦКИЙ,
первый заместитель министра природных ресурсов и охраны окружающей среды.

СПАСИБО!

ОТ ВСЕЙ ДУШИ

Я не могу не написать это письмо. Судьба распорядилась таким образом, что в связи со смертью мужа мне пришлось обратиться в Пережирский сельский Совет Пуховичского района, а именно к председателю сельского Совета Елене Ивановне ЗУБОВИЧ и секретарю Марине Геннадьевне КАШЕВСКОЙ.

Сколько внимания к сложившейся у меня ситуации, понимания и такта я встретила со стороны всех работников сельисполкома, к которым обращалась по воле необходимости — не передать словами! Чуткость, душевность председателя сельского Совета Е.И. Зубович, четкая организация работы во вверенном ей сельисполкоме оставляют чувство глубокой благодарности и признательности. И это касается работы всех сотрудников — ни единой задержки при подготовке и выдаче мне необходимых документов не было!

Очень прошу через вашу газету выразить благодарность Елене Зубович и коллективу сельского Совета за чуткость, внимание и великолепную организацию работы.

Е.Г. ЛИЗОГУБ,
г. Минск.

АДКРЫТЫ ФОРУМ

АДЗІНОКІЯ... ПРЫ ЖЫВЫХ ДЗЕЦЯХ

Насельніцтва Беларусі няўхільна старэе. Для сельскай мясцовасці гэта сёння асабліва актуальна. Калі цэнтральныя буйныя вёскі і аграгарадкі яшчэ неяк прырастаюць моладдзю, то ў аддаленых, неперспектыўных, застаюцца толькі пенсіянеры. Як яны сустрэнуць першыя маразы? Ці забяспечаны людзі палівам? Ці ўвесь ураджай з гародаў паспелі сабраць? Як выконваюцца ў такіх населеных пунктах сацыяльныя стандарты — медыцынскае, гандлёвае, транспартнае абслугоўванне? Ці не застаюцца адзінокія састарэлыя сам-насам са сваімі праблемамі?

Наталля РАСЬКО, старшыня Манькавіцкага сельскага Савета дэпутатаў Столінскага раёна:

— У нас прыгарадны сельсавет і ўсяго два населеныя пункты: вёска Манькавічы, дзе пражывае 2,5 тысячы жыхароў (тут жа знаходзіцца і сельвыканкам), і вёска Атвержычы (500 чалавек).

Сярод нашых жыхароў шмат пенсіянераў, у тым ліку адзінокіх людзей, інвалідаў. Сельскі выканкам рэгулярна праводзіць абследаванне ўмоў пражывання. Адзінокія, адзінока пражываючыя, а таксама шматдзетныя і няпоўныя сем'і, інваліды I, II групы бясплатна былі забяспечаны пажарнымі апавяшчальнікамі. Кожны год у нас распрацоўваецца праграма «Падтрымка», пад якую падпадаюць грамадзяне, якім патрэбна наша дапамога (рамонт электраправодкі, коміна і г.д.) Траім чалавекам (удзельніку Вялікай Айчыннай вайны, адзінокай пенсіянерцы і інваліду I групы) за сродкі сельвыканкама мы ўстанавілі новыя агароджы. Палівам усе нашы састарэлыя забяспечаны на 100 працэнтаў. Вы ж разумееце: ёсць такія людзі, якія самі ніколі не папросяць, не паскардзяцца... Мы, мясцовая ўлада, павінны прыйсці да кожнага і запытацца, што ім трэба, чым дапамагчы... Многім часта нестае жывога чалавечага кантактавання.

Цяпер у Манькавічах пракладаюць новы водаправод па праграме «Чыстая вада». Усім адзінокім, адзінока пражываючым, у каго няма вады, мы дапамагаем падрыхтаваць патрэбныя дакументы. У Атвержычах, якія трапілі пад чарнобыльскую праграму, усе дарогі заасфальтаваныя, ёсць водаправод, але газу пакуль няма. Заяву на яго падвядзенне мы падалі. Хутка пачнецца распрацоўка дакументацыі. Спадзяёмся, што тут, як і ў суседняй Белавушы, якая таксама лічыцца чарнобыльскай вёскай, усе работы будуць праведзены за кошт дзяржавы.

На тэрыторыі сельсавета ёсць сельскагаспадарчае прадпрыемства КУВП «Манькавічы». Многія яго работнікі жывуць у Атвержычах. Кожны дзень паміж вёскамі курсіруе аўтобус, які дастаўляе людзей на працу і завозіць дамоў. Аўтобусам прадпрыемства бясплатна карыстаюцца ўсе мясцовыя жыхары, і школьнікі, і пенсіянеры. У мясцовай гаспадарцы ёсць і касілкі, і бульбакапалкі. Прадпрыемства ніколі не адмаўляе нашым жыхарам дапамагчы ўбраць ураджай. А калі патрэбна ручная праца — у агародзе з рыдлёўкай пахадзіць, дровы пасекчы, нешта прывезці, разгрузіць — заўсёды знойдуцца аднавяскоўцы, якія захочуць падзарабіць.

Безумоўна, ёсць у нас і праблемы. Асноўная з іх — стан дарог у Манькавічах. Дабрацца да сельвыканкама у дождж, калі ўсюды грязь, няпроста. Асабліва састарэлым. Пытанне аб перадачы ўнутрывясковых нетранзітных дарог у раёне яшчэ не вырашана. Пакуль гэта ўсё яшчэ галаўны боль сельвыканкама.

Аляксандр ГУРЫН, старшыня Трабскага сельскага Савета дэпутатаў Іўеўскага раёна:

— На нашай тэрыторыі размяшчаецца 47 населеных пунктаў. У асноўным гэта маланаселеныя і аддаленыя вёскі (за 14 км ад сельвыканкама), дзе пражывае менш за 50 чалавек, і хутары, дзе часта ўвогуле па адным жыхары. Толькі ў чатырох вёсках колькасць насельніцтва набліжаецца да сотні ці перавышае яе.

Ва ўборцы ўраджаю нашым мясцовым жыхарам заўсёды дапамагае СВК. Збожжавыя мы ўжо сабралі, цяпер выбіраем бульбу. Між іншым, адзінокім, адзінока пражываючым, састарэлым і ветэранам, якія не садзілі сёлета бульбу (усяго 33 чалавекі), наш СВК бясплатна выдзеліў па 150 кг «другога хлеба».

Праз тэрыторыю сельсавета ў нас ходзяць два аўтобусы «Іўе — Піцкуны» і «Іўе — Ганчары», кожны па два разы на тыдзень. Тыя населеныя пункты, дзе жыве болей за 10 чалавек, знаходзяцца на адлегласці, якая не перавышае 3 км ад аўтобуснага прыпынку (згодна з мінімальным сацыяльным стандартам). А з хутароў і дробных вёсак да прыпынку жыхары дабіраюцца сваім ходам. Аўтобус на хутар не пусціш.

Амаль усе нашы населеныя пункты тэлефанізаваныя, за выключэннем пары хутароў, але сёлета гэтае пытанне мы павінны закрыць. Па ўсёй тэрыторыі сельсавета дзейнічае мабільная сувязь. Палівам нашы людзі забяспечаны. Праўда, на брыкет ахвотнікаў няшмат. Часцей выпісваюць дровы: імі забяспечвае Трабскае лясніцтва, дастаўка бясплатная і каштуюць дровы ўдвая танней.

Што датычыцца медыцынскага абслугоўвання, на тэрыторыі сельсавета дзейнічае паліклініка ўрача агульнай практыкі і ФАП у вёсцы Брагі. Урач з нашай паліклінікі пастаянна наведвае ўсе вёскі. Акрамя таго, рэгулярна прыязджаюць спецыялісты з раёна, працуе «хуткая дапамога». Для адзінокіх састарэлых у нас другі год адчынена бальніца сястрынскага догляду на 20 ложкаў (між іншым, запоўненая на 100 працэнтаў, нават чарга ёсць). Спачатку людзі скептычна ставіліся да сацыяльных ложкаў. Каб запоўніць месцы, даводзілася доўга ўгаворваць старых туды звярнуцца, а зараз самі просяцца. Цяпер нядрэнна было б колькасць ложкамесцаў павялічыць.

Ёсць такія людзі, якія самі ніколі не папросяць, не паскардзяцца... Мы, мясцовая ўлада, павінны прыйсці да кожнага і запытацца, што ім трэба.

Ігар ДАЛЬКОЎ, старшыня Мілаславіцкага сельскага Савета дэпутатаў Клімавіцкага раёна:

— На нашай тэрыторыі месціцца 15 населеных пунктаў, пражывае 1452 чалавекі, у тым ліку 456 пенсіянераў (сярод іх 270 адзінока пражываючых, 62 адзінокіх, 9 ветэранаў ВАВ). 10 вёсак — маланаселеныя, там пражывае 112 чалавек. Ёсць населеныя пункты, дзе ўсяго 3, 8, 9 чалавек на ўсю вёску.

Палівам нашы людзі забяспечаны — і брыкетам, і дровамі. Інваліды і ветэраны маюць ільготы па аплаце. Транспарт да райцэнтра ходзіць рэгулярна (кожны дзень — раніцай і вечарам), ёсць маршрутнае таксі і аўтобус. Усе населеныя пункты тэлефанізаваны. Нават у Данілаўцы, дзе сёння пражывае ўсяго адна жанчына, ёсць тэлефон. Аўталаўкі працуюць па графіку, без нараканняў. На тэрыторыі сельсавета ёсць участковая бальніца (стацыянар і 10 ложка-месцаў) і ФАП у Макеевічах. У маласеленыя вёскі разам з фельчарам выязджае машына «хуткай дапамогі», медыкі абследуюць насельніцтва на месцы.

У нас пастаянна праходзяць Дні інфармавання, прыязджаюць ідэалагічныя групы. Не так даўно увесь наш сельсавет аб'язджаў аўтацягнік «Клопат». Гэта рэгулярная акцыя, удзел у якой прымаюць прадстаўнікі ўсіх спецыялізаваных службаў і арганізацый раёна (медыкі, МНС, камунальнікі, прадстаўнікі сістэмы гандлю і г.д.). Аўтацягнік пабываў у кожным населеным пункце сельсавета. Яго ўдзельнікі сустракаліся з жыхарамі, пыталіся аб праблемах, калі трэба — медык мераў ціск, адпускаў лекі. Між іншым, падчас такіх сустрэч жыхары аддаленых населеных пунктаў асобых праблем не ўзнімаюць. Калі нешта і ўзнікае — мы вырашаем усё ў працоўным парадку.

Людміла ВАСІЛЬКОВА, старшыня Веляшковіцкага сельскага Савета дэпутатаў Лёзненскага раёна:

— З нашымі састарэлымі мы працуем сумесна з фондам сацыяльнага забеспячэння. На тэрыторыі сельсавета ў нас 33 населеныя пункты, 10 вёсак аддаленыя ад сельвыканкама больш чым на 20 км. У чатырох вёсках колькасць насельніцтва не перавышае 10 чалавек, яшчэ ў шасці населеных пунктах пражывае да 5 чалавек. У асноўным гэта пенсіянеры. Медыкі з нашай Веляшковіцкай участковай бальніцы рэгулярна бываюць ва ўсіх аддаленых вёсках. Акрамя таго, медыцынскае абслугоўванне праводзяць і фельчары — у нас на тэрыторыі чатыры ФАПы.

Тэлефонная сувязь ёсць ва ўсіх вёсках, прычым не толькі стацыянарная, але і мабільная. Што датычыцца транспартнага забеспячэння, па цэнтральным маршруце (з Лёзна і праз усю тэрыторыю сельсавета) аўтобус ходзіць 3 разы на дзень. Згодна з сацыяльнымі стандартамі, да асобных населеных пунктаў ён пад'язджае на адлегласць да 3 км. У тыя населеныя пункты, якія не ахоплівае цэнтральны маршрут, 3 разы на тыдзень заходзіць іншы аўтобус. Не заўсёды ён пад'язджае непасрэдна да вёскі, часта — да прыпынку на адлегласці да 3 км.

На тэрыторыі нашага сельсавета некалі размяшчалася два Саветы — наш і Кавалёўскі. У 2004 годзе мы аб'ядналіся. Цяпер кожны чацвер мы праводзім прыём у Кавалёўскай зоне, у будынку былога сельвыканкама. Акрамя таго, рэгулярна (прыкладна раз на месяц) разам з работнікамі райвыканкама арганізуем выязны прыём па ўсіх населеных пунктах.

Калі жыхарам з аддаленых вёсак патрэбна нейкая даведка з сельвыканкама, яны перадаюць просьбу праз паштальёна, ці па тэлефоне, мы рыхтуем паперы і, калі выязджаем у тую вёску на прыём, заадно вязём даведкі. Ці перадаём праз паштальёнаў.

Кожны год у восеньскі перыяд да нас звяртаюцца састарэлыя з просьбай размеркаваць іх на сацыяльны ложак (сёння ў Веляшковіцкай участковай бальніцы на сацыяльных ложках знаходзіцца 17 чалавек). Але ў многіх з іх ёсць дзеці. Жывуць у горадзе. І не ведаюць, што ў маці няма дроў на зіму, што хата старая, трухлявая. Мы без падтрымкі ні аднаго пенсіянера не пакінем, але хацелася б, каб былі лепшымі адносіны дзяцей да гэтых старых.

Інга МІНДАЛЁВА.

ДЫЯЛОГ З УЛАДАЙ

«АДЧУЦЬ» СВАЮ ТЭРЫТОРЫЮ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)

Стары дом проста так не ліквідуеш. Па-першае, у большасці выпадкаў знаходзяцца спадкаемцы. Па-другое, калі ў рэшце рэшт дом прызнаецца судом безгаспадарным, вымарачным — неабходна афармляць дакументы для перадачы яго на баланс сельвыканкама. А на гэта патрэбныя грошы... Потым, узяўшы дом на баланс, сельвыканкам павінен або выставіць яго на аўкцыён, або перадаць камусьці з тых, хто стаіць у чарзе на паляпшэнне жыллёвых умоў... Другі варыянт адразу выкрэслівайце: хто захоча «палепшыць» жыллёвыя ўмовы за кошт старых сцен? Першы варыянт таксама вельмі сумніўны — выставіць «нерухомасць» на аўкцыён можна, але хто яе купіць?

Браць дом на баланс сельвыканкаму выгадна толькі там, дзе запатрабаваная зямля. На той частцы тэрыторыі нашага раёна, якая мяжуе з Мінскім, участкі запатрабаваныя. У тым жа Смілавіцкім пасялковым Савеце няма ні пустых, ні старых дамоў.

— У некаторых раёнах пераглядаюць падыходы да адміністрацыйна-тэрытарыяльнага дзялення, сельсаветы аб'ядноўваюцца, меншыя далучаюцца да большых.

— Лічыцца, што найбольш аптымальны варыянт, калі на тэрыторыі сельсавета пражывае 2000 насельніцтва і больш. Нам таксама рэкамендавалі пайсці па шляху аб'яднання ці далучэння. Але тут нельга карыстацца адной «схемай». Бо можа так здарыцца, што цэнтр новага — аб'ядынага — сельсавета акажацца занадта аддаленым ад некаторых населеных пунктаў, і ў людзей у сувязі з гэтым з'явяцца нязручнасці і праблемы.

З іншага боку, існуюць варыянты, калі адно сельскагаспадарчае прадпрыемства знаходзіцца на тэрыторыі адразу двух сельсаветаў. Гэта таксама стварае пэўныя нязручнасці — і для людзей, і для сельгаспрадпрыемства... З цягам часу ў такіх выпадках будзем перадаваць тэрыторыю, на якой знаходзіцца СВК, якому-небудзь аднаму сельсавету. І гэта нармальна — гаспадарка павінна быць цэлай і непадзельнай. Безумоўна, сама працэдура аб'яднання пачнецца з правядзення сходаў грамадзян — неабходна выслухаць усе «за» і «супраць».

— Указ № 21 «Аб павышэнні ролі сельскіх Саветаў у вырашэнні пытанняў жыццезабеспячэння насельніцтва» ўключае ў сябе як бы тры асноўныя складовыя. Гэта бюджэт, кадры і перадача некаторых аб'ектаў на баланс спецыялізаваных арганізацый. Давайце пачнём з фінансавання. У вашых сельсаветаў высокі ўзровень датацыйнасці?

— Усё залежыць ад самога сельсавета. Ад яго інфраструктуры і месцазнаходжання. На сёння нашы сельсаветы забяспечваюць свой бюджэт у сярэднім на 20 працэнтаў. Але ёсць такія, што і на 40. Чэрвеньскі раён у асноўным сельскагаспадарчы і сам датуецца з абласнога бюджэту больш чым на 50 працэнтаў.

Самая рэальная крыніца даходаў для нашых сельсаветаў — продаж з аўкцыёну зямельных участкаў. Усё астатняе — падатак на нерухомасць і зямлю, збор з нарыхтоўшчыкаў, аграэкатурызм — прыносіць невялікія сродкі.

Магчымасці правядзення аўкцыёнаў мы разгледзелі па кожным сельсавеце, і зараз 6 з іх рыхтуюць адпаведную дакументацыю. Той жа Смілавіцкі пасялковы Савет ужо мае вопыт правядзення аўкцыёнаў — сёлета за 4 участкі выручылі крыху больш за 103 мільёны рублёў. Усе грошы засталіся ў пассавеце і былі накіраваны на добраўпарадкаванне.

— А што рабіць іншым — тым, чыя зямля не карыстаецца попытам?

— Скажу шчыра — тут многае залежыць ад ініцыятывы старшыні сельскага Савета, яго жадання актывізавацца, адчуць сябе гаспадаром сваёй тэрыторыі... Можна стварыць, да прыкладу, хоць бы тое ж звяно па аказанні дапамогі насельніцтву: дровы нарыхтоўваць, зямлю араць, бульбу акучваць і г.д. Гэтага ў нас пры сельвыканкамах пакуль практычна няма, часткова такога роду паслугі аказвае раённы КБА.

— Калі мы ўжо загаварылі пра старшыню сельскага Савета і яго статус... Мне адзін раённы кіраўнік расказваў: маўляў, прыязджае старшыня райвыканкама ў сельсавет — паглядзець, што ды як. Заязджае ў праўленне СВК, запрашае ў машыну кіраўніка гаспадаркі — і паехалі далей удваіх. Пра старшыню сельскага Савета і не ўспомнілі... Адкуль узяцца аўтарытэту?

— Ды і на ўзроўні раёнаў у дачыненні да старшынь райсаветаў некаторыя мясцовыя кіраўнікі дапускаюць ментарскі тон, непаважлівае стаўленне — гэта не сакрэт, мае калегі не будуць гэта аспрэчваць. Між тым, менавіта адсюль, ад узроўню ўзаемаадносінаў кіраўнікоў дзвюх галін улады, і бяруць свой пачатак як стаўленне да прадстаўнічай улады ў цэлым, так і стаўленне да старшынь сельскіх Саветаў у прыватнасці...

Асабіста я задаволены нашым «пярвічным звяном» — кіраўнікамі сельскіх Саветаў. Хацелася б толькі, каб яны больш актыўна шукалі магчымасці нармальна жыць на сваёй тэрыторыі — Указ № 21 прадаставіў для гэтага заканадаўчую аснову. Быць старшынёй сельскага Савета — гэта не толькі даведкі выдаваць ды пячаткай размахваць, як некалі. Неабходна «адчуць» сваю тэрыторыю, яе патрэбы, і зразумець, што ты тут не госць, а гаспадар.

— Не магу не пацікавіцца, як у Чэрвеньскім раёне адбываецца перадача дарог і сістэм водазабеспячэння спецыялізаваным арганізацыям? Тут «вымалёўваецца» шмат праблем, прычым паўсюдна...

— Давайце размяжуем паняцці «дарогі» і «вуліцы». У нас 197 сельскіх населеных пунктаў. Усе транзітныя дарогі, што праходзяць праз вёскі, і тыя, што злучаюць населеныя пункты, — абслугоўвае ДРБУ. А вось вуліцы знаходзяцца пакуль што на балансе або сельскагаспадарчых прадпрыемстваў, або сельвыканкамаў. Тут ёсць два варыянты: перадаць іх раённай ЖКГ ці дарожнай службе. Але спяршу мы павінны ацаніць рэальныя магчымасці абедзвюх гэтых арганізацый, іх матэрыяльную базу. Безумоўна, можна скарыстацца «сілавымі» метадамі — перадаць усё адным росчыркам пяра. Але што атрымаем у рэальнасці — без належнай матэрыяльнай базы?

Прывяду такі прыклад. У раёне перададзены на баланс ЖКГ міні-палігоны (іх 65). Але перад гэтым мы хоць крыху, але ўмацавалі матэрыяльную базу жыллёва-камунальнай гаспадаркі — закупілі ім грэйдэр, бульдозер... І цяпер больш-менш упэўненыя, што здолеем наводзіць на мініпалігонах парадак.

Перадаваць дарогі і сістэмы водазабеспячэння, безумоўна, трэба. Але так, каб не наламаць дроў. Без залішняй паспешлівасці, паэтапна. Каб у выніку не пацярпелі людзі.

— Генадзь Анатольевіч, якія аргументы могуць сёння пераканаць чалавека застацца ў вёсцы?

— Адказ просты: дастойныя ўмовы працы, наяўнасць жылля, нармальны адпачынак. І, безумоўна, зарплата. Як павысіць яе ўзровень? Толькі за кошт развіцця вытворчасці, у тым ліку і сельскагаспадарчай. Тут ёсць над чым падумаць уладзе. Прычым усім яе ўзроўням.

Наталля КАРПЕНКА.

Чэрвеньскі раён.

ФОРС-МАЖОР

І САМ ДАВАЎ

Міхаіл Васільевіч (прозвішчы ў артыкуле зменены) пасля заканчэння ўніверсітэта па службовай лесвіцы ўзнімаўся імкліва. Яму яшчэ не споўнілася сарака гадоў, а ўжо займаў прэстыжную пасаду ў адным буйным горадзе Гомельшчыны. А менавіта: быў генеральным дырэктарам адкрытага акцыянернага таварыства «Гандлёвы цэнтр», якому падпарадкоўвалася вялікая сетка магазінаў.

Кожная з гэтых установ змагалася за тое, каб выканаць план, зарабіць прэмію як надзейны дадатак да зарплаты. І ў цэлым мэта дасягалася, што, вядома ж, садзейнічала росту аўтарытэту кіраўніка гандлёвага цэнтра. Тым больш, што ён мог паспяхова выступаць на раённай ці абласной нарадах, уносіць нейкія прапановы па эфектыўнасці вытворчасці, па іншых пытаннях, якія абмяркоўваліся там. Аднойчы Міхаіл Васільевіч вырашыў, што яму ўжо цесна ў рамках займаемай пасады. Трэба праявіць сябе ў грамадскай рабоце, паслужыць як след народу. Так вось і стаў ён дэпутатам райсавета.

І ўсё, напэўна, было б добра, калі б сутнасць дэпутацкай службы ў спалучэнні са сваёй высокай пасадай ён разумеў правільна, як належыць. На жаль, гэтага не здарылася, бо Міхаіла Васільевіча пачало заносіць: то ў правы бок, то ў левы.

У падпарадкаванні генеральнага дырэктара гандлёвага цэнтра знаходзяцца некалькі дырэктараў магазінаў. З імі, як вядома, заключаюцца працоўныя кантракты на пэўны тэрмін работы. І тут, лічы, многае залежыць ад асабістай пазіцыі генеральнага: хачу — прадоўжу кантракт з канкрэтным дырэктарам, хачу — не. Паспрабуй аспрэчыць яго рашэнне падначаленаму, які па службе знаходзіцца на ніжэйшай прыступцы.

Напэўна, гэту ісціну добра зразумела дырэктар аднаго магазіна Ніна Пятроўна, калі ў сакавіку 2006 года Міхаіл Васільевіч патрабаваў ад яе 150 тысяч рублёў. Прайшло пяць месяцаў, і яна перадала яму яшчэ 50 тысяч, а праз тры месяцы — 200 тысяч. Грошы ён не вярнуў і не абяцаў вярнуць. Чаму яна дала іх? Бо ведала: генеральны не церпіць адмовы. Мог звольніць з работы, не прадоўжыць кантракт. А ёй гэта трэба?

Правільна кажуць у народзе, што апетыт прыходзіць падчас яды. Так і тут. Калі ў 2006 годзе «ганарары», якія атрымліваў Міхаіл Васільевіч, былі не такімі ўжо і вялікімі, у межах некалькіх дзесяткаў і соцень тысяч рублёў, дык далей яны пачалі ўзлятаць угору. Можа, па той прычыне, што цэны на прадукты харчавання ды і іншыя тавары пайшлі ў рост і генеральнаму не хапала на хлеб. А можа і па іншай. Не будзем гадаць. Бо факт застаецца фактам.

Святлана Сяргееўна працавала дырэктарам іншага магазіна, і першапачаткова ў яе былі добрыя ўзаемаадносіны з генеральным, але апошнім часам ён часта пачаў рабіць ёй заўвагі па рабоце і не хацеў прадаўжаць кантракт. І тады ў лютым 2008 года, каб застацца працаваць на сваёй пасадзе, яна дала яму 700 тысяч рублёў. Той прыняў іх за мілую душу, памятаючы, што тэрмін кантракта са Святланай Сяргееўнай закончыўся ўжо каля месяца таму. Дырэктар чакала, што генеральны нарэшце скажа ёй жаданае «так» і выдасць адпаведны загад на далейшае яе знаходжанне на ўказанай пасадзе — але той не спяшаўся гэта рабіць. Жанчына па сутнасці знаходзілася ў яго «на кручку». Гэтак жа, напэўна, як і яе намесніца. Таму яны зноў «пазалацілі ручку» Міхаіла Васільевіча ў сакавіку — 1 млн 200 тыс. рублёў і 1 мільёнам у красавіку.

Між тым, злачыннымі дзеяннямі кіраўніка-дэпутата зацікавіліся ўжо супрацоўнікі Гомельскага ўпраўлення КДБ, аб чым той, вядома, не падазраваў. А кропка ў справе хабарніка была пастаўлена пасля наступных падзей.

...У будынку, дзе размяшчаўся гандлёвы цэнтр, у фае на першым паверсе мелася свабодная плошча. Калісьці тут, каля лесвічнага марша, знаходзіўся гандлёвы пункт, аднак работнікі раённага аддзела па надзвычайных сітуацыях выдалі прадпісанне перанесці яго ў іншае месца — з-за парушэнняў правілаў пажарнай бяспекі.

Аднак кіраўнікам гандлёвага цэнтра карцела здаць тую плошчу ў арэнду, і генеральны дырэктар даручыў гэту справу юрысконсульту прадпрыемства, накіраваўшы яе на «размову» да знаёмага намесніка начальніка аддзела па надзвычайных сітуацыях. А каб той не ўпарціўся, яна павінна была паабяцаць яму адзін мільён рублёў.

Як вяліся перамовы, расказваць не будзем. А вось што ў выніку атрымалася, скажам. Адпаведныя органы пракансультавалі намесніка начальніка па надзвычайных сітуацыях, і ён сам прыйшоў у кабінет да генеральнага дырэктара — з дазволам адкрыць гандлёвы пункт. Апошні спытаў, колькі гэта паслуга будзе каштаваць, а той адказаў: вырашайце самі, колькі можаце, столькі і дайце. Генеральны крыху падумаў і сказаў: 800 тысяч рублёў хопіць? Хопіць. Як гаворыцца ў такіх выпадках, абодва бакі ўдарылі па руках. Толькі пасля гэтага ў Міхаіла Васільевіча з'явіліся на іх наручнікі...

А потым быў суд, які разглядзеў каля дзесяці эпізодаў патрабавання генеральным дырэктарам ААТ «Гандлёвы цэнтр» ад падначаленых работнікаў матэрыяльнага ўзнагароджвання за станоўчае рашэнне аб заключэнні ці прадаўжэнні працоўнага кантракта. Сумы вар'іраваліся ў залежнасці ад пасады прэтэндэнта. І як ні стараўся ён выкруціцца (маўляў, такога не было, а намесніку начальніка райаддзела па надзвычайных сітуацыях я наогул... пазычаў грошы), яго «аргументы» рассыпаліся пад пераканаўчымі паказаннямі сведак і іншымі доказамі. Вінаваты быў асуджаны па двух артыкулах Крымінальнага кодэкса рэспублікі: атрыманне хабару і дача яго за загадзя незаконнае дзеянне.

Пакаранне былі дырэктар-дэпутат будзе адбываць на працягу шасці з паловай гадоў у калоніі ўзмоцненага рэжыму. У яго канфіскавана маёмасць, і ён пасля выхаду на волю будзе пазбаўлены права «займаць пасады, звязаныя з выкананнем арганізацыйна-распарадчых і адміністрацыйна-гаспадарчых абавязкаў» тэрмінам на пяць гадоў.

Уладзімір ПЕРНІКАЎ.

У ПОЛАЦКУ ЁСЦЬ УСЁ...

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)

...Музейны

Полацк — горад музеяў. Тут іх ужо 12 толькі ў складзе Полацкага гісторыка-культурнага запаведніка. Краязнаўчы, дарэчы, размешчаны ў будынку былой лютаранскай кірхі па вуліцы Ніжне-Пакроўскай, былой вуліцы Леніна, якой нядаўна вярнулі ранейшую назву. Побач музей беларускага кнігадрукавання, дзе многае прысвечана Францыску Скарыну. У тым жа будынку былой брацкай школы — музей-бібліятэка з мноствам рарытэтаў кнігавыдання, а часам праводзяцца цудоўныя сустрэчы з прадстаўнікамі культурнай эліты.

Аматарам народных рамёстваў — прамая дарога ў музей традыцыйнага ручнога ткацтва Паазер'я, на вуліцу Войкава. Нераўнадушным да прыроды роднага краю — у прыродна-экалагічны. Вежа на вуліцы Скарыны дазваляе палюбавацца відам горада з вышыні птушынага палёту...

...І гістарычны

Тут вам дакладна спатрэбіцца гід, які ведае полацкую гісторыю. І дакладна не адзін дзень, каб паглядзець усё хоць бы самае цікавае.

Самая старая частка горада — вуліца Ніжне-Пакроўская, любімае месца прагулак гараджан, якая пралягае па набярэжнай легендарнай заходняй Дзвіны да Верхняга замка. У канцы вуліцы высока на пагорку — белая Сафія, гордасць горада. Цяпер гэта канцэртная зала з арганам і музей гісторыі архітэктуры сабора. Непадалёк — Барысаў камень, знойдзены ў Заходняй Дзвіне 30 гадоў таму. Камень «аброс» легендамі. Вакол заўсёды людзі: хтосьці стаіць, прыхіліўшыся да яго, хтосьці кідае манетку і загадвае жаданне. Па выхадных перад каменем выстройваецца чарга з маладажонаў. Людзі вераць, што ён лечыць і прыносіць шчасце.

А яшчэ ёсць Ніжні замак. У будынку былой езуіцкай акадэміі, дзе пасля 1820 года адкрылі Кадэцкі корпус, у якім вучыўся генерал Кандраценка, цяпер займаюцца студэнты гісторыка-філалагічнага факультэта Полацкага ўніверсітэта — дух ведаў вярнуўся ў гэтыя сцены ўжо ў XXI стагоддзі.

Побач — так званы вал Івана Грознага, насыпаны як абараняльная мяжа ў XVI стагоддзі. Добры гід раскажа і пра Чырвоны мост, які атрымаў назву па колеры крыві, пралітай салдатамі падчас баёў з напалеонаўскімі войскамі ў 1812 годзе, і пра вынікі археалагічных раскопак, якія штогод вядуцца на берагах Палаты...

Абяцалі — значыць, будзе!

А «Полацк гандлёвы»? Па вуліцы Гогаля каля Дома гандлю ўсіх пакупнікоў сустракае бронзавы Купец. Ён адразу ж спадабаўся гараджанам і турыстам, якія нацёрлі манетку ў яго руцэ — каб грошы вяліся! — да бляску. Можна наведаць Полацкі і Стралецкі рынкі, паласавацца ў «Дзіянісе», купіць сувеніры ў магазіне побач з плошчай Свабоды або ў салоне карціннай галерэі...

Я, напрыклад, вельмі люблю «Полацк фестывальны», калі ў пачатку лета ў горад з'язджаюцца рыцары на фестываль сярэдневяковай культуры «Рубон» (Рубон — даўнейшая назва ракі Заходняя Дзвіна). Турніры на мячах і луках, цудоўныя дамы, сярэдневяковы лагер з шатрамі, горад рамеснікаў і штурм крэпасці... А яшчэ Дзень горада ў маі, экалагічны фестываль і Скарынаўскае свята кнігі.

У планах у Полацка — новыя турыстычныя маршруты. Паўтарэнне воднага шляху «з варагаў у грэкі» па мяжы былога Полацкага княства. Міжнародная экалагічная экспедыцыя. Фестываль уніфармераваных клубаў часоў вайны з Напалеонам...

Палачане ведаюць, што слова сваё гарадскія ўлады стрымаюць: раз паабяцалі — значыць, будзе.

Ганна КАСЦЮЧЭНКА, студэнтка БГУ.

ЗДАРЭННІ

КАЛІ Б У БАБУЛІ БЫЎ ФЛІКЕР...

То, магчыма, не здарылася б трагедыі. Аб гэтым заявіў 24-гадовы хлопец, які ў цемры ехаў на матацыкле па вуліцы вёскі Малышаў Жыткавіцкага раёна, а насустрач ішла 79-гадовая пенсіянерка, у якой не было флікера.

Яна не паспела адысці ўбок, і матацыкл наехаў на яе. Жанчына загінула. А як растлумачыць паводзіны хлопца, які, не маючы вадзіцельскіх правоў, карыстаўся незарэгістраванай тэхнікай?

Уладзімір ПЕРНІКАЎ.

ЗАСНАВАЛЬНІКІ:

САВЕТ РЭСПУБЛІКІ НАЦЫЯНАЛЬНАГА СХОДУ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ,

ПАЛАТА ПРАДСТАЎНІКОЎ НАЦЫЯНАЛЬНАГА СХОДУ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ,

УСТАНОВА «РЭДАКЦЫЯ ГАЗЕТЫ «ЗВЯЗДА»

ГРАМАДСКІ САВЕТ:

МАЛАФЕЕЎ А. А., старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні;

АНІКЕЕВА Л. А., старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па дзяржаўным будаўніцтве, мясцовым самакіраванні і рэгламенце;

САСОНКА М. П., член Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па дзяржаўным будаўніцтве, мясцовым самакіраванні і рэгламенце;

СЯЛІЦКІ В. С., старшыня Гомельскага абласнога Савета дэпутатаў;

СІВАКОЎ В. А., старшыня Аршанскага гарадскога Савета дэпутатаў;

ЯРКОВІЧ В. І., старшыня Круглянскага сельскага Савета Магілёўскай вобласці.

АДКАЗНАЯ ЗА ВЫПУСК: Наталля КАРПЕНКА.

Кантактны тэлефон 292 21 03.

МЯСЦОВЫ ЧАС

УЖО НЕ ВЯСКОЎЦЫ, ЯШЧЭ НЕ ГАРАДЖАНЕ?

Тэрыторыя Радашковіцкага сельсавета Маладзечанскага раёна немаленькая — каля пяці тысяч гектараў. Гэта амаль як сярэдні па плошчы сельгаскааператыў. Тут размешчаны 15 вёсак, дзе паводле інфармацыі на 1 ліпеня, прапісаны 1229 чалавек. У параўнанні з гарадскімі ўмовамі шчыльнасць засялення, здаецца, зусім нязначная, аднак варта ўлічваць і іншае. На землях Радашковіцкага сельсавета 26 садаводчых таварыстваў — трэцяя частка агульнага раённага паказчыка. Дачнікі ў пэўнай меры вызначаюць спецыфіку гэтай тэрыторыі.

Фота А. ДЫБОЎСКАГА.

Са смеццем — «вечная» праблема

26 садаводчых таварыстваў — гэта каля 7 тысяч жыхароў. Такім чынам, насельніцтва Радашковіцкага сельсавета, асабліва ўлетку, павялічваецца практычна ў сем разоў! Прычым і межы сезона зараз значна рассунуліся — нярэдка тыя ж гарадскія пенсіянеры жывуць на сваіх дачах амаль круглы год. У большасці ўчасткі пад адпаведную забудову выдзяляліся ад прамысловых прадпрыемстваў, перш за ўсё сталічных.

— У садаводчых таварыствах пастаянна мяняецца кіраўніцтва (старшыні, бухгалтары), — заўважае старшыня Радашковіцкага сельскага Савета Наталля Шастак. — У выніку чаго часцяком дачнікі застаюцца сам-насам з вырашэннем сваіх надзённых праблем. Таварыствы і органы мясцовага самакіравання адасобленыя — між намі няма амаль ніякай сувязі, мы практычна не сутыкаемся. Бадай што перасякаемся толькі ў тым выпадку, калі паўстаюць нейкія неадкладныя пытанні. Напэўна, гэта няправільна, статус членаў садаводчых таварыстваў павінен быць акрэслены больш дакладна.

Праблемы «сумеснага пражывання» ў першую чаргу датычацца добраўпарадкавання, а калі быць больш дакладнымі — збору смецця. Як адзначае Наталля Шастак, забруджваецца не толькі ўласна тэрыторыя населеных пунктаў, але і лясных масіваў, прыдарожных палос. Месцы дачнай забудовы пакуль яшчэ няпоўнасцю забяспечаны спецыяльнымі кантэйнерамі для смецця. Дагаворы на іх закупку з Маладзечанскім ЖКГ заключылі толькі 12 садаводчых таварыстваў — менш чым палова агульнай колькасці такіх арганізацый. Вось і атрымліваецца, што смецце аказваецца проста на вуліцах, альбо дачнікі выносяць адходы ў кантэйнеры да вяскоўцаў.

Таксама няправільна, паколькі пастаянна прапісаныя жыхары заключаюць дагаворы на аказанне адпаведнай паслугі з камунальнікамі (у Радашковічах арганізаваны ўчастак раённага прадпрыемства ЖКГ) і ўносяць плату. Грошы за вываз смецця няхай і сімвалічныя (12 тысяч рублёў у год з чалавека), аднак многія пенсіянеры з цяжкасцю пагаджаюцца і на такія расходы. Калі быў створаны ўчастак ад Маладзечанскага прадпрыемства жыллёва-камунальнай гаспадаркі і арганізаваны цэнтралізаваны вываз смецця, з заключэннем дагавораў і своечасовымі разлікамі за адпаведны сэрвіс адразу ўзніклі пэўныя цяжкасці.

Як заўважае Наталля Шастак, каб не загубіць патрэбную справу, даводзілася ісці і на такія меры — колькі часу дазвалялі вяскоўцам не ўносіць плацяжы. Аднак гэта часовы «бонус», і для таго, каб людзі плацілі, трэба праводзіць доўгую растлумачальную работу. Тым не менш пры ўсіх аб'ектыўных і суб'ектыўных цяжкасцях цэнтралізаваны вываз смецця наладжаны ва ўсіх вёсках Радашковіцкага сельсавета (за выключэннем хіба толькі двух хутароў). Па спецыяльным маршруце два разы ў месяц машыны аб'язджаюць тэрыторыю.

Відавочны варыянт вырашэння адной з самых балючых праблем дачнікаў — далучыць тэрыторыю садаводчых таварыстваў да схемы цэнтралізаванага збору смецця. Чаго, здавалася б, прасцей? Аднак тут паўстаюць неператадольныя перашкоды. Паводле слоў Наталлі Шастак, для таго, каб павялічыць маршрут, у камунальнікаў няма дадатковага транспарту. Адпаведна, праблема са смецем застаецца нявырашанай...

Хто «разрулюе» сітуацыю?

Інжынерныя камунікацыі ў сучаснай вёсцы — зусім не рэдкасць. Наадварот, жыхары ўсімі шляхамі імкнуцца зрабіць свой быт больш камфартабельным, максімальна набліжаным да гарадскіх умоў. Радашковіцкі сельсавет у гэтым плане не выключэнне. Праўда, газ з 15 населеных пунктаў праведзены толькі да Шэметаўшчыны. Ды і тое ў прыватным парадку, да тэрыторыі дачнай забудовы. Астатнія вёскі пакуль без «блакітнага паліва». Аднак у хуткім часе плануецца працягнуць газаправод з Ушы ў Раманы. Створаны кааператыў у Радашковічах, адкуль газ правядуць у Повязынь. Жыхары Вязынкі таксама чакаюць свайго часу — вяскоўцы падалі заяўку на ўключэнне ў адпаведную дзяржаўную праграму. Калі пытанне будзе вырашана станоўча, то людзям кампенсуюць расходы на будаўніцтва магістральнага газаправода. А да дома кожны будзе цягнуць газ за ўласны кошт.

Пакрысе паляпшаецца і водазабеспячэнне. Цэнтралізаваная падача вады наладжана ў шасці вёсках.

— Усе свідравіны яшчэ ў 2003 годзе ўдалося перадаць на баланс Маладзечанскага прадпрыемства ЖКГ, а яны пасля перадалі сеткі на абслугоўванне раённаму водаканалу, — заўважае Наталля Шастак. — Дагэтуль свідравіны знаходзіліся на балансе сельгаспрадпрыемства. Удалося аператыўна зрабіць усе неабходныя дакументы для перадачы. Цудоўна разумелі, што ўсе інжынерныя камунікацыі павінна абслугоўваць спецыялізаваная арганізацыя. У сельсавета для гэтага няма ні належнага штату, ні неабходнага абсталявання. Зараз сітуацыя палепшылася: калі ўзнікаюць нейкія праблемы, то за справу неадкладна бяруцца спецыялісты.

Пацвярджэннем справядлівасці такой «раскладкі» з'яўляюцца канкрэтныя прыклады. Адна са свідравін усё ж дасюль застаецца за сельгаскааператывам. Адпаведныя камунікацыі знаходзяцца паблізу вёскі Дзякшняны і ў тым ліку абслугоўваюць жывёлагадоўчую ферму. Гаспадарка падлічыла, што калі свідравіну перадаць камунальнікам, то плацяжы за ваду (расход якой лічыцца дакладна — колькі «кубоў» на галаву жывёлы) СВК проста не пацягне. Таму і пакінулі на сваім балансе. Сітуацыя вядомая, аднак у такім разе нярэдка ўзнікаюць перабоі з забеспячэннем вадой вяскоўцаў, дамы якіх падключаны да той жа свідравіны. Няўжо нельга нейкім чынам так «разруляваць» гэтае пытанне, каб і каровы былі напоены, і людзі без вады не пакутавалі?

Уцечка... дзяцей

Для правядзення работ па добраўпарадкаванні ў Радашковіцкага сельсавета апошнім часам з'явіліся новыя магчымасці. Дадатковыя грошы ўдаецца зарабляць ад правядзення аўкцыёнаў па продажы зямельных участкаў. Паколькі шэраг тутэйшых вёсак знаходзяцца ў прамой дасягальнасці ад сталіцы, то такія прапановы заўсёды карыстаюцца вялікім попытам. Да прыкладу, на апошнім аўкцыёне выстаўлялі тры ўчасткі: два прадалі па 14 мільёнаў рублёў, адзін — за 16 млн. А стартавы кошт кожнага лота быў 35 тыс. рублёў. Няцяжка падлічыць, што канчатковая цана ўзрасла амаль у 500 разоў! Расцэнкі на ўчасткі, кажуць сталічныя пакупнікі, зусім не такія ўжо і высокія. Зямля пад Мінскам каштуе дорага і ўвесь час павялічваецца ў цане, таму адпаведныя ўкладанні заўсёды выгадныя. Як заўважае Наталля Шастак, ужо падрыхтаваны новыя прапановы — на чарговы аўкцыён мяркуецца выстаўляць чарговыя шэсць участкаў.

Нерухомасць карыстаецца заўсёдным попытам — пустых дамоў у тутэйшых вёсках не знойдзеш. Калі яшчэ некалькі гадоў таму за самую сціплую сядзібу прасілі 3-4 тыс. долараў, то цяпер сярэдні кошт вагаецца ў межах 20 тыс. На тэрыторыі Радашковіцкага сельсавета зарэгістравана 112 індывідуальных забудоўшчыкаў. Так што задзейнічаны літаральна кожны больш-менш прыдатны кавалак зямлі.

Мясцовых жыхароў, напэўна, ужо ў поўным сэнсе слова вяскоўцамі не назавеш, яны бліжэй да гараджан. Месцічы актыўна згортваюць прысядзібныя гаспадаркі, адмаўляюцца трымаць жывёлу. Цяпер на больш чым паўтысячы падворкаў засталося толькі 68 кароў. Яно і не дзіўна — паводле слоў Наталлі Шастак, ніводны (!) з тутэйшых жыхароў не працуе ў мясцовым сельскагаспадарчым кааператыве. Хоць на працу ў гаспадарку можна ўладкавацца без праблем. Тлумачыцца ўсё проста — побач чыгунка, па якой магчыма патрапіць у Заслаўе, Маладзечна, Мінск. Што, дарэчы, людзі і робяць: у гадзіны пік на тутэйшых чыгуначных прыпынках можна назіраць нежартоўныя натоўпы. Усё больш месцічаў дабіраюцца на працу і на асабістым аўтамабілі — могуць сабе дазволіць.

Разам з сабой штодня жыхары забіраюць і дзяцей. Навошта яны гэта робяць?

— Звычайна дзеці вучацца ў тым населеным пункце, дзе працуюць бацькі, — тлумачыць Наталля Шастак. — Раніцой іх адвозяць, а вечарам забіраюць. Такім чынам, адбываецца своеасаблівы адток дзяцей, таму ў Вязынскай базавай школе (яна цяпер працуе ў адзіным комплексе з дзіцячым садком) займаюцца толькі 36 вучняў. Умовы тут добрыя, аднак жыхары аддаюць перавагу адукацыйным установам у буйных гарадах, многія ўладкоўваюцца ў сталіцы.

З-за такой працоўнай мабільнасці насельніцтва, здавалася б, няма патрэбы трымаць на тэрыторыі сельсавета вялікую сацыяльную сферу. Аднак і на месцы ёсць усё неабходнае — акрамя школы з садком, працуе фельчарска-акушэрскі пункт, сетка крамаў. Гэта без уліку Радашковічаў, дзе вялікая «сацыялка». Як кажа Наталля Шастак, трэба ўлічваць тое, што трэцяя частка тутэйшых жыхароў — пенсіянеры. І дэмаграфічная сітуацыя ў сельсавеце не з лепшых: штогод адбываецца натуральнае змяншэнне насельніцтва. Пэўная колькасць людзей адны пражываюць. Іх даглядаюць сацыяльныя работнікі. Дапамагаюць і старасты. Укараняецца цікавая практыка: некалькі старастаў адначасова з'яўляюцца дэпутатамі сельскага Савета. У прыватнасці, такую грамадскую нагрузку мае загадчыца фельчарска-акушэрскага пункта ў Вязынцы. Людзі заўсёды павінны адчуваць, што без падтрымкі яны не застануцца. Многія пытанні пры жаданні можна аператыўна вырашыць на месцы.

Мікалай ЛІТВІНАЎ.

Маладзечанскі раён.

Намеснік Старшыні Вярхоўнага Суда Валерый КАЛІНКОВІЧ:

«НЕМІНУЧАСЦЬ ПАКАРАННЯ ДЛЯ ВАДЗІЦЕЛЯЎ МОЖА ГАРАНТАВАЦЬ ТОЛЬКІ НЕЦЯРПІМАСЦЬ УСЯГО ГРАМАДСТВА: ВЫПІЎ ЗА РУЛЁМ — ЗРАБІЎ КРОК У БОК ТУРМЫ»

Колькасць асабістага транспарту ў краіне павялічылася больш чым з 1 млн 677 тыс. машын у 2003 годзе да 2 млн 181 тыс. — у 2007-м. Прычым папаўненне аўтапарку ішло найперш за кошт сучасных манеўраных, хуткасных і магутных аўтамабіляў, што ўсё разам, зразумела, не магло не адбіцца на колькасці дарожна-транспартных здарэнняў. Распаўсюджанасць злачынстваў, звязаных з парушэннем правілаў дарожнага руху ці эксплуатацыі транспартных сродкаў, пагроза здароўю і жыццям людзей, іх маёмасным інтарэсам вывелі гэтую праблему ў ранг дзяржаўнай. Для яе вырашэння задзейнічаны ўсе галіны ўлады. Сёння мы гутарым з прадстаўніком адной з іх — судовай. Улічваючы, што крымінальная адказнасць у нас устаноўлена за ўчыненне дарожна-транспартных здарэнняў, якія пацягнулі найбольш сур'ёзныя, часам трагічныя наступствы, вынікі разгляду любой справы павінны ўносіць уклад у папярэджванне аналагічных злачынстваў, забяспечваць немінучасць адказнасці вінаватых і прызначэнне ім адэкватных мераў пакарання. Як гэта адбываецца на справе, нашым чытачам сёння раскажа намеснік Старшыні Вярхоўнага Суда, старшыня калегіі па крымінальных справах Валерый КАЛІНКОВІЧ.

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

— Валерый Леанідавіч, прасочваецца відавочная сувязь: павялічыўся аўтапарк — стала больш здарэнняў на дарогах…

— На жаль, у агульнай паўсядзённай практыцы судоў справы, звязаныя з парушэннем правілаў бяспекі руху і эксплуатацыі транспартных сродкаў, сустракаюцца ўсё часцей. Асаблівую ўвагу звяртаюць на сябе вінаватыя, што кіравалі транспартнымі сродкамі ў стане ап'янення. Толькі за першае паўгоддзе гэтага года адміністрацыйныя спагнанні былі накладзены судамі на 21 873 чалавек. Гэта тыя, хто або сам кіраваў транспартным сродкам у нецвярозым стане, або даверыў яго нецвярозаму вадзіцелю. Гэта вельмі шмат. Напрыклад, за ўвесь мінулы год за кіраванне ў стане ап'янення спагнанні былі накладзены амаль на 39 тысяч чалавек, праўда, з улікам, што да 1 сакавіка 2007 года ў судах разглядаліся толькі выпадкі паўторнага кіравання ў нецвярозым стане. Пра што гэта гаворыць? Трэба прызнаць, што пакуль усведамленне таго, што за руль нельга садзіцца нецвярозым або перадаваць яго такому ж нецвярозаму вадзіцелю, у насельніцтва няма.

— Не дапамаглі, выходзіць, і адносна нядаўна прынятыя меры па ўзмацненні адказнасці вадзіцеляў…

— Што датычыцца крымінальнай адказнасці, дык пэўны інтарэс у нас павінны выклікаць вынікі дзеяння новага артыкула Крымінальнага кодэкса — 317[1], які прадугледжвае крымінальную адказнасць за паўторнае на працягу года накладанне спагнання за кіраванне транспартным сродкам у нецвярозым стане. За першае паўгоддзе гэтага года па ім асуджаны крыху больш за 1300 чалавек. Лічба ўнушальная. Аднак калі звярнуцца да нашай нядаўняй гісторыі, калі ў судах вадзіцелі прыцягваліся да адміністрацыйнай адказнасці за паўторнае кіраванне ў нецвярозым стане, дык такіх асобаў за год набіралася прыблізна 10 тысяч чалавек! Адчуйце, як кажуць, розніцу.

Увядзенне, а насамрэч вяртанне да крымінальнай адказнасці за паўторнае кіраванне ў нецвярозым стане (такая норма ў недалёкім мінулым існавала на працягу шэрагу гадоў), у пэўнай ступені садзейнічала «выцверазенню» хоць бы тых вадзіцеляў, хто быў злоўлены за рулём п'яным упершыню. Але цалкам праблема, на жаль, не вырашана, нягледзячы ў тым ліку і на ўзмацненне адказнасці, і на меры прафілактыкі.

— У чым тут галоўная прычына? Якімі шляхамі яе можна вырашыць, што трэба рабіць?

— Гэта праблема шматгранная. Па-першае, датычыцца ўвогуле культуры. На жаль, значную колькасць правапарушэнняў можна спыніць толькі з выкарыстаннем адпаведных мераў уздзеяння. У некаторых вадзіцеляў адсутнічае нават фактар самазахавання, не гаворачы ўжо пра чалавечае стаўленне да здароўя і жыцця іншых удзельнікаў дарожнага руху — вадзіцеляў, пасажыраў, пешаходаў. Па-другое, у гэтым жа кантэксце можна прыгадаць не толькі ролю кіроўцаў, але і ўсіх навакольных, усёй грамадскасці ў больш шырокім сэнсе слоў. Мы, напрыклад, у судах часта сутыкаемся з наступнай сітуацыяй: адбылося ДТЗ з сур'ёзнымі наступствамі, вінаваты знаходзіўся ў нецвярозым стане, усё — сярод белага дня, у цэнтры горада. А відавочцаў няма! Ці, наадварот, той жа вадзіцель прадстаўляе сведак, што даюць паказанні на яго карысць. Так быць не павінна. У грамадстве хацелася б бачыць крайне нецярпімае стаўленне да хуліганства на дарогах, і ў гэтым павінен быць задзейнічаны кожны з нас, а не толькі людзі ў пагонах. Другі бок медаля: і мы не павінны чалавека, які пайшоў на супрацоўніцтва са следствам, «заганяць» бясконцымі выклікамі на допыты, гадзінамі трымаць у чаканні ў калідорах дзяржорганаў.

У гэтым кантэксце хачу дадаць і наступнае. Мы пастаянна адсочваем, што адбываецца ў судах па дадзеным катэгорыі спраў. На жаль, адзначаюцца выпадкі, калі ДТЗ мела сур'ёзныя наступствы, вінаваты быў за рулём у нецвярозым стане, а суд часам падыходзіць да гэтага неапраўдана мякка. Тут я магу сказаць аб прынцыповай пазіцыі Вярхоўнага Суда: ніякіх паслабленняў да тых, хто дапусціў грубыя, відавочныя, наўмысныя парушэнні элементарных правілаў бяспечных паводзінаў на дарогах, хто стаў прычынай болю і гора іншых людзей. І Вярхоўны Суд, і абласныя суды апошнім часам адмаўляюць неапраўдана мяккія прыгаворы з-за неадпаведнасці прызначанага пакарання цяжкасці і характару ўчыненых злачынстваў. Такая пазіцыя будзе захоўвацца і надалей, каб чалавек, які сеў за руль нецвярозым, даклаў на ўсвядоміў, што для яго гэта — прамы шлях у турму.

— Нават улічваючы ўсю складанасць сітуацыі, нехта можа сказаць: а ці не занадта жорстка? Як асабіста вы, Валерый Леанідавіч, ставіцеся да ўзмацнення адказнасці вадзіцеляў за «п'яныя» парушэнні?

— Так, існуюць розныя меркаванні, выказванні адносна дадзенай нормы: як выключыць яе і ўзмацняць далей адміністрацыйную адказнасць, так і ўдасканальваць далей крымінальную адказнасць для людзей, якія, нягледзячы на судзімасць, што ўжо маецца, працягваюць у тым жа духу, не спыняюцца…

Ведаеце, у выніку злачынных дзеянняў вадзіцеляў сёлета за першае паўгоддзе загінула альбо атрымала цяжкія цялесныя пашкоджанні больш за 800 чалавек. Пры гэтым амаль палова вадзіцеляў (305 вінаватых) кіравалі аўтамашынамі ў нецвярозым стане. Выклікае апасенне і той факт, што летась, напрыклад, у параўнанні з пазалеташнім годам, удвая павялічылася колькасць асуджаных за ДТЗ, якія пацягнулі гібель двух і больш чалавек.

Таму, адказваючы на ваша пытанне, скажу, што, на наш погляд, вяртанне назад толькі да адміністрацыйнай адказнасці — гэта аб'ектыўны крок назад. Бо нават самая строгая адміністрацыйная адказнасць — больш мяккі від пакарання, не звязаны з крымінальным пакараннем і судзімасцю. Апошняе ж па сваіх наступствах можа быць проста катастрафічнай для пэўнай катэгорыі грамадзян. Да прыкладу, судзімы чалавек не можа знаходзіцца на дзяржаўнай службе, для яго існуюць пэўныя абмежаванні па свабодзе перамяшчэння ў перыяд адбыцця пакарання. І, паколькі заканадаўца ўсяго толькі паўтара года таму пайшоў на ўвядзенне крымінальнай адказнасці, было б крайне паспешлівым і непаслядоўным адмаўляцца — практычна тут жа — ад гэтай справы і фактычна рабіць, як я ўжо сказаў, крок назад.

Калі мы пойдзем так, гэта пацягне і перагляд прыгавораў, якія на сёння ўжо вынесены. Атрымаецца, што гэтыя людзі ўвогуле ніякага пакарання не панясуць і будуць, умоўна кажучы, рэабілітаваны. Таму, маё меркаванне як старшыні судовай калегіі па крымінальных справах, трэба ўдасканальваць той дзеюч парадак, які прывёў бы нас да яшчэ большай адказнасці перад законам і грамадскасцю людзей, што, сеўшы аднойчы за руль «пад мухай», не зрабілі ніякіх высноў і працягваюць ездзіць у непадабаючым выглядзе.

З іншага боку, паўтару яшчэ раз, крымінальныя справы аб парушэннях правілаў дарожнага руху і эксплуатацыі транспартных сродкаў з'яўляюцца аднымі з самых складаных. У кожнага ўдзельніка ДТЗ маецца свая версія таго, што адбылося. Разабрацца ў іх, знайсці тую адзіную прычыну, што прывяла да трагедыі, часам бывае вельмі няпроста. Вярхоўны Суд патрабуе ад ніжэйстаячых судоў уважлівага і ўдумлівага вывучэння абставінаў кожнай канкрэтнай справы.

— Падчас гаворкі вы ўжо згадвалі пра катэгорыю асуджаных за перадачу руля нецвярозаму вадзіцелю, або чалавеку, які не мае права на кіраванне аўтамабілем. Некалькі слоў яшчэ па гэтай праблеме.

— Сёння часам з боку ўладальнікаў транспартных сродкаў назіраецца вельмі павярхоўнае стаўленне да лёсу ўласнага «жалезнага каня». Даверыць руль нецвярозаму свааку, суседу, каб той «з'ездзіў на суседнюю вуліцу ў магазін» — на гэта многія ідуць вельмі лёгка. І, не задумваючыся над наступствамі, становяцца саўдзельнікамі злачынства, рызыкуючы раздзяліць віну з п'яным кіроўцам у выпадку ДТЗ. У адпаведнасці з артыкулам 318 Крымінальнага кодэкса толькі за першае паўгоддзе гэтага года было асуджана 22 чалавекі, што не так ужо і мала. А пакаранне, калі ў выніку загінуў чалавек або атрымаў цяжкія цялесныя пашкоджанні, можа скласці да 5 гадоў пазбаўлення волі.

— Удзельнікамі дарожнага руху з'яўляюцца і пешаходы. Яны таксама могуць справакаваць ДТЗ. Што гаворыць статыстыка?

— З аднаго боку, пешаход — найменш абаронены ўдзельнік дарожнага руху ў фізічным сэнсе. З другога, многія злоўжываюць гэтым, напрыклад, пераходзяць дарогу перад колямі машыны па прынцыпе: або аб'едзеш, або спынішся, нікуды не падзенешся. І правакуюць аварыйную сітуацыю. Згодна з артыкулам 321 Крымінальнага кодэкса — за парушэнне правілаў забеспячэння бяспечнай працы транспарту, калі яно пацягнула цяжкае, менш цяжкае траўмаванне чалавека або яго смерць — у 2006 годзе было асуджана 37 чалавек (у гэты лік уваходзяць і кіроўцы гужавым транспартам), летась — 22, за першае паўгоддзе гэтага года — 3 чалавекі.

— Дзякуй за гутарку!

Сяргей РАСОЛЬКА.

ДАВЕДКА

За апошнія пяць гадоў — з 2003 па 2007 год — у выніку дарожна-транспартных здарэнняў загінула 8368 чалавек, траўмы атрымалі 39753 чалавекі. За ўказаны перыяд на дарогах загінула 328 дзяцей, было паранена 3829.

Па даных судовай статыстыкі, колькасць асуджаных за парушэнне правілаў дарожнага руху ці эксплуатацыі транспартных сродкаў склала 7380 чалавек. Пры гэтым за ДТЗ, што пацягнулі прычыненне цяжкага цялеснага пашкоджання або смерць, былі асуджаны 6593 чалавекі.

Выбары - 2008: меркаванне эксперта

ПРАГРАМЫ — «АБЯЦАЛАЎКІ»

Сваімі ўражаннямі ад электаральных працэсаў у Беларусі дзеліцца акадэмік Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, доктар філасофскіх навук, прафесар, загадчык Сектара сацыялогіі палітыкі і дзяржаўнага ўпраўлення Інстытута сацыялогіі НАН Яўген Бабосаў.

— На тым сталічным выбарчым участку, дзе я галасаваў, усё было вельмі добра арганізавана. Настрой такі дабратворны. Адзін чалавек у буфеце, колькі галасуе, 15 чалавек выдаюць дакументы, двое іграюць на скрыпцы класічную музыку — у нашым доме жывуць акадэмікі, лічыцца, што яны ў гэтым нешта разумеюць (смяецца). Добрая такая абстаноўка, спакойная. Гэта якраз такі звязана з беспрэцэдэнтнасцю і прэцэдэнтнасцю сёлетніх выбараў. Што беспрэцэдэнтнага? Па-першае, назіральнікі АБСЕ адзначалі пэўныя пазітыўныя моманты ў выбарчым працэсе Беларусі, у адрозненне ад таго, што ў мінулы раз лаялі. Па-другое, па Еўраньюс некалькі дзён запар транслявалі сюжэт аб выбарах у Беларусі, зроблены ў абсалютна пазітыўным тоне. Гэта вельмі важна, бо меркаванне, якое гэты канал фарміруе ў людзей, уплывае на пазіцыю Еўрасаюза ў дачыненні да Беларусі. Раней такога пазітыву таксама не было. Прэцэдэнтны пры гэтым звычайны спакой. Паводле даследаванняў Інстытута сацыялогіі, прыкладна 63 працэнты апытаных людзей падкрэсліваюць стабільнасць эканамічнай сітуацыі ў Беларусі. Гэта значыць, дзве трэці патэнцыйных выбаршчыкаў упэўненыя, што ў краіне ёсць стабільнасць эканамічная, якая вядзе да стабільнасці палітычнай. Пры гэтым колькасць людзей, якія ацэньваюць сітуацыю ў краіне як напружаную, нестабільную, за апошнія гадоў пяць зменшылася прыблізна ў 2,5 раза. І сёння доля людзей, якія тэарэтычна могуць быць апорай апазіцыйна настроеных палітычных сілаў, знаходзіцца ў межах 10 працэнтаў.

Ёсць і іншыя даследаванні — напрыклад, Еўрабарометр. Сацыялагічныя вымярэнні праводзяцца паралельна ў Беларусі, Расіі, ва Украіне і ў Казахстане. Там ёсць такі комплексны паказчык, які складваецца з ацэнкі матэрыяльнага становішча, працы, сям'і, жылля і гэтак далей — з усяго гэтага выводзіцца паказчык задаволенасці рэспандэнта сваім жыццём. У Беларусі ён аказаўся самым высокім — 66 працэнтаў рэспандэнтаў задаволеныя сваім жыццём у цэлым, рознымі яго аспектамі. Гэта звесткі 2007 года, апытаныя дзве з лішкам тысячы чалавек — нацыянальная рэпрэзентатыўная выбарка. Для параўнання: у Расіі гэты паказчык — 57 працэнтаў, ва Украіне — 37 працэнтаў. Тры чвэрці беларускага насельніцтва задаволеныя ў цэлым сваім жыццём. Стабільнасць палітычная і эканамічная, а таксама задаволенасць сваім жыццём — гэта самы важны паказчык таго, што людзі ідуць на выбары ўсвядомлена, спакойна, без скандалаў, без боек, без мітусні. І галасуюць абсалютна спакойна. Чаму гэта важна? Таму што людзі прыходзяць на выбары ў нас, у адрозненне ад, скажам, Украіны, не як у цырк Шапіто, а як у тое месца і тую сацыяльную прастору, дзе чалавек павінен выказаць сваё волевыяўленне, і каб ніхто яму пры гэтым не перашкаджаў.

Навукоўца прызнаўся, што ўважліва сачыў за ходам перадвыбарнай кампаніі. І ад яго ўчэпістага погляду не схавалася слабасць выступленняў многіх кандыдатаў. «Вельмі шмат шэрага, некаторыя чытаюць нешта настолькі невыразнае, што ў мяне адчуванне такое, што калі б яны не выступалі, было б лепш». Звярнуў ён увагу і на тое, што з кандыдатамі не працавалі сацыёлагі, якія б дапамаглі скласці праграму. «У кожнай праграме важны асобасны момант. Вось якраз такога ярка выражанага асобаснага характару ў праграмах многіх сённяшніх кандыдатаў няма». Адзначыў навукоўца і яшчэ адну ўласцівасць перадвыбарнай агітацыі:

— У некаторых выступленнях вельмі шмат абяцанняў, абяцаюць павысіць стыпендыі студэнтам у два разы — добра, за кошт чаго? І наогул кажуць такія рэчы, якія відавочна ні заўтра, ні паслязаўтра, ні нават на працягу іх дэпутацтва вырашаныя быць не могуць. Проста не сувымяраюць, бо дрэнна ведаюць эканамічную сітуацыю, і кажуць тое, што хацелася б мець. Таму такія абяцанні ў праграмах кандыдатаў адпуджваюць людзей думаючых. І ці можна ўвогуле назваць гэта праграмай, калі кандыдат клянецца, клянецца і клянецца, — гэта ж «абяцалаўка».

Выбаршчыкі ж у сваю чаргу, паводле меркавання суразмоўцы, не надта цікавяцца праграмай кандыдата ў дэпутаты. Сярод негатыўных тэндэнцый суразмоўца адзначыў і тое, што ў шэрагу прэтэндэнтаў на дэпутацкае крэсла сёння мала навукоўцаў — гэта недахоп, што яны ўстараніліся ад палітыкі. Тым не менш, рэзюмуючы згаданыя ім пазітыўныя і негатыўныя моманты, Яўген Бабосаў адзначыў, што пазітыву атрымліваецца больш. Мабыць таму выбары і адбыліся ў першым жа туры.

У якіх рашэннях новага парламента краіна мае сёння асаблівую патрэбу? На думку эксперта, увагі патрабуе заканадаўства ў сферы адносінаў прадпрымальніцтва і мясцовых органаў улады, а таксама барацьбы з карупцыяй. «Як шлейф аварыі на ЧАЭС, патрэбныя заканадаўчыя рашэнні ў ліквідацыі і папярэджанні надзвычайных сітуацый, забеспячэнні радыяцыйнай бяспекі насельніцтва. Асабліва ўлічваючы, што ў краіне збіраюцца будаваць новую атамную станцыю».

Ала МАЧАЛАВА.

МУЗЕЮ ГІСТОРЫІ ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ — 65

30 верасня 1943 года выйшла пастанова ЦК КП(б)Б «Аб стварэнні музея гісторыі барацьбы беларускага народа з нямецка-фашысцкімі акупантамі ў Вялікую Айчынную вайну».

Вайна яшчэ не скончылася, а людзі ўжо думалі аб міры і ўвекавечванні подзвігу народа… Адкрыццё музея адбылося 22 кастрычніка 1944 года, калі вызвалены Мінск яшчэ быў у руінах. Дарэчы, газета «Звязда» першай паведаміла аб гэтай падзеі.

«Беларускі народ першым усвядоміў значэнне памяці аб той страшнай вайне, таму і музей быў першым у свеце музеем гісторыі яшчэ не скончанай вайны», — адзначае дырэктар музея Сяргей Азаронак.

Адметна, што дата заснавання музея храналагічна супадае з пачаткам вызвалення Беларусі. У фае музея працуе інфармацыйная карта «Вызваленне Беларусі 23 верасня 1943 г. — 29 ліпеня 1944 г.», асновай якой паслужыла тапаграфічная карта 1940 года. На ёй штодзённа адзначаецца вызваленне гарадоў і райцэнтраў і перамяшчэнне лініі фронту. Карта дапаўняецца паведамленнямі Саюзінфармбюро. А на экране дэманструецца хроніка вызвалення Беларусі і мультымедыйная праграма, створаная паводле фотадакументальных матэрыялаў з фондаў музея.

Учора была адкрыта выстаўка «Іду скрозь залы, як скрозь гады...», дзе побач з фотадакументальнай хронікай прадстаўлены матэрыялы з першых паступленняў музея, першыя кнігі водгукаў, інфармацыя аб стваральніках і першых супрацоўніках музея.

— З вялікай цікавасцю наведвальнікі аглядаюць партызанскую зброю, лістоўкі і газеты, асабістыя рэчы Героя Савецкага Саюза Даватара, Заслонава і Ветрава, — адзначае вучоны сакратар музея Галіна Бабусенка. — Экспануецца і нумар «Звязды» за 5 жніўня 1944 года, дзе паведамляецца аб адкрыцці музея.

Адбылася і прэзентацыя электроннай гульні «Аперацыя Багратыён» . На думку Сяргея Азаронка, гульня будзе садзейнічаць развіццю цікавасці да аперацыі «Багратыён», стане стымулам для развіцця ваеннага інтэлекту: цяпер, калі нярэдка ідзе недакладная інфармацыя, а часам і адкрытая фальсіфікацыя ходу і вынікаў Другой сусветнай вайны, надзвычай важна, каб моладзь аб'ектыўна ацэньвала ваенныя падзеі і не дапусціла спробаў перагледзець вынік вайны.

Таццяна ПАДАЛЯК.

ДЗЕНЬ РАДАСЦІ

Учора мусульмане Беларусі разам з усім мусульманскім светам адзначылі адзін з двух галоўных у Ісламе святаў — Рамадан-Байрам (Ураза-Байрам, Рамазан-Байрам), альбо Свята Разгавення. Свята наступае пасля заканчэння Рамадану — месяца посту, у які мусульманам было прызначана пасціцца і прасіць Усявышняга аб дараванні грахоў. У месяцы Рамадане ёсць адна ноч, якая так і называецца — Ноч Усёдаравання — Кадыр-ноч. Лічыцца, што ў гэту ноч Алаг пачаў перадаваць Свяшчэнны Каран, з яе пачаліся зямное жыццё Карана і прарочая дзейнасць Прарока Мухамеда.

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

Студэнт БДУІР Нуры выконвае турэцкія народныя песні на нацыянальным інструменце саз.

— Гэта быў вельмі важны для нас месяц, — сказаў на святочнай пропаведзі муфцій Мусульманскага аб'яднання ў Рэспубліцы Беларусь Абу-Бекір Шабановіч. — Маліцца і пасціцца — гэта вялікае фізічнае і духоўнае выпрабаванне. Самае галоўнае, трэба асэнсаваць свой лад жыцця, выправіць яго і атрымаць мадэль на наступныя 11 месяцаў года. Для гэтага трэба было пазбягаць непажаданых учынкаў і здзяйсняць добрыя справы: дапамагаць блізкім, старым, удзяляць увагу дзецям, бацькам, вялікую ўвагу — суседзям, паважаць іншыя рэлігіі, па-брацку ставіцца да ўсіх людзей. Гэта з'яўляецца фундаментам для адносінаў паміж людзьмі ў сучасным свеце.

Муфцій нагадаў, што сёння адна з самых важных спраў для мусульман Беларусі і для ўсіх, хто ім спачувае, — будаўніцтва ў Мінску адзінай Саборнай мячэці. «Мы прынялі рашэнне будаваць мячэць за кошт ахвяраў кожнага, хто разумее важнасць гэтай справы, каб кожны вернік мог хоць цаглінку ўкласці ў стварэнне Дома Алага, для агульнага духоўнага дабра людзей,— сказаў Абу Бекір. — Храм — гэта крыніца садружнасці, узаемаразумення, міру і спакою. Кіраўніцтва нашай дзяржавы гэта добра разумее і садзейнічае нам у гэтай справе».

Рамадан завяршаецца святочнымі малітвамі і сустрэчамі, падчас якіх вернікі віншуюць адзін аднаго, аналізуюць зробленае, радуюцца дасягнутаму.

Адна з такіх сустрэч адбылася ўчора ў сталічнай кавярні «Маяк», куды з нагоды свята сваіх сяброў і суграмадзян запрасіла на сняданак Адукацыйна-культурная ўстанова «Турэцкі культурны цэнтр «Дастлук» («Дружба»).

— Наша ўстанова існуе ўжо 10 гадоў, яна створана, каб садзейнічаць развіццю сяброўскіх, культурных і інтэлектуальных сувязяў паміж беларускім і турэцкім народамі, — расказаў генеральны дырэктар АКУ «Дастлук» Іхсан ДЗІЛЕКЧЫ. — Мы арганізоўваем курсы, семінары, канферэнцыі, урачыстасці, дабрачынныя акцыі і культурна-адукацыйныя мерапрыемствы. А сёння запрасілі сваіх дзяцей, жонак, сяброў і партнёраў на святочны сняданак, каб павіншаваць адзін аднаго і разам перажыць святочную атмасферу.

У кавярні гучала турэцкая народная музыка і песні, гасцям былі прапанаваны нацыянальныя стравы: бахлава, бёрэк і кадаіф. А яшчэ чай — у маленькіх шкляных чарачках. У фае дзеці пералічвалі грошы, якімі, па традыцыі, былі адораны ў гэты дзень.

Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

Рамадан-Байрам пачынаецца ўзаемным віншаваннем сваякоў і выказваннем дзецьмі пашаны да бацькоў. Якраз гэта і робіць маленькі Камільчык Санд, малодшы сын генеральнага дырэктара «Дастлука» Іхсана Дзілекчы і яго жонкі Румейкі.

Жыллё для шматдзетных сем'яў

Трыццацікватэрны дом быў здадзены нядаўна ў эксплуатацыю ў горадзе Беразіно Мінскай вобласці.

Дом быў узведзены мясцовай будаўнічай арганізацыяй амаль за год у межах рэалізацыі дзяржаўнай праграмы па падтрымцы шматдзетных сем'яў. Сёння ўжо завершана работа па добраўпарадкаванні тэрыторыі. Дваццаць чатыры сям'і з жыллёва-будаўнічага кааператыва «Кветачка» збіраюць рэчы для засялення ў новыя кватэры.

Зручны падарунак зрабіла навасёлам і мясцовае райспажыўтаварыства: на мінулым тыдні пад вокнамі шматпавярховіка пачаў працаваць новы міні-магазін.

Таццяна ДАНІЛУШКІНА.
Фота аўтара.

АСНОЎНЫЯ ПЫТАННІ ДА АСНОЎНАГА ДАКЛАДЧЫКА

Мы і Еўрапейскі саюз

Днямі ў Мінскім адукацыйным цэнтры (МАЦ) імя Іаганеса Рау адбыўся трэці дыспут памяці гэтага знакамітага і адметнага нямецкага палітыка і сябра Беларусі. Сімвалічна, што дыспут прайшоў за некалькі дзён да самага галоўнага дзяржаўнага свята Германіі — Дня нацыянальнага адзінства, які адзначаецца 3 кастрычніка.

Яшчэ адна характэрная рыса гэтай сёлетняй сустрэчы — даволі шырокі ўдзел у ёй студэнцкай моладзі сталіцы. У трох рабочых групах актыўна працавалі і часам горача спрачаліся (на тое ён і дыспут) прадстаўнікі факультэта міжнародных адносінаў і гістарычнага факультэта Белдзяржуніверсітэта, лінгвістычнага і педагагічнага ўніверсітэтаў, інстытута імя Сахарава і ўніверсітэта культуры.

Як адзначыў у прывітальным слове да ўдзельнікаў намеснік міністра замежных спраў Валерый Варанецкі, жыццё пацвердзіла правільнасць і актуальнасць праяўленай два гады таму ініцыятывы МЗС Беларусі аб прысваенні імя Іаганеса Рау пасля яго заўчаснай смерці. У пэўным сэнсе ажыццявілася мара Рау аб стварэнні на беларускай зямлі месца для дыялогу і ўзаемаразумення паміж народамі дзвюх краін.

В. Варанецкі таксама падкрэсліў важную ролю Мінскага адукацыйнага цэнтра ў нармалізацыі і інтэнсіфікацыі адносінаў і сувязяў нашай краіны з Еўрасаюзам. Цэнтр, на яго думку, працуе ў рэчышчы запаветаў Рау. Напрыклад, што прымірэнне лепш за размежаванне, канфрантацыю, узнікненне ў Еўропе новых раздзяляльных палітычных і эканамічных ліній. Па словах Валерыя Варанецкага, гэты запавет вельмі актуальны сёння, калі ў свеце ўзнікла напружанне ў міжнароднай абстаноўцы.

Важная асаблівасць дыспутаў — удзел у іх нямецкіх палітыкаў, аналітыкаў, палітолагаў і кіраўнікоў грамадскіх арганізацый, якія добра ведалі Іаганеса Рау як дзяржаўнага дзеяча і як чалавека. Сёлета ў дыспуце з асноўным дакладам «Іаганес Рау — рэальны палітык і прадказальнік» выступіў былы кіраўнік ведамства Федэральнага прэзідэнта ФРГ у 1999—2004 гадах Рудыгер Фрон. Хоць яго шчырае і нават у нечым асабістае выступленне можна толькі фармальна назваць дакладам. Гэта, хутчэй, быў роздум аб нядаўнім цяжкім мінулым у гісторыі беларускага і нямецкага народаў, сённяшнім часе і перспектывах на будучыню.

Некалькі слоў пра 58-гадовага Рудыгера Фрона. Па адукацыі юрыст, пэўны час працаваў суддзёй. У 1985 годзе з Міністэрства юстыцыі перайшоў працаваць у дзяржаўную канцылярыю (па нашаму адміністрацыю) Іаганеса Рау — тагачаснага прэм'ер-міністра самай вялікай па колькасці насельніцтва і самай эканамічна развітай зямлі ФРГ Паўночны Рэйн-Вестфалія і аднаго з самых уплывовых палітыкаў краіны. Неўзабаве ён вылучыў здольнага маладога чыноўніка на пасаду кіраўніка канцылярыі зямлі. І з таго часу Р. Фрон быў заўсёды побач з І. Рау. Калі апошні становіцца федэральным прэзідэнтам Германіі, ён запрашае Р. Фрона ўзначаліць сваю канцылярыю. З таго часу і да смерці І. Рау яны не разлучаліся.

Сумесная работа з І. Рау стала выдатнай школай для Р. Фрона. Усяго адзін прыклад з яго даклада. І. Рау вельмі ўважліва ставіўся да пошты грамадзян. Яна была вялікай, але І. Рау заўсёды знаходзіў час, каб прачытаць усе звароты простых немцаў. Узнятыя імі праблемы і пытанні нярэдка станавіліся тэмай сур'ёзных размоў з бургамістрамі гарадоў і нагодай даручэнняў міністрам, кіраўнікам ведамстваў. Калі была магчымасць, І. Рау абавязкова стараўся дапамагчы звычайнаму чалавеку ў яго просьбе. За гэта яго паважалі і любілі ў народзе.

Прамоўцу закідалі пытаннямі. Яны датычыліся будучага аб'яднанай Еўропы, месца ў ёй Беларусі, высокіх цэнаў на візы ў краіны Еўрасаюза і г. д. Юнакі і дзяўчаты, дарэчы, паказалі добрае веданне прадмета абмеркавання. Яны, напрыклад, былі перакананыя ў тым, што Еўрапейскі саюз, які даўно і трывала ўваходзіць у кола прыярытэтных партнёраў нашай краіны, павінен нарэшце павярнуцца тварам да Беларусі. Да гэтага падштурхоўвае і дынаміка эканамічных стасункаў. Вынікі ўзаемнага гандлю ўражваюць. Так, за мінулыя восем гадоў аб'ёмы гандлёвага абароту Беларусі і Еўрасаюза выраслі ў 15 разоў! Сёння, на погляд студэнтаў, трэба выкарыстоўваць усе магчымасці для вырашэння існуючых праблем і паглыблення адносінаў у розных сферах, у тым ліку і ў развіцці кантактаў беларускай моладзі са сваімі аднагодкамі з краін Еўрасаюза. Для гэтага трэба з абодвух бакоў зрабіць канкрэтныя крокі насустрач адзін аднаму. І тым самым дасягнуць істотных зрухаў ва ўзаемаадносінах.

Такім чынам, Мінск на адзін дзень стаў месцам сустрэч і дыялогу з прадстаўнікамі Еўрасаюза.

Леанід ЛАХМАНЕНКА.

Хандра — шлях на бальнічны ложак

36,6°

Запушчаная хандра можа скончыцца прамым пападаннем на бальнічны ложак, расказала дацэнт кафедры псіхатэрапіі і медыцынскай псіхалогіі БелМАПА, кандыдат медыцынскіх навук, урач вышэйшай кваліфікацыйнай катэгорыі Алена Тарасевіч.

Паводле яе слоў, хандра з'яўляецца ў чалавека восенню і вясной. Восенню выяўляецца адсутнасць змены абставінаў — летні адпачынак застаецца за спінай, а наперадзе — праца, якая не заўсёды прыносіць радасць. Акрамя таго, восенню псуецца надвор'е, а разам з ім і настрой. Вясной арганізму не хапае вітамінаў, яму мала цяпла і святла.

Як адзначыла суразмоўца, хандру Пушкін параўнаў з англійскім сплінам, а вось медыкі так і не змаглі даць гэтай немачы медыцынскага вызначэння, умоўна называючы душэўны сум зніжаным фонам настрою. І тым не менш урачы маюць да ўсяленскага стану маркоты самыя непасрэдныя адносіны: у аддзяленнях неўрозаў і псіхіятрычных клініках яны лечаць страшныя яе наступствы і «выбіваюць» з галавы пацыентаў суіцыдальныя думкі.

«Хандрыць могуць многія, трапіць жа ў бальніцу можа не кожны — гаворка ідзе пра прыватныя цяжкія выпадкі, калі хандра перарастае ў працяглую дэпрэсію. Рашэнне аб шпіталізацыі прымаюць урач і пацыент, і, як правіла, хворыя даюць згоду на лячэнне ў клініцы», — адзначыла Алена Тарасевіч. У мінскіх бальніцах ёсць некалькі аддзяленняў неўрозаў, дзе праводзіцца комплекснае псіхатэрапеўтычнае, фармакалагічнае, фізіятэрапеўтычнае лячэнне, і на працягу 21 дня стан пацыентаў прыходзіць у норму.

Прыметамі таго, што хандра не хвілінная слабасць арганізма, з'яўляюцца пастаянны дрэнны настрой — на працягу двух і больш тыдняў, пагаршэнне апетыту, псіхасаматычныя праблемы, якія з'явіліся раптоўна, — боль у вобласці страўніка, сэрца, ваганні артэрыяльнага ціску. Урач, напэўна, паставіць дыягназ — дэпрэсіўны эпізод.

Спецыяліст адзначыла, што калі ў чалавека з'явіліся падобныя сімптомы, трэба звярнуцца да ўрача і лепш адразу ісці да псіхатэрапеўта. «Так атрымалася, што людзі як агню баяцца псіхіятраў і псіхатэрапеўтаў. Хоць у дапамозе гэтых лекараў няма нічога ганебнага — яны лечаць душу. За мяжой наведванне такіх спецыялістаў фінансава забяспечанымі людзьмі лічыцца нормай», — падкрэсліла суразмоўца. Псіхатэрапеўт у выпадку асенне-вясенняй хандры падыдзе да пытання комплексна, ён прызначыць і медыкаментознае лячэнне, і дапамогу ў выглядзе псіхатэрапеўтычных тэхнік, якія падбіраюцца індывідуальна. Калі псіхатэрапеўт не знойдзе паталогіі, будуць прызначаны вітамінныя прэпараты, якія нармалізуюць настрой. Але не варта разлічваць на бальнічны ліст, таму што псіхатэрапеўты не выдаюць папер аб непрацаздольнасці.

Непакоіцца з-за сваёй хандры ў некаторых выпадках і зусім не варта — магчыма, вы іпахондрык — чалавек з пэўнымі асаблівасцямі, які пастаянна шукае ў сабе праблему, часцей за ўсё праблему са здароўем, патлумачыла спецыяліст. «У такім выпадку, па прыкладзе гераіні вядомага рамана, пастарайцеся навучыцца думаць аб непрыемнасцях заўтра», — рэзюмавала Алена Тарасевіч.

Вольга ШАЛЯГОВІЧ, БЕЛТА.

Тэлесеткі

«КАЛЫХАНКА» Ў НОВЫМ ГУЧАННІ

**Папулярная дзіцячая праграма «Калыханка» выходзіць у эфір ужо больш як чвэрць стагоддзя. За гэты час неаднаразова мяняліся герої і афармленне праграмы. І в

«САКРЭЦІКІ» І САКРЭТЫ ТАЦЦЯНЫ ГАЙЧУК,

або Як пахудзець на 40 кілаграмаў і стаць урачом для хворага сына

З сынам Андрэем.

Маленькая Таня вельмі любіла гуляць у «сакрэцікі». Аднойчы яна выцягнула ў матулі дэфіцытныя чэшскія брошкі, выкалупала з іх усе каменьчыкі і закапала ў дварэ, за што неадкладна была пакараная.

Свае сакрэты ёсць у маладзенчанкі Таццяны Гайчук і цяпер. Яна ведае, як скінуць 40 кг лішняй вагі і, будучы карэннай гараджанкай, выжыць у вёсцы, як перажыць здраду мужа і паставіць на ногі сына, хворага на дзіцячы цэрэбральны параліч. Але ў адрозненне ад дзяцінства, калі месцазнаходжанне «сакрэціка» трэба было трымаць за зубамі, цяпер Таццяна ахвотна дзеліцца сваімі таямніцамі.

У школьныя гады яна не адрознівалася моцным характарам і сілай волі, хіба толькі зайздросным апетытам. «Іначка, з'еш катлетку», — стоячы тварам да пліты, угаворвала матуля старэйшую дачку, стройную, быццам артыстка балета. «А я яе ўжо з'ела», — прызнавалася малодшая, Таццяна. Нядзіўна, што з такой любоўю смачна, а галоўнае — многа паесці, Таня ва ўсе часы лічылася самай прыкметнай у класе.

Крыўдных мянушак у яе было — хоць адбаўляй. У адным шэрагу з «тлушчбазай» і «тлушчтрэстам» чамусьці апынулася і «Венера». Апошняя характарыстыка падыходзіла ёй як ніякая іншая: нягледзячы на лішнюю вагу, Таццяна заўсёды была прывабнай.

Першыя кавалеры не прымусілі сябе чакаць. У 17 гадоў яна паехала пагасцяваць у вёску і знайшла там, як тады здавалася, свой лёс. Хлопец аказаўся маладзечанскім, і раман працягваўся ўжо ў горадзе. Аднойчы, падводзячы любую да яе дома, які знаходзіўся акурат каля аддзела ЗАГС, ён запытаў: «А слабо сюды зайсці?» — «Не слабо». Вось так ліпеньскае знаёмства перайшло ў кастрычніцкае вяселле.

А ў красавіку нарадзіўся Андрэйка. Хлопчык з'явіўся на свет сямімесячным. Ніякіх адхіленняў урачы не выявілі, але штосьці ў яго паводзінах насцярожвала юную маму. Апаска аказалася недарэмнай: дыягназ, які паставілі хлапчуку на дзявятым месяцы жыцця, прагучаў як прысуд — дзіцячы цэрэбральны параліч. Хутка пасля гэтага з сям'і сышоў малады бацька.

Шанц на тое, што калі-небудзь Андрэйка ступіць свой першы крок, быў мізэрным. Але Таццяна перш-наперш запісалася на курсы масажыстак, і замест таго, каб пячы ў духоўцы пірагі, разагравала ў ёй спецыяльны прэпарат для масажу — эзікірыт. Але ў хуткім часе ёй прыйшлося перадаверыць усе медыцынскія працэдуры сваёй матулі Людміле Іванаўне: нягледзячы на тое, што ёй было зусім не да асабістага жыцця, Таццяна нечакана нават для самой сябе другі раз выйшла замуж і пераехала жыць у вёску. Браць з сабой хворага Андрэйку яна пабаялася.

Гарадская дзяўчына, якая ніколі блізка не сутыкалася з коравамі, пайшла працаваць даяркай. Азы майстэрства засвоіла хутка, з'явілася і ўласная гаспадарка: каза з казлом, бычок, куры, гусі ды выбракаваныя свінні — з доўгімі, быццам у аўчаркі, вушамі. «У вёсцы я навучылася ўсяму, — расказвае мая суразмоўца. — Аднак я зусім перастала глядзець за сабой: у кароўніку няма розніцы, тоўстая ты ці худая».

Але больш за ўсё Таццяна шкадуе не аб тым, што дарэмна патраціла два гады на недастойнага мужчыну, які ўсё часцей і часцей прыкладаўся да бутэлькі. Яна сумуе, што не бачыла, як расце яе сын.

— Я нават прапусціла той момант, калі ён навучыўся вымаўляць гук «р», — успамінае мая суразмоўца. — Аднойчы бацькі прывезлі яго да мяне, а ён замест прывычнага мне «тлактал» ужо «рыкае» ва ўсю.

Шкадуе яна і аб тым, што адправіла сына на лячэнне ў спецыяльны інтэрнат.

— Мяне падкупіла тое, што там былі коні, — расказвае Таццяна: на той момант яна ведала нямала прыкладаў, калі прагулкі верхам дапамагалі дзеткам з ДЦП стаць на ногі.

Але ў яе і цяпер сэрца заходзіцца, калі яна ўспамінае, як аднойчы зайшла ў групу да сына, не папярэдзіўшы аб сваім прыездзе нікога з адміністрацыі, а ён у мокрых спушчаных калготах з плачам паўзе ёй насустрач. У той жа дзень Таццяна забрала Андрэйку ў Маладзечна.

Цяпер 15-гадовы хлопец, якога ўжо язык не паварочваецца называць Андрэйкам, невыразна памятае тыя часы. Для яго першыя дзіцячыя ўспаміны цесна звязаныя з асобай доктара Кораня, які зрабіў яму дзве паспяховыя аперацыі. Дзякуючы яму і, безумоўна, матулі з яе масажамі і спецыяльным доглядам, Андрэй пайшоў у школу — у самую звычайную агульнаадукацыйную школу — ужо сваімі нагамі. Знайсці разуменне з аднакласнікамі было няпроста: хлопчык не раз прыносіў дадому і след ад брудната чаравіка на спіне, і «зоркі» на лбе — сінякі ў два рады. Усё змянілася, калі матуля адвяла яго ў фітнэс-клуб. Цяпер ён выціскае 40 кг на ручным трэнажоры (на шмат больш за іншых) і можа даць здачы так, што крыўдзіцелю не пазайздросціш.

А так Андрэй нічым не адрозніваецца ад сваіх аднагодкаў: ён бязвылазна сядзіць за камп'ютарам і так і рвецца што-небудзь разабраць ці падпаліць. Аднойчы звёў цэлую шклянку любімых маміных духоў — пшыкаў імі на ўключаную фаерку і глядзеў, як узнімаецца полымя. Нягледзячы на тое, што тады яму здорава перапала — духі каштавалі 76 тысяч — на матулю Андрэй не крыўдзіцца. І абяцае, што калі стане генеральным дырэктарам, абавязкова звозіць яе адпачыць у Турцыю.

— Напэўна, сярод мам тваіх сяброў твая — самая маладая і стройная?

— Чаму толькі сярод іх? Яна самая прыгожая ў свеце!

Андрэй, напэўна, і сам пачынае верыць, што яна заўсёды была такой — тоненькай, падцягнутай, у кароткай спаднічцы і на абцасах. Хоць усяго сем гадоў таму яна важыла 98 кг проці цяперашніх 57.

Колькі сябе памятае, Таццяна заўсёды сядзела на дыетах. Першая спроба пахудзець была ў восьмым класе: кіруючыся вопытам Ларысы Долінай, яна ела печаную бульбу і запівала яе кефірам. Але скінуць вагу аказалася значна лягчэй, чым яе ўтрымаць: згаладаўшыся, Таня за дзень набірала столькі, колькі скідала за тыдзень.

Яна выпрабавала на сабе ўсе вядомыя медыцынскія прэпараты. Нават прадала залатыя ўпрыгажэнні, каб купіць «гербалайф». Але вынік заўсёды быў не такім, як ёй хацелася. А калі нарадзіўся хворы Андрэйка, яна ўвогуле стала абыякавай да сябе. І толькі ўпэўніўшыся, што сын стаў самастойным хлопцам, вярнулася да сваёй юнацкай мары — важыць столькі, колькі старэйшая сястра.

Таня пайшла ў спартзалу, нягледзячы на тое, што займацца фізкультурай ёй забаранілі яшчэ ў дзяцінстве: двайны парок сэрца — гэта вам не жарты.

— Я вырашыла не ісці на повадзе ў сваіх «балячак», і проста выкінула гэты факт з галавы, — прызнаецца Таццяна.

Першы месяц яна хадзіла ў фітнэс-клуб «Мандарын» як на працу — пяць разоў на тыдзень. Агульную нагрузку атрымлівала на аэробіцы, а ў трэнажорнай зале працавала над кожнай часткай цела паасобку. А трэнер Настасся Занько, з якой пасябравала мая гераіня, распісала ёй дыету. Але з лішнімі кілаграмамі, якія Таццяна губляла прама на вачах, прыйшла новая праблема — скура абвісла так, што можна было рукой запраўляць яе ў штаны. Тут і спатрэбіліся навыкі масажу.

— Цяпер я разумею, чаму мне не дапамагалі ні таблеткі, ні дыеты, — разважае Таццяна. — Калі ўсё будзе ў комплексе: і аэробіка, і трэнажорная зала, і правільнае харчаванне, і масаж — тады будзе і вынік. А яшчэ ніколі не трэба сябе апраўдваць, маляў, у мяне матуля пухленькая была, таму і я такая. Прычына лішняй вагі заўсёды адна — гультайства.

Саму Таню гультайкай ніяк не назавеш: яна працуе, робіць рамонт у кватэры і чатыры разы на тыдзень ходзіць у «Мандарын». Калі на выхадных да яе завітае Настасся, замест таго каб піць гарбату з торцікам, яна просіць: «Давай ты будзеш гаварыць мне, якое практыкаванне і колькі разоў рабіць, а я буду выконваць!» Як вам такі варыянт традыцыйных дзявочых пасядзелак?

Нядзіўна, што пры такой бездакорнай фігуры Таццяну не пазнаюць былыя аднакласнікі. А калі яна ў мінулым годзе зайшла разам з сынам у магазін — з рукзаком за спінай і двума хвосцікамі — у прадаўца аж мову заняло, калі Андрэй звярнуўся да яе: «Мама!». Прадавец прызналася, што прыняла іх за равеснікаў.

Але акрамя дыет і спецыяльных практыкаванняў, у Таццяны ёсць яшчэ адзін сакрэт — самы галоўны:

— Раней я часта падыходзіла да люстэрка, падбірала рукамі бакі і ўздыхала, якой бы прыгажуняй магла быць. Цяпер я змяніла палітыку: кожны ранак я гляджу на сябе з усмешкай і кажу: «Я самая прыгожая!» Гэта лепшы пачатак для новага дня і для новага жыцця.

Вікторыя КРУПЯНЬКОВА.
Фота аўтара і з архіва Таццяны ГАЙЧУК.


Да і пасля пахудзення.

САКРЭТ ПЕРШЫ: ЕШЦЕ ЧАСТА І ПАТРОХУ

Дзяўчына павінна есці, як птушачка: часта — кожныя дзве гадзіны — і патроху. Ежы трэба браць столькі, колькі змяшчаецца ў далонь. Гэта можа быць дзве лыжкі рысу, або яблык, або кавалак вараных курыных грудак.

Трэба акуратна чаргаваць бялкі і вугляводы. Лепш за ўсё харчавацца па такой схеме:

першы прыём ежы — вугляводы (каша),
другі — бялкі (мяса, рыба, яйкі),
трэці — вугляводы,
чацвёрты — клятчатка (яблык, капуста),
пяты — бялкі.

У спіс забароненых прадуктаў трапляе салодкае, мучное, а яшчэ масла, тлушч і соль.

Вараныя стравы куды больш лёгкія, чым смажаныя. Сярод мясных прадуктаў самымі дыетычнымі лічацца курыныя грудкі, сярод рыбных — хек. Нуль калорый у агурках.

Есці трэба павольна, бо сігнал аб тым, што ты ўжо не галодны, паступае са страўніка ў мозг вельмі нясхутка. За гэты час можна паспець з'есці талерку дранікаў, а можна — дзве лыжкі кашы. Зразумела, другі выпадак куды больш пажаданы для тых, хто худзее.

Пасля шасці вечара — рот на замок.

САКРЭТ ДРУГІ: ШАКАЛАД СУПРАЦЬ ЦЭЛЮЛІТУ

Супраць абвіслай скуры дапамагаюць абгортванні. Размяшайце ў адной каструлі какава-парашок, вяршкі, крыху мёду. Можна дадаць некалькі кропель апельсінавага алею, папярэдне разведзенага ў лыжцы аліўкавага. Праварыце змесіва да атрымання густой масы (гэта той жа шакалад, толькі без цукру) і нанясіце яго на праблемныя зоны (напрыклад, ногі, бакі). Потым загарніце іх харчовай плёнкай і 40 хвілін паляжыце пад цёплай коўдрай, затым змыйце.

Таксама **для абгортвання добра выкарыстоўваць блакітную гліну**, якую можна купіць у любой аптэцы. Яе трэба развесці з падагрэтай чыстай ці мінеральнай вадой без газу і наносіць так, як шакалад.

Не трэба выліваць выпітую каву. Завядзіце ў ваннай спецыяльную кружку і злівайце ў яе асадак. Калі размяшаць яго са смятанай, атрымаецца выдатны скраб, які масажуе скуру і здымае аргавелы пласт. Нанясіце скраб на цела, акуратна памасіруйце, затым змыйце.

Лепш за ўсё рабіць названыя працэдуры ў такой паслядоўнасці: скраб — абгортванне — масаж.

Бульба, бульба...

Сёлета восеньскі кірмаш у Баранавічах праходзіць не на плошчы Леніна, а каля чыгуначнага вакзала Баранавічы-Палескія. Раней у цэнтры горада, калі прадавалі гародніну, «гай шумеў», а гэтай восенню ўсё больш сціпла — няма былога размаху. Меней прадаўцоў, ды і асартымент не той.

Без праблемы можна купіць моркву (750 рублёў), цыбулю (1200 рублёў), капусту (500 рублёў), хоць да некаторых прадаўцоў стаіць чарга. Але найбольшы попыт на бульбу, і калі на іншую гародніну ў залежнасці ад якасці цана хістаецца, то кошт бульбы стабільны — 500 руб/кг.

І тут назіраецца пэўны ажыятаж. Бульбу вывозяць легкавушкамі, веласіпедамі і каляскамі, а нехта ўзваліў мех на спіну...

Адчуваецца і канкурэнцыя — адзін просіць паўтысячы, а другі за гэтыя ж грошы абяцае даставіць дамоў.

Павышаны попыт на бульбу звязаны з тым, што кошт яе заніжаны і пакупнікі гэта адчуваюць. Успомнім, што ў савецкі час бохан хлеба па цане раўняўся двум кілаграмам бульбы. Хлеб тады каштаваў 14—18 капеек, а бульба — 8—10. Сёння ж на грошы, заплачаныя за бохан, можна купіць тры кілаграмы «Скарбу». Прадаўцы кажуць, што рэальная цана бульбы 700 руб/кг, але ўбачыўшы, як актыўна яе гаспадары збываюць, можна сказаць, што на гэты момант кошт бульбы ўсіх задавальняе.

А якая прадукцыя найбольш шырока прадстаўлена на кірмашы, акрамя «другога хлеба»?

Магчыма, час капусты яшчэ не настаў, тым не менш яна найчасцей трапляецца на вочы пасля бульбы, а вось мёду ніколі не было многа. На гэты ж раз менавіта гэты прадукт прыцягнуў да сябе ўвагу.

І мёд

Белы, залацісты, зеленаваты, карычневы... мёд быў прадстаўлены даволі шырока — налічыў пад дзясятак сталоў, устаўленых слоікамі. Тут цана стабільная і не мяняецца ўжо не адно дзесяцігоддзе. Кілаграм мёду каштуе як 9-10 кг цукру. Былі гады, калі кошт хістаўся і за мёд плаціл менш, але затым цана выроўнівалася. За паўлітровы слоік мёду просяць 14 тысяч рублёў.

Толькі вось каля сталоў з мёдам народ не тоўпіцца. Рэдкі пакупнік падыдзе, доўга выбірае, смакуе...

Асноўны спажывец цягнецца да бульбы. Што ж, прадукт звыклы для нашага чалавека.

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

Турэцкая лазня ў Паставах

Першая ў Віцебскай вобласці турэцкая лазня — хамам — адкрыецца ў фізкультурна-аздараўленчым комплексе ў Паставах у кастрычніку, расказаў карэспандэнту БЕЛТА начальнік аддзела фізічнай культуры, спорту і турызму Пастаўскага райвыканкама Васіль Захарэвіч.

Лежакі (на Усходзе іх называюць чэбекашы), як і належыць, зроблены з мармуру і падагравающца. Вільготнае гарачае паветра будуць падаваць парагенератары, дзякуючы чаму дасягаецца амаль стопрацэнтная вільготнасць. Тэмпературны рэжым у турэцкіх лазнях невысокі і, як правіла, не перавышае 80 градусаў — гэта ўмова таксама абавязкова будзе захавана, паабяцаў Васіль Захарэвіч. Да таго ж, на заказ наведвальнікаў, лазеншчыкі абяцаюць цешыць іх разнастайнымі прыемнымі і карысными водарамі.

Падобныя лазні добрыя як аднаўленчыя працэдуры і карыстаюцца вялікай папулярнасцю. Таму ў фізкультурна-аздараўленчым цэнтры, які ўжо мае рускую лазню, фінскую саўну і мінібасейн, было вырашана аказваць і новы від паслуг, патлумачыў Васіль Захарэвіч. У Паставах лазня і басейн, аснашчаны вадаспадам, воднай пушкай і гейзерам, рэдка пустуюць. У пятніцу ўвесь комплекс аддадзены ва ўладу жанчын — аматарак СПА-працэдур, па суботах у лазню ходзяць мужчыны, а вось у астатнія дні тыдня комплекс працуе згодна з папярэднім запісам. Кошт знаходжання ў лазні для аднаго наведвальніка не перавышае Br10 тыс., арэнда парнай з басейнам — не вышэй за Br60 тыс.

У турэцкай лазні цяпло перадаецца целу моцнай вільготнай парай. Гэта лазня з невысокай тэмпературай — не больш як 80 градусаў. У адрозненне ад яе тэмпература ў фінскай саўне праграваецца да 140 градусаў і мае вільготнасць не больш як 10—15 працэнтаў.

ПЕШШУ — ДОБРА, АЎТОБУСАМ — ЛЕПШ

У рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Гомельаблаўтатранс» ідзе пастаяннае абнаўленне аўтобуснага парка. З пачатку года ён папоўніўся 84 машынамі, а да канца яго гэта колькасць узрасце да 122 адзінак.

Буйнейшым перавозчыкам пасажыраў з'яўляецца «Аўтобусны парк № 6». Падлічана, што за восем месяцаў ён перавёз 55 мільёнаў чалавек. Іншымі словамі, кожны жыхар абласнога цэнтра карыстаўся гарадскімі аўтобусамі каля ста разоў.

Уладзімір ПЕРНІКАЎ.

Падзеі

«НАС ДЗЕЦІ НЕ ЗРАЗУМЕЮЦЬ...»

Для заапарка набудуць новую пару ваўкоў, а мядзведзь Мікіта будзе жыць у новым мядзведніку

У гродзенскі карпункт «Звязды» патэлефанавала дзяўчынка: «Што здарылася ў нашым заапарку? Ці праўда, што там загінулі жывёлы?» На жаль, патлумачыла карэспандэнту дырэктар Гродзенскага заапарка Цэліна Пагерыла, два шэрыя ваўкі сталі ахвярамі аварыі на гарадской цеплатрасе.

Старую цеплатрасу ў наступным годзе павінны былі капітальна адрамантаваць, але яна чакаць не стала і нагадала аб сваім стане раней за гэты тэрмін. Прычым заапарк аказаўся ніжэй за ўзровень, дзе адбыўся прарыў трубы, і гарачая вада хлынула на яго тэрыторыю, у тым ліку ў клетку ваўкоў. Гэта адбылося так хутка, што выратаваць жывёл не паспелі.

— Мы ў калектыве вельмі перажываем, што так здарылася, — гаворыць Цэліна Іванаўна. — У лесе ідзе паляванне і трэба папрацаваць, каб ваўка абкласці і забіць. Ды і калі воўк хітры, то ў яго ёсць шанцы выратавацца. А тут пасадзілі жывёл у клетку і вось такая бяда... Шкада, безумоўна. Кіраўнік прадпрыемства, на чыім балансе знаходзіцца гэта цеплатраса, паабяцаў набыць для заапарка іншую пару ваўкоў. «Інакш нас дзеці не зразумеюць», — сказаў ён.

Дарэчы, адна з мэтаў глабальнай рэканструкцыі, якая праводзіцца ў Гродзенскім заапарку, — якраз стварэнне зручных, бяспечных умоў для жывёл. Распачалі яе з будаўніцтва павільёна для цеплалюбівых капытных, бо ранейшае памяшканне было ў аварыйным стане і ў любы момант магло абваліцца. Ды і наогул, літаральна ўсюды, можна сказаць, латка на латцы. І вельмі правільна, адзначае Цэліна Пагерыла, што кіраўніцтва вобласці прыняло рашэнне не аб нейкім касметычным рамонце, а аб поўнай рэканструкцыі заапарка. Яна праводзіцца за кошт сродкаў абласнога і рэспубліканскага бюджэтаў, агульная сума затрат можа перавысіць 20 мільярдаў рублёў.

Рэканструкцыю мяркуецца завяршыць праз два гады, а пакуль цяжка не толькі супрацоўнікам заапарка, але і жывёлам, якіх на сёння больш за тры тысячы. Многія з іх знаходзяцца ў стрэсавым стане і адмаўляюцца ад корму з прычыны пераходу з месца на месца, у неўласцівыя ім вальеры. Праўда, для шэрагу гадаванцаў сітуацыя ўжо стабілізавалася. Акрамя цеплалюбівых капытных, атрымалі пастаянную «прапіску» ў новых павільёнах горныя капытныя жывёлы і буйныя драпежныя птушкі. А неўзабаве адбудзецца наваселле ў холадалюбівых і цеплалюбівых дробных драпежнікаў.

У новую «кватэру» пераселіцца і дзевяцімесячны мядзведзь Мікіта, які трапіў у Гродна са Жлобінскага звярынца. Прыжыўся ён някепска, рэагуе на сваю мянушку, але чамусьці, здаецца Цэліне Іванаўне, вочкі ў яго сумныя. Мо, сяброўкі не хапае? Хутчэй за ўсё мядзведзіцу даставяць з Расіі.

Таксама з Расіі (з Краснаярска самалётам, а затым аўтамашынай) дабіралася ў горад над Нёманам і львіца Саяна. У Гродне спадзяваліся, што яна складзе добрую пару са старажылам заапарка па мянушцы Сімба. Аднак пакуль надзеі на патомства не спраўдзіліся. Самка ахвотна ідзе да льва, а той інтарэсу не праяўляе. Гэта, верагодна, звязана з тым, што ў Каўнаскім заапарку, дзе Сімба нарадзіўся, маці адмовілася яго выкормліваць і давялося загадчыцы секцыі рабіць гэта штучна. А ў такіх выпадках часта бывае, што ў жывёл згасае палавы інстынкт. Як ні стымулявалі Сімбу, як ні мянялі яго рацыён — пакуль безвынікова.

Што датычыцца харчавання, то прэтэнзій у гадаванцаў заапарка быць не павінна. Толькі мяса штодзённа спажываецца больш за 60 кілаграмаў. А яшчэ — яйкі, мяса птушак і трусоў, вітамінныя і мінеральныя дабаўкі... У рацыён, напрыклад, мядзведзя Мікіты ўваходзяць свежая рачная рыба, мёд, арэхі, пячэнне. Для драпежных птушак у віварыуме заапарка спецыяльна разводзяць белых, так званых лабараторных пацукоў і мышэй — больш за дзве тысячы галоў. Жывы корм таксама абавязкова патрэбны ў перыяд падрыхтоўкі да гону лісіцам, куніцам, собалям, норкам. А капітныя жывёлы зімой атрымліваюць больш канцэнтратаў. Праўда, для буйных драпежнікаў прадугледжаны і так званы разгрузачны дзень — нядзеля, калі іх наогул не кормяць. Рэагуюць нармальна, «галодных бунтаў» не бывае.

Сёлета на білетах заапарк зарабіў ужо больш за 200 мільёнаў рублёў (цяперашняя цана — 2 тысячы рублёў для дарослых і 700 рублёў — для дзяцей), а дзяржаўныя датацыі складаюць на гэты год каля 1 мільярда рублёў. Фінансаванне стабільнае. Акрамя таго, праводзіцца акцыя «Апека» — шэфства над тымі ці іншымі прадстаўнікамі жывой прыроды з боку ўсіх, хто пажадае. Да прыкладу, адна жанчына, індывідуальны прадпрымальнік, ужо даўно фінансуе харчаванне коніка — поні, а медыцынская фірма «Лодэ» апякала маноклевую кобру, прадпрыемства «Хімвалакно» — белых лебедзяў. А яшчэ да адной пазабюджэтнай крыніцы забеспячэння догляду гадаванцаў заапарка самае непасрэднае дачыненне маюць... браканьеры. Дакладней, інспектары рыбаховы. Канфіскаваная ў затрыманых парушальнікаў свежая рыба ў першую чаргу дастаецца пелікану.

Ад калегаў з Харкаўскага заапарка ў Гродне ўжо атрымалі парады наконт праекта будаўніцтва слановуніка і спадзяюцца ў бліжэйшыя гады знайсці замену Сураку, які жыў тут каля сарака гадоў.

— Увогуле ж пашыраць відавую разнастайнасць, асабліва што датычыцца рэдкіх жывёл, цяпер вельмі складана. І гэта праблема не толькі нашага заапарка, — адзначае Цэліна Пагерыла.

Купіць тых жа чорных пантэраў, пумаў, далёкаўсходніх леапардаў, ягуараў, якія раней без асаблівых перашкодаў траплялі на пражыванне ў Гродзенскі заапарк, сёння практычна немагчыма ні за якія грошы. Справа ў тым, што не даецца дазвол на адлоў жывёл, колькасць якіх у прыродзе скарачаецца. А размнажэнне тых, якія былі завезены ў заапарк 10—20 гадоў таму, з'яўляецца праблематычным з-за блізкароднаснага скрыжавання. Бо калі яны і размнажаюцца, то маладняк атрымліваецца нежыццяздольным.

Кожны від рэдкіх жывёл цяпер знаходзіцца пад кантролем куратара (у Галандыі, Германіі альбо іншай краіне), у якога ёсць інфармацыя аб калекцыях усіх заапаркаў Еўропы. І толькі з яго дазволу можна разлічваць на пакупку новага гадаванца. Пры гэтым дакументальна пацвердзіўшы, што створаны адпаведныя ўмовы для яго пражывання. І гэта яшчэ адзін аргумент на карысць рэканструкцыі Гродзенскага заапарка.

Барыс ПРАКОПЧЫК.
Фота Яраслава ВАНЮКЕВІЧА.

НАША ДАВЕДКА:

Першае ўпамінанне аб вялікакняскім звярынцы, які размяшчаўся на левым беразе Нёмана, насупраць Старога замка, адносіцца да 1560 года. Там пражывалі алені, ласі, касулі і нават зубры. А заснаванне ў Гродне заапарка — гэта заслуга знаўцы прыроды, выкладчыка біялогіі гарадской гімназіі Яна Каханоўскага. Па яго ініцыятыве ў 1926 годзе быў закладзены батанічны сад, які неўзабаве перарос у заалагічны парк.

У 1942 годзе за забойства жандара і раненне паліцэйскага гітлераўцы ўзялі ў закладнікі 100 прадстаўнікоў гродзенскай інтэлігенцыі, у тым ліку і Яна Каханоўскага. Кожнага чацвёртага павінны былі расстраляць, і сярод гэтых ахвяраў аказаўся чалавек, чыя жонка была на апошнім месяцы цяжарнасці. І тады Ян Каханоўскі выказаў жаданне прыняць смерць замест гэтага чалавека. Афіцэр даў Каханоўскаму 10 хвілін на роздум, але той свайго рашэння не змяніў...

У перадваенныя гады любімцай наведвальнікаў Гродзенскага заапарка была малпачка па мянушцы Како. Невядома, як склаўся яе лёс з пачаткам вайны, калі заапарк быў разбураны, а жывёл, якія не загінулі, вывезлі ў заапарк Кенігсберга. Але ёсць звесткі, што туды трапіў з Гродна зубр, у якога на новым месцы капалі з вачэй слёзы. Быццам ён сумаваў аб страчанай радзіме. Легенда? Ці, можа, чыстая праўда?

«Жывіца» дапаможа

Штогод на Гомельшчыне 80-90 дзяцей упершыню прызнаюцца інвалідамі па хваробах нервовай сістэмы, у тым ліку 30-40 дзяцей — у сувязі з дзіцячым цэрэбральным паралічом. Гэта статыстыка суадносіцца з сусветнай.

Каб дапамагчы такім дзецям і іх бацькам, пад эгідай ЮНІСЭФ спецыялісты Мінскай 19-й гарадской дзіцячай паліклінікі на базе Гомельскага абласнога дзіцячага цэнтра медыцынскай рэабілітацыі «Жывіца» праводзяць рэспубліканскі навучальны семінар. Гэтая лячэбная ўстанова паспяхова аказвае комплексную рэабілітацыйную дапамогу дзецям з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця, пачынаючы з 9-месячнага ўзросту.

Справа ў тым, што менавіта ў раннім узросце магчыма праводзіць спецыяльныя тэсты-скрынінгі, каб выявіць адхіленні ў развіцці дзіцяці. Правільны дыягназ, гаворыць дактары, гарантыя аказання прафесійнай дапамогі для прадухілення цяжкіх наступстваў і магчымай інваліднасці.

Дактары-неўролагі, рэабілітолагі, псіхолагі і лячэбныя педагогі вывучаюць, якім чынам лепей аказваць раннюю дапамогу такім дзецям. У праграму ўключаны тэарэтычныя заняткі, практычныя трэнінгі, прадстаўленне клінічных выпадкаў з рэалізацыяй праграмы ранняй дапамогі.

В. АЎРАМЕНКА.

Гербы гарадоў Беларусі. Гербы Оршы і Нясвіжа

19 верасня 2008 года Міністэрства сувязі і інфарматызацыі Рэспублікі Беларусь увяло ў паштовае абарачэнне мастацкія паштовыя маркі «Герб Оршы» і «Герб Нясвіжа» з серыі «Гербы гарадоў Беларусі», падрыхтаваныя ІЦ «Марка» РУП «Белпошта». Мастак Ігар Бубен.

Хутка сцюжа на ўзлескі абрыне,
І мяне гэты час не мінe —
Я з паходняй чырвонай рабіны
Выступаю насустрач зіме.
З той паходняй прайду скрозь кастрычнік,
Дзе кастры залатыя бяроз,
Лістападам пайду — хто падлічыць,
Колькі лісця ў нябыт ён аднёс,
А як снежань зацемрыць аблогі —
Мне паходня ў сам раз, каб прайсці,
Цераз студзень, дзе чэзнуць дарогі
Прад навалай завейнай начы.
Далей ведаю: люты саступіць —
Прад паходняй слабак ягамосць...
Ў Свеце кожны за лепшае рупіць,
Калі ён гаспадар, а не госць.
Я не госць, я тутэйшы, не горшы
І, як некалі продкі рабілі,
Я рабіну нясу у прыгоршчах
Каб завеі мяне не скарылі.

Выпрабавана на сабе

КАНДУКТАР.

ЧАЛАВЕК З ЖАЛЕЗНЫМІ НЕРВАМІ

Пайсці на гэты крок мяне прымусілі дзве рэчы: першая — журналісцкая цікавасць, а другая — выпадкова пачутая размова кантралёра-кандуктара з сяброўкай. «Праца кандуктара — занятак небяспечны: нядаўна адной жанчыне руку зламалі, а ў другой, збіўшы, выручку ўсю скралі. Едзеш вечарам — і баішся. Пра вусныя абразы я ўжо не ўзгадваю...»

На форуме minsktrans.by — афіцыйным сайце агенцтва КУП «Мінсктранс» — акрамя скаргаў на расклад руху транспарту, падзяк некаторым кіроўцам і кандуктарам, а таксама процьмы пытанняў, з'яўляюцца часам і скаргі пасажыраў на работу кандуктараў-кантралёраў: то тое не так, то сёе не гэтак.

Каб паспрабаваць разабрацца ва ўзаемаадносінах «кандуктар-пасажыр», я вырашыў на адну працоўную змену апрануць на сябе жылет кандуктара.

* * *

—ВОСЬ, калі ласка. Адна з апошніх скаргаў на аднаго з кандуктараў нашага дэпо, — паказваючы мне раздрукаваную з вышэйназванага форуму скаргу ўводзіць у курс спраў **намеснік дырэктара філіяла трамвайнага парка ТКУП «Мінсктранс» Людміла КАВАЛЁВА.** — У трамваі ў жанчыны-кандуктаркі адсутнічаў бэдж. Я сама асабіста тэлефанавала кандуктарцы, якая працавала ў той дзень на той трамвайнай лініі. Высветлілася, што бэдж проста зламаўся (адляцела спружына, якая адказвае за яго прымацаванне), таму жанчына была вымушана пакласці свой бэдж у кішэню — не сыходзіць жа ўвогуле з лініі! Калі б хто прасіў паказаць той бэдж — яна б з кішэні дастала і паказала. Але ж ніхто не прасіў, а скарга ёсць. Такія вось у нас пасажыры.

Гэта скарга — электроннае паведамленне пад нумарам 2699, чарговая вестачка ад пастаяннага наведвальніка Аляксандра.

— Вельмі часта скардзяцца якраз тыя, хто не хоча плаціць за праезд, — працягвае Людміла Анатолеўна. — А ўвогуле, прафесія кандуктара — гэта прафесія людзей з жалезнымі нервамі. Нядаўна падлеткі, гадоў па чатырнаццаць, абазвалі матам адну з нашых кандуктарак. І гэта толькі проста пасля просьбы заплаціць за праезд. Бедная кандуктарка была ў шоку. У яе ж дзеці такога ўзросту. Але жанчына малайчына, стрымалася.

Пры адборы кандыдатаў на працу кандуктарамі ў трамвайным парку іх абавязкова запытаюць: «Што вы будзеце рабіць у выпадку, калі пасажыр адмовіцца плаціць?» І калі кандыдат адкажа, нешта тыпу «я яго проста з трамвая выкіну», то звычайна такому чалавеку адмовяць у месцы.

Графік працы ў кандуктараў — чатыры дні першай змены, затым два выхадныя і чатыры дні другой змены. Стаўка кандуктара ў трамваях уведзена толькі з 5 ліпеня 2006 года. Сёння ў трамвайным парку 125 кандуктараў, з якіх толькі тры чалавекі — мужчыны. Увогуле, як расказала Людміла Анатолеўны, сярод кандуктараў іх дэпо, можна сустрэць людзей самых розных прафесій — ад педагогаў да артыстаў.

— Трамвайны рух у Мінску быў адкрыты 13 кастрычніка 1929 года, — распавёў **начальнік Расціслаў ЮРЭНЯ.** — На сёння ў парку працуе 960 чалавек, з якіх 350 — вадзіцелі (больш за палову — гэта вадзіцелі першай катэгорыі)...

«На прыпынку «вул. Ясеніна» ў пяць гадзін. Глядзіце не спазняйцеся, дзяжурная машына адыходзіць у пяць нуль пяць...» Голас начнога дыспетчара чацвёртага аўтапарка папярэджваў мяне з тэлефоннай трубкі пра «дзяжурку», якая падвозіць да працы вадзіцеляў і кандуктараў, што жывуць у розных канцах горада. У мяне значылася першая змена і мой трамвай на лінію выходзіў а шостай гадзіне.

«А чаму гэта мне спазняцца, — падумалася мне. — Я і не спазнюся. Сёння нават рукзак на заўтра збяру. Што б узяць такога? Вазьму хлеб, каўбасу трэба не забыцца парэзаць, пакласці яшчэ гэтыя булачкі і ваду 0,5 газаваную...»

* * *

«Малады чалавек, ну і куды мы так спяшаемся ў пяць гадзін раніцы?» — заспаным, але зацікаўленым голасам спытаў у мяне таксіст, у машыну якога я заскочыў. Такім жа заспаным, але узрушаным голасам я адказаў:

— На працу. Кандуктар я...

— Цікава-цікава. Ну, і як вам працуецца?

— У мяне першы дзень сёння...

— Нядрэнна ж вы пачынаеце, — шчыра засмяяўся мужчына, нагадаўшы пра маю гіперпунктуальнасць.

А мне было не да смеху. Дзяжурку я праспаў, цёплы пуловер апрануў не на той бок, а самае страшнае — булачкі забыўся.

У трамвайны парк, такім чынам, халодным вераснёўскім ранкам я прыехаў, заплаціўшы 25 тысяч. Але быў і свой плюс: усе 18 кіламетраў дарогі ад хаты да парка я слухаў жыццёвыя выпадкі з жыцця таксістаў...

КАЛІ ВАМ сказалі, што рабочы дзень кандуктара пачынаецца з цёплага трамвая, вас нахабна надурылі. Усё пачынаецца... з алкатэстара мадэлі 203. П'яным кандуктарам — бой.

— Ну вы і апрануліся, — дзівілася кандуктарка-напарніца Галіна Баярэвіч. — Трэба было цяплей апрануцца, а то так і захварэць нядоўга.

Галіна Аляксееўна па адукацыі эканаміст, але шмат ёй даводзілася працаваць і не па спецыяльнасці. Адсюль — багаты вопыт стасункаў з людзьмі.

— Мне, у прынцыпе, усё роўна што прадаваць, талоны ці нафту, — жартуючы, усміхаецца Галіна Баярэвіч. — А хамы, яны паўсюль хамы, на іх проста не трэба звяртаць увагу. Самае цікавае, што людзі-працаўнікі, з мазалямі на руках, ніколі табе і слова не скажуць — заўсёды за свой праезд заплацяць. А вось розныя дамачкі з манікюрам, якія і ездзяць на трамваі можа толькі разы два на месяц, часам бываюць чымсьці і незадаволеныя. У асноўным, адмаўляюцца плаціць. Але я ж не для сябе гэты талон прадаю. Мне ад яе талона ні холадна, ні горача. Грошы за рэалізаваныя талоны ідуць на ўдасканаленне парка, з'яўляюцца новыя вагоны, утульныя сядзенні... Некаторыя гэтага не разумеюць і сваю злосць выплюхваюць на кандуктара. За такіх людзей мне соромна перад тымі, хто свой праезд аплаціў.

Цэлую гадзіну мы ехалі ў паўпустым трамваі, пасажыраў было няшмат і амаль усе з праязнымі. Многія з кандуктарам нават віталіся.

— Многіх пасажыраў за гэты час, які я працую тут, ведаю ўжо нават у твар. Ды і з раніцы першая гадзіна звычайна — гэта пасажыры, якія вяртаюцца з працы ў начную змену. Іх ужо і запомніць паспяваеш. За праезд заўсёды сумленна плацяць. Звычайна я не даводжу да канфлікту. Навошта? Гэта ж як ланцуговая рэакцыя. Можа завесціся ўвесь салон. Толькі настрой сапсуецца і ў пасажыраў, і ў мяне. У нас пасля змены некаторыя кандуктары, асабліва маладзенькія дзяўчаткі, плачуць нават, расказваючы пра тое, якія абразы ім даводзілася цярпець на гэты раз. Шкада.

«Дакладна вырашыў? Можа адмовішся?» — правярала мяне на смеласць Галіна Аляксееўна.

Сістэма была няцяжкая. Палова салона мая, другая палова — маёй калегі.

Як ні дзіўна, але амаль на ўсіх пасажыраў стракаты жылет кандуктара-кантралёра дзейнічаў аднолькава. Людзі, зайшоўшы, адразу цягнуліся да кашалька. Нават нічога не кажучы. Зайшоў — заплаціў — едзеш.

— Ой, ведаеце, а мне толькі адзін прыпынак... — павярнулася да мяне прыгожая дзяўчына, ласкава ўсміхнуўшыся. Як хлопец, я автона дараваў бы ёй гэту няшчасную паездку. Мо і нумарок узяў бы. Але як хлопец-кантралёр я...

— Усім нам толькі адзін прыпынак, — апярэдзіла мяне бабулька ў смешным берэце. — Плаці ці выходзь.

І як на дзіва, дзяўчо адразу і заплаціла, толькі заплаціўшы, ужо адвярнулася ад мяне... Былі і «летуценнікі» (не толькі студэнты, але і розныя пажылыя дзядзечкі), якія пільна глядзелі ў акно, быццам прыліпшы да яго, зусім «забыўшыся» на таго кандуктара і на той праезд. Падумаеш, праехаць жа няшмат. Зразумела ж, адзін прыпынак...

* * *

НАБЛІЖАЛАСЯ дзясятая гадзіна — абед. У запасе 60 вольных хвілін. Дыспетчарская станцыя «Возера», якая стала нашым канцавым прыпынкам, для кандуктараў — месца, дзе можна не толькі перакусіць, але і крыху адпачыць. Акрамя прыбіральні і буфета, там быў нават тэлевізар з мяккімі канапамі.

— А вы таксама наш? Я вас раней не бачыла, — па-гаспадарску запытала ў мяне буфетчыца, калі вырашыў зайсці перакусіць.

— Ваш, але сёння я апошні дзень, — сціпла адказаў я.

— Раз наш, міласці просім. Што будзеце есці? Тут супчык, тут катлетка. Не, гэтую катлетку не бярыце, яна дарагая — пяць тысяч, вы лепш гэтыя каўбаскі вазьміце. Смачныя і каштуюць танней.

Паеў я на славу. Ды і заплаціў няшмат. Пастаянныя супрацоўнікі могуць харчавацца тут і за кошт парка, проста ў канцы месяца гэтую суму возьмуць з іх заробку.

* * *

Накінуўшы куртку і схаваўшы такім чынам свой жылет, мая дарадца і калега прысела. Адлічыўшы пэўную колькасць білетаў і трохі грошай, сказала: калі што якое — я сяджу тут.

...«Скажыце, а да бальніцы я даеду?», «Ліцэй БДУ ў гэтым кірунку?», «А мы паварочваем ля кінатэатра «Мір» ці прама едзем?», «А ля метро мы спыняемся?», «Ой, а ў якім трамваі я еду?». Пытанні сыпаліся на маю галаву як дождж. Кандуктар для многіх — гэта не толькі каса, але і даведка. Нават у іншых пасажыраў запытаць можна.

Здаралася, што людзі і самі мяне адшуквалі. Праўда, рэдка.

— Дзяўчына, а што ў вас на праезд?

— У мяне кашалёк у сумцы, не хоча даставацца.

— Дык можа я дапамагу?

У адказ неахвотны позірк, затым вінаватая ўсмешка і кранальныя словы:

— Ой, а можна мне так? Я ж выходжу на наступнай. У мяне сёння дзень нараджэння...

— А чаму тады абавязаны плаціць вось гэтыя хлопцы? Можа, у іх таксама дзень нараджэння? У пасажыраў аднолькавыя правы.

Адчуўшы позіркі падтрымкі з боку хлопцаў, я чакаў. Здавалася, што палова трамвая сочыць за мной. Нехта з ухмылкай, нехта са спачуваннем, нехта з абыякавасцю.

* * *

«Малады чалавек, вы мне рэшту няправільна далі», — падышла да мяне маладая дама ў стыльным паліто. «Прабачце», — замяўся я. У мітусні я не дадаў жанчыне дзесяць тысяч. Многія, асабліва маладыя пасажыры, з пачуццём перавагі над табою працягваюць купюры часам у 20 тысяч, 50 тысяч...З надзеяй, што не будзе чым даць рэшты. Але, на радасць кандуктара, рэшта звычайна знаходзіцца. У выпадку з гэтай жанчынай я, адлічваючы рэшту, задумаўся, і замест дзевятнаццаці даў толькі дзевяць. Так што будзьце ўважлівыя, пасажыры. Кандуктар можа проста і не заўважыць сваёй памылкі.

— Неяк аднойчы быў у маёй практыцы адзін пасажыр, які заўсёды плаціў 100-тысячнай купюрай, — узгадвае Людміла Аляксееўна. — І вельмі часта ў мяне не было чым даць рэшты. Так ён і ездзіў, задаволены сабой. А аднойчы пры выхадзе на лінію я наўмысна ўзяла з сабою сто тысяч рублёў дробнымі купюрамі. Як жа быў здзіўлены той мужчына, калі чарговы раз, працягваючы мне адну банкноту, атрымаў сваю рэшту і квіток.

А вось пайшлі і першыя знаёмыя. «Толькі не пазнавайце мяне», — у думках прасіў я бабу Клаву, у якой на кватэры жыве мая сяброўка... Тая, на шчасце, і не пазнала.

Час пік у нашу змену прыйшоўся з адзінаццаці да трынаццаці гадзін дня. Гляджу, адвярнуўшыся ў іншы ад мяне бок, ля самых дзвярэй стаіць хлопец. «Што ў вас на праезд?» З выглядам чалавека, які робіць пазыку, хлапчо працягвае грошы. «Калі ласка, вось ваш талон». Адказ быў рэзкі, гучны і поўны нянавісці: «Вазьмі яго сабе!»

Тыповая сітуацыя.

—ЛЮДМІЛА Аляксееўна, а які наш план? — пасля таго, як мы здалі змену, па дарозе ў трамвайны парк, дзе мы павінны яшчэ здаць выручку, пытаю я ў жанчыны.

— Дзвесце тысяч, тут усё залежыць ад карткі. Картка — своеасаблівы графік працы, які бывае розным па часе: восем гадзін, пяць альбо толькі тры.

— Як вы лічыце, справіліся?

— Думаю што так, больш за тое — нават і перавыканалі. А ты малайчына. Такі шустры, вучышся на хаду. Быццам усё жыццё кандуктарам працаваў. Прыходзь на нас працаваць. Ды толькі я табе па сцэнічным майстэрстве двойку паставіла б — кандуктары не апранаюць на працу такія дарагія туфлі.

Я ў сваю чаргу са шкадаваннем узгадаў не столькі кеды, падрыхтаваныя пад ложкам, колькі булачкі, пакінутыя на стале, і каўбасу, парэзаную на кавалкі...

...А план мы перавыканалі. Выручка склала 513 250 рублёў. Большая палова грошай была выручана за продаж праязных. 286 200 — ад рэалізацыі квіткоў. А была гэта адна з самых доўгіх картак.

— Аднойчы па тэлевізары чула, што Алесь Адамовіч — вядомы пісьменнік, неяк таксама з кандутара пачынаў, — прыгадала Людміла Баярэвіч. — Дык я і падумала: паеждзу яшчэ трохі, а пасля таксама кнігі пісаць пачну. І першымі будуць мемуары «Як я была кандуктаркай...»

І хто ведае, можа сярод шэрагу гісторый туды патрапіць і выпадак са мной?

Ілья ЛАПАТО.

У **суд Рэчыцкага раёна Гомельскай вобласці** паступіла заява аб прызнанні адсутным без вестак **Маякова Уладзіміра Уладзіміравіча,** 29 верасня 1970 года нараджэння, ураджэнца в. Туравічы Калінкавіцкага раёна Гомельскай вобласці, апошняе вядомае месца жыхарства — г. Васілевічы, вул. Першамайская, д. 59 Рэчыцкага раёна Гомельскай вобласці.

Просьба да ўсіх грамадзян і юрыдычных асобаў, якія маюць звесткі пра Маякова Уладзіміра Уладзіміравіча, паведаміць іх суду Рэчыцкага раёна Гомельскай вобласці на працягу двух месяцаў з дня апублікавання аб'явы.

Утерянные филиалом Белгосстраха по г. Минску два стикера к **страховым полисам РЕСО-ГАРАНТИЯ серии ААА № 0221108410 и № 0219075626** считать недействительными.

Віктар ГАНЧАРЭНКА:

МНЕ НЕ ПАДАБАЕЦЦА СТАДЫЁН «ДЫНАМА»

Учора ўвечары на мінскім стадыёне «Дынама» адбыўся першы хатні матч барысаўскага БАТЭ ў групавым этапе Лігі чэмпіёнаў. Барысаўскі клуб процістаяў аднаму з грандаў еўрапейскага футбола турынскаму «Ювентусу». Італьянская каманда прыляцела ў беларускую сталіцу за дзень да матча і пасялілася ў гатэлі «Crown Plaza». Галоўны трэнер «Старой сеньёры» Клаўдзіа Раньеры прывёз у беларускую сталіцу каманду ў наступным складзе: Манінгер, Кіменці, К'еліні, Мельберг, Грыгера, Леграталье, Саліхамі-джыч, Недвед, Княжэвіч, Камаранэзі, Маркісіа, Джавінка, Сісока, Малінара, Цьягу, Нокі, Марк'ёні, дэ Чэлье, Амауры, Яквінта, дэль П'ера. Асноўны варатар «Ювентуса» Джанлуіджы Буфон матч з БАТЭ прапускаў з-за траўмы, а паўабаронца Крыстыян Поульсан атрымаў ад трэнерскага штаба некалькі дзён адпачынку. Пазаўчора ў 19 гадзін на стадыёне «Дынама» нашы госці правялі трэніроўку, а да гэтага галоўныя трэнеры абодвух камандаў сустрэліся з журналістамі.

Барысаўскі клуб перад матчам трэніраваўся на сваёй базе ў Дудзінцы. Як растлумачыў Віктар Ганчарэнка, у клуба была магчымасць засяліцца ў Мінску і трэніравацца на стадыёне «Дынама», аднак гэты варыянт быў адхілены. «Мне не падабаецца стадыён «Дынама». Па-першае, з-за вязкага газона, які аднімае шмат сілаў. Па-другое, гэта стадыён нашага прамога канкурэнта ў нацыянальным першынстве. Мы любім свой стадыён у Барысаве», — заявіў Віктар Ганчарэнка. У адрозненне ад сапернікаў БАТЭ падышоў да матча ў аптымальным складзе, адсутнічалі толькі раней траўмаваны капітан Ермаковіч, для якога сезон, хутчэй за ўсё, закончаны, і Максім Жаўнерчык. «Калі гулец не дапрацоўвае на трэніроўках, нам не па дарозе. Максім — адзін з самых перспектыўных гульцоў нашага першынства, аднак у яго няма жадання развіваць свой талент», — пракаментаваў галоўны трэнер БАТЭ гульню за дубль гэтага футбаліста.

Нічыю ў матчы з «Ювентусам» Віктар Ганчарэнка напярэдадні матча назваў станоўчым вынікам. «Аднак у ідэале хацелася б перамогі», — заявіў свае прэтэнзіі на матч барысаўскі трэнер. «Нашы футбалісты ўбачылі і адчулі, наколькі ў сённяшнім футболе важная хуткасць у валоданні мячом, хуткія кантратакі. На гэтым фоне ўдала згулялі з «Шахцёрам» у нацыянальным чэмпіянаце. Гэта самы каштоўны наш вопыт». Віктар Ганчарэнка расказаў, што ўжо пасля кваліфікацыйных гульняў у замежных клубаў з'явіўся інтарэс да гульцоў БАТЭ. Аднак да канца сезона гэтыя прапановы не будуць ні агучвацца, ні разглядацца.

Абаронца БАТЭ Віталь Казанцаў расказаў, што апошнія два тыдні прайшлі вельмі хутка, і футбалісты дзбютуюць у першай хатняй гульні з вялікім жаданнем супрацьстаяць саперніку дастойна. «Пасля такіх сапернікаў, як «Рэал», патрабуюцца дадатковыя рэсурсы, каб настроіцца на гульні нацыянальнага чэмпіянату. На «Ювентус» жа нікога дадаткова настройваць не трэба. Хоць мы з павагай ставімся да ўсіх сваіх сапернікаў. І яны да нас — на матчах з «Шахцёрам» і «Гомелем» футбалісты добра да нас ставіліся і, упэўнены, хваробы за нас.» Параўноўваючы «Рэал» і «Ювентус», Віталь Казанцаў аддаў перавагу італьянскаму клубу. «Ювентус» надае шмат увагі абароне, а ў нападзенні разлічвае ў асноўным на клас нападаючых. Таму для мяне «Ювентус» больш зручны». Самым моцным бокам турынскай каманды Казанцаў назваў нападаючага Аляксандра Дэль П'ера, які цяпер знаходзіцца ў фантастычнай форме. «У кваліфікацыі мы адчувалі вялізны ціск і адказнасць за вынік. За пройгрыш у групе, улічваючы нашых сапернікаў, мяркую, ніхто ў нас камень не кінуў бы. Хацелася б, каб быў поўны стадыён, на падтрымку балельшчыкаў мы вельмі разлічваем».

Клаўдзіа Раньеры на прэс-канферэнцыі выказаў спадзяванне, што яго каманда ўсё ж здолее перайграць саперніка. «Да БАТЭ я стаўлюся з вялікай павагай. Гэта маладая каманда, але яна ўжо дасягнула вялікіх поспехаў. На сваім полі беларусы павінны паказаць выдатную гульню». Галоўны трэнер «Старой сеньёры» ўзгадаў, што ў пятнаццаці апошніх матчах нацыянальнага першынства барысаўскі клуб нязменна забіваў, і наракаў на тое, што ў той жа час ў серыі А ў «Ювентуса» не ўсё ладзіцца, а некалькі вядучых футбалістаў з-за траўмаў адсутнічаюць. У складзе беларусаў галоўны трэнер «Юве» вылучыў Блізнюка, Радзівонава і Крыўца: «Беларусы надзвычай небяспечныя ў кантратаках. Таксама адзначу двух цэнтральных абаронцаў, якія ўмеюць падключацца да атак і гуляць галавой. Яны забілі ў вароты «Леўскі», прычым абодва разы са стандартаў. Нам трэба быць асцярожнымі».

Нападаючы турынскага клуба Аляксандра Дэль П'ера запэўніў журналістаў, што праглядаў матчы барысаўскага клуба і некаторых футбалістаў ведае. Манера кантактавання выдавала ў Дэль П'ера футбаліста топ-узроўню: ён ахвотна адказваў на пытанні, пазіраваў фатографам і адпрацоўваў аўтограф-сесію. Пасля прэс-канферэнцыі ў італьянскай каманды была першая трэніроўка на абноўленым да гульняў Лігі чэмпіёнаў стадыёне «Дынама». Чвэрць гадзіны журналістам і нават некаторым балельшчыкам дазволілі паназіраць за апрабоўваннем газона футбалістамі «Юве», якія адпрацоўвалі работу з мячом. Пасля чаго беларускія амонаўцы фразамі на англійскай(!) ветліва папрасілі прэсу і балельшчыкаў пакінуць трыбуны. Цывілізацыя прыйшла разам з камісарамі УЕФА ў беларускі футбол гэтай восенню.

Алена АЎЧЫННІКАВА.

Растуць з «Лініяй росту»

23—24 верасня ў філіяле ААТ «Белаграпрамбанк» — Мінскае абласное ўпраўленне і яго аддзяленнях прайшоў Дзень адчыненых дзвярэй «Сістэма зберажэнняў «Лінія росту». У яго межах 23 верасня ў філіяле банка адбылося вішаванне самых маленькіх кліентаў — удзельнікаў акцыі «Дзіцячая ашчадная праграма «Расці вялікі!», якія святкуюць свой дзень нараджэння ў першым месяцы восені.

ўпраўлення ААТ «Белаграпрамбанк» Ніна ЛЯСУН адкрывае новы разлікова-касавы цэнтр.

Больш за дзясятак юных мінчан разам з бацькамі прыйшлі ў гэты дзень у філіял банка па праспекце Пераможцаў, 91. Менавіта тут у свой час бацькі і адкрылі для іх уклад. Цяпер юныя кліенты банка штогод атрымліваюць віншаванні з Днём нараджэння і падарункі. А бацькі не толькі размясцілі свае грашовыя сродкі на выгадных умовах, але і атрымалі дадатковыя магчымасці: атрымаць крэдыт для аплаты навучання дзіцяці ў ВНУ і крэдытную карту на спецыяльных умовах. Акрамя таго, усіх удзельнікаў акцыі «Дзіцячая ашчадная праграма «Расці вялікі!» чакае прыемны сюрпрыз.

На дзіцячым свяце ў Белаграпрамбанку для юных мінчан наладзілі гульні і конкурсы з вясёлым клоунам, а пасля іх чакаў папугай Гоша — казачны герой ЗТАА «Марозпрадукт» са сваімі салодкімі падарункамі. Імяніннікі верасня — а гэта Яна Хомсі, Сяргей Юкевіч, Андрэй Цяглік і Яроменка Алеся надоўга запомняць гэты свой Дзень нараджэння. А вось Галіна Зміцер, маці 7-гадовых Юлі і Максіма, расказала, што прыйшла ў банк па сваіх справах і атрымала запрашэнне на свята, пасля чаго прыняла рашэнне адкрыць уклад «Расці вялікі!» на дваіх дзяцей. «Мінімальная сума, на якую можна адкрыць дэпазіт, — мільён рублёў — не такая і вялікая, прычым умовы размяшчэння сапраўды выгадныя».

А 24 верасня ў 14 гадзін адметная падзея адбылася ў Калодзішчах — адкрыццё разлікова-касавага цэнтра № 2 па вуліцы Кароткая, 1А. Новы офіс ААТ «Белаграпрамбанк» афармлены з улікам усіх сучасных тэндэнцый развіцця банкаўскага сэрвісу і арыентаваны, перш за ўсё, на аказанне паслуг фізічным асобам. Тут кліенты банка могуць размясціць свабодныя грашовыя сродкі ва ўклады, ажыццявіць аплату за тавары і паслугі, купіць або прадаць неабходную валюту, аформіць страхавыя полісы і атрымаць страхавое кампенсаванне, аформіць крэдыт, а таксама атрымаць шэраг іншых паслуг. Намеснік начальніка Мінскага абласнога ўпраўлення ААТ «Белаграпрамбанк» Ніна Лясун адзначыла, што згодна з кліентаарыентаванай стратэгіяй банка, офісы адкрываюцца там, дзе недастаткова развіта банкаўская інфраструктура.

У даступных для наведвальнікаў месцах залы новага разлікова-касавага цэнтра размешчана неабходная даведачная інфармацыя. Уладальнікі пластыкавых картак маюць магчымасць ажыццявіць увесь спектр банкаўскіх аперацый з дапамогай тэрміналнага абсталявання. Новая зала абслугоўвання ажыццяўляе стандарт, якога, у адпаведнасці з даручэннямі кіраўніка дзяржавы, будзе прытрымлівацца Белаграпрамбанк падчас будаўніцтва і рэканструкцыі будынкаў усіх сваіх падраздзяленняў на тэрыторыі нашай краіны. У афармленні выкарыстаныя карпаратыўныя колеры банка — аранжавы, шэры і белы, якія ствараюць святочны настрой кожнаму, хто пераступае парог новага офіса.

Алена КРАВЕЦ.

Імяніннік Сяргей ЮКЕВІЧ з падарункамі ад Гошы і Белаграпрамбанка.

ФОНД «МИНСКОБЛГОСИМУЩЕСТВО»

4 ноября 2008 года в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5

ПРОВОДИТ АУКЦИОН

по продаже объектов, находящихся в республиканской собственности, и права заключения договоров аренды земельных участков, необходимых для их обслуживания

На аукционные торги выставляются:

Сведения о капитальных строениях и их местонахождении	Продавец недвижимого имущества, и арендодатель земельного участка	Основные характеристики капитальных строений	Общая площадь, кв. м.	Площадь земельного участка, отведенного для обслуживания капитальных строений, га (для каких целей)	Срок аренды земельного участка, лет	Начальная цена продажи предмета аукциона, руб. (в т.ч. объекта/ аренды земельного участка)	Сумма задатка единого предмета аукциона, руб.
ЛОТ № 1. Капитальное строение (инв. № 640/С-1080), расположенное по ул. Вечеркевича, 28 в г. Слуцке Минской области	Продавец: Республиканское унитарное предприятие «Минское областное агентство по государственной регистрации и земельному кадастру», расположено по адресу: г. Минск, ул. Папанина, 7, тел. (017) 2262854, (01795) 53620 Арендодатель: Слуцкий райисполком	Здание (административное с гаражом), одноэтажное, фундамент бетонный, стены и перегородки кирпичные, крыша совмещенная, полы дощатые линолеум, вентиляция – естественная, имеются инженерные коммуникации, 1966 года постройки (модернизация проведена в 2002 году)	377,0	0,1057 (для размещения объектов соцкультбыта, жилья) Введено ограничение в использовании земельного участка – расположен в водоохранной зоне р. Случь	25	108 917 708 (91 369 328 / 17 548 380)	8 000 000
ЛОТ 2. Капитальное строение (здание магазина-столовой) (инв. № 613/С-6323), расположенное по ул. Победы, 26 в пос. Крупский Крупского района Минской области	Продавец: Государственное лесохозяйственное учреждение «Крупский лесхоз», тел. (01796) 58709, 58731 Арендодатель: Крупский райисполком	Здание одноэтажное, фундамент железобетонный, стены и перегородки кирпичные, перекрытие железобетонное, крыша совмещенная с рулонным покрытием, полы бетонные, вентиляция – естественная, инженерные коммуникации отсутствуют, 1975 года постройки	471,8	0,2905 (для обслуживания здания магазина-столовой)	50	85 266 549 (84 823 736 / 442 813)	5 000 000

К участию в аукционных торгах допускаются: юридические лица, индивидуальные предприниматели, граждане Республики Беларусь и иностранные граждане, представившие в фонд «Минскоблгосимущество» в сроки, указанные в извещении, следующие документы:

заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на текущий (расчетный) счет, указанный в извещении;

юридическим лицом – доверенность, выданная представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель), нотариально удостоверенные копии учредительных документов и свидетельства о государственной регистрации, также представитель должен иметь при себе паспорт или иной документ, удостоверяющий личность;

индивидуальным предпринимателем – нотариально удостоверенная копия свидетельства о государственной регистрации, представителем индивидуального предпринимателя дополнительно представляется нотариально удостоверенная доверенность;

иностранным юридическим лицом – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский (русский) язык, представителем иностранного юридического лица дополнительно представляется легализованная в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский (русский) язык, а также паспорт или иной документ, удостоверяющий личность;

гражданином Республики Беларусь и иностранным гражданином – паспорт или иной документ, удостоверяющий личность, представителем гражданина Республики Беларусь и иностранного гражданина – нотариально удостоверенная доверенность.

ПОБЕДИТЕЛЬ ОБЯЗАН: 1. В течение 10 рабочих дней со дня принятия райисполкомом решения о представлении победителю аукциона земельного участка возместить расходы, связанные с организацией и проведением аукциона, а также расходы, связанные с формированием земельного участка, в том числе с государственной регистрацией создания земельного участка;

2. Внести плату, взимаемую за право заключения договора аренды земельного участка.

После совершения победителем аукциона действий, названных в пунктах 1, 2, но не позднее 2 рабочих дней, с ним в установленном порядке Продавцом имущества заключается договор купли-продажи недвижимого имущества, а Арендодателем земельного участка – договор аренды земельного участка.

Порядок проведения аукциона определен в соответствии с «Положением о порядке организации и проведения аукционов по продаже объектов государственной собственности и на право заключения договора аренды земельного участка для обслуживания недвижимого имущества», утвержденного постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26 марта 2008 г. № 462.

Фонд «Минскоблгосимущество» (организатор аукциона) имеет право снять предмет аукциона в любой момент до даты проведения аукциона.

Все **расчеты по сумме задатка** производятся путем перечисления их на расчетный счет фонда «Минскоблгосимущество» № 3642900000841 в ОАО «АСБ Беларусбанк» в г. Минске, код 795, ул. Мясникова, 32, УНН 100128686.

Заявки на участие в аукционе принимаются ежедневно в рабочие дни с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 312, тел. 224 57 09. Последний день подачи заявок 31 октября 2008 г. до 17.00.

Кірмаш — штотыднёвы рэкламны выпуск № 28 (596)

аддзел рэкламы 287-17-79

ПРЫВАТНЫЯ АБВЕСТКІ

ПРАДАЕЦЦА

❒ Зруб дома 6,3х12,3 у Клецкім раёне.
Тэл. 767 37 07.

❒ Кватэра 4-пакаёвая, другі паверх, у г. Шчучыне, або абмяняю.
Тэл. 8 01514 29 546.

❒ Кватэра 3-пакаёвая, кааператыўная, маецца гараж, у райцэнтры г. Гарадок.
Тэл.: 8 0212 48 08 09,
8 029 216 17 09.

❒ Палова пачатага будаўніцтва 2-кватэрнага дома з майстэрняй у Брэсцкім раёне, сямейнаму кампаньёну без шкодных звычак, для сумеснай будоўлі і справы.
Тэл. 8 029 801 69 81.

❒ Катэдж 2-павярховы (газ, вада) каля р. Нёман, 40 км ад г. Ліды, 18 тыс. у.а.
Маб. тэл. 889 95 10.

❒ Бульбасаджалка 4-радковая, конная бульбакапалка, касілка, з/ч да польскай бульбакапалкі.
Тэл.: 8 01795 98 248,
8 029 577 82 48.

❒ Акардэон «Weltmeister» поўны, 11х5 рэгістраў.
Тэл. 8 029 249 51 83.

❒ Прадаюцца авечкі.
Тэл. 8 033 633 92 17.

❒ Кацёл для лазні (на цвёрдым паліве).
Тэл. 8 017 242 72 42.

❒ Козы высокаўдойныя, зааненскай пароды, племянны казёл.
Тэл.: 8 02234 35 646,
8 044 714 17 20.

КУПЛЮ

❒ Мотаблок і трактар, можна ў нерабочым стане.
Тэл. 8 033 665 87 69.

❒ Старадаўнія ўзнагароды, узнагародныя знакі, знакі вайсковых ВНУ, манеты і інш.
Тэл. 8 029 553 43 66.

❒ Трактар МТЗ.
Тэл. 8 029 655 07 16.

❒ Арачнік, ангар.
Тэл. 8 029 337 33 38.

❒ Магазін, офіс.
Тэл. 8 029 798 14 42.

РОЗНАЕ

❒ Здаецца палова дома ў Савецкім раёне г. Мінска.
Тэл.: 8 017 247 02 63,
8 029 262 74 10.

❒ Мяняю 2-пакаёвую прыватызаваную кватэру ў Віцебску і 3-пакаёвую кааператыўную ў райцэнтры Гарадок (з даплатай) на кватэру ў Мінску ці Санкт-Пецярбургу.
Тэл. 8 029 217 17 09.

ЗВЯЗДА

КУПОН ДЛЯ БЯСПЛАТНАЙ ПРЫВАТНАЙ АБ'ЯВЫ

Запоўніце разборліва, выражце і вышліце на адрас рэдакцыі: 220013 Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10 А. Тэлефон для даведак 287 17 79.

АБАВЯЗКОВЫЯ звесткі не для друку: ваша прозвішча, адрас, хатні тэлефон.

Пашпарт серыя_____ № _____ Выданы_____

Подпіс_____ Дата_____

СКАНВОРД

Склаў Андрэй МІХАЙЛАЎ.



Кіназала

Мінск накрыла «Канаманія»

Сумесны праект Мінскага кінавідэапракату і радыё «Юністар», дзякуючы якому ў беларускай сталіцы дэманструюцца лепшыя фільмы — удзельнікі афіцыйных праграм Канскага кінафестывалю, адкрыў сёлета свой чацвёрты сезон.

— Усе карціны, якія праходзяць «загартоўку» ў Канах, як правіла, атрымліваюць прызнанне ў свеце. У тым ліку і ў свеце камерцыйнага кіно, — адзначае адзін з ініцыятараў праекта, радыёжурналіст і кінааналітык Ігар Сукманаў, які некалькі гадоў запар працуе на Канскім фестывалі. — Слава Эміра Кустурыцы, Педра Альмадовара, Вонга Кар-Вая пачалася менавіта з гэтага фестывалю. А сёлета, напрыклад, міжнароднае журы і прэса высока ацанілі расійскую праграму, у прыватнасці, работу маладога рэжысёра Валеры Гай Германікі «Усе памруць, а я застануся», якую мы таксама прапануем мінскім гледачам.

У праекце, як заўважаюць яго стваральнікі, стаўка робіцца не толькі на знаёмства з лепшымі ўзорамі сусветнага кіно, але і на перадачу асаблівай фестывальнай атмасферы. Дзеля гэтага сеансам папярэднічае «нарэзка» з унікальных фестывальных кадраў. Але разам з тым «Канаманія» — гэта не

элітарнае «высокалобае» кіно для невялікай колькасці інтэлектуалаў, гэта кіно для самых шырокіх колаў зацікаўленых гледачоў з добрым густам. Нездарма цяперашні праект распачаўся фільмам Эміра Кустурыцы «Марадона вачыма Кустурыцы» — вясёлым, энергічным, але галоўнае — жыццёвым, які сам вялікі футбаліст назваў самым праўдзівым кіно аб сабе.

Што яшчэ ўбачаць гледачы на пастаяннай пляцоўцы «Канаманіі» — у зале сталічнага Дома Кіно? З 10 кастрычніка пачнецца паказ постмадэрнісцкага фэнтэзі «мяча і дроту», рэстаўраванай і дапоўненай версіі фільма Вонга Кар-Вая — «Прах часоў». З 23 кастрычніка плануецца паказ першага поўнаметражнага фільма Валеры Гай Германікі «Усе памруць, а я застануся» — дарэчы, ён стартуе адначасова з прэм'ерай у Расіі. У далейшых планах — прадставіць беларускім кінааматарам работу Вудзі Алена «Вікі Крысціна Барселона», паказаную ў Канах па-за конкурсам, але тым не менш унесеную крытыкамі ў дзясятку лепшых фільмаў фестывалю. Таксама ў спісе магчымых прэм'ер — кінаальманах «Токіо», які аб'ядноўвае работы і імёны трох знакамітых рэжысёраў. Увогуле, стваральнікі праекта паабяцалі, што ў сезон, які працягнецца з кастрычніка па май, да наступнага Канскага фестывалю, новыя фільмы будуць прадстаўляцца гледачам прыкладна раз на месяц.

Варта нагадаць, што «Канаманія» — гэта некамерцыйны праект. Увогуле, паводле слоў генеральнага дырэктара УП «Мінскі кінавідэапракат» Васіля Коктыша, у Мінску дэманструецца вельмі многа арт-хаўснага, некамерцыйнага кіно — за 8 месяцаў гэтага года было паказана 118 карцін. Для параўнання: «камерцыйных» стужак за гэты час мінчане ўбачылі ўсяго 55.

2 кастрычніка ў Доме кіно працягнецца яшчэ адзін новы перспектыўны праект «Акно ў Венецыю», які прадстаўляе адкрыццё сёлетняга Венецыянскага кінафестывалю — фільм братоў Коэнаў «Спаліць пасля прачытання».

Вікторыя ЦЕЛЯШУК.

На здымку: кадр з фільма «Вікі Крысціна Барселона».

ШЫПШЫНА

СВЕТ І СУСВЕТ ЧАЛАВЕКА

Шыпшына атрымала сваю назву ад вострых шыпоў. У народнай культуры шыпшына сімвалізавала мужчынскае цела і маладосць. У старадаўніх паданнях расказваецца пра тое, што ў Лады (багіні кахання ўсходніх славян), было два сыны: Лель (Амур) і Палель (Гіменей) — бог шлюбу. На вяселлі, каб блаславіць маладых, Палель прыходзіў заўсёды ў залачоным адзенні. Яго галава была ўпрыгожана вянком, у які былі ўплецены ружовыя кветкі шыпшыны.

● З шыпшыны варылі варэнне, кісялі, сушылі яе, таму што больш за ўсё карысных рэчываў (асабліва каштоўны ўзімку вітамін С) захоўваецца ў пладах, калі іх сушыць у цёмным і халаднаватым месцы.

● Народныя лекары раілі выкарыстоўваць плады шыпшыны пры прастудзе, малакроўі, рэўматызме, гіпертаніі, а таксама як супрацьзапаленчы, мачагонны і жаўцягонны сродак.

● Святую Арыну, якая ўшаноўваецца ў народным календары 1 кастрычніка звалі Арынай-шыпшынніцай, таму што ў гэты час паўсюдна збіралі плады шыпшыны, каб нарыхтоўваць на зіму.

Аксана КАТОВІЧ, Янка КРУК.

Усміхнёмся!

Рэкламнае.

Ляжаць два белыя мядзведзі каля хаткі палярнікаў, раптам дзверы адчыняюцца, і з дзікім крыкам выбягае на мароз голы палярнік, яго завальвае снегам з казырка і ён уцякае назад.

Першы мядзведзь:

— Трэба было яго з'есці!

Другі:

— Пачакай, заўтра тоўсты першым пойдзе!

☺

Для падтрымання захапляльнай размовы з жанчынай дастаткова метадычна, моўчкі ківаць галавой.

☺

Выкладчык — дзяўчыне:

— Я бачу, ты хутка выйдзеш замуж.

— Але ж мой Саша пакуль не хоча.

— Я ясна бачу дзве палоскі — куды ён дзенецца!

— Цікава, як гэтая кляча змагла першай прыйсці?

— Ну-у, падганяць давялося...

Знаходка

ГЭТА БЫЎ СЛОН ЦІ МАМАНТ?

У Жлобінскі краязнаўчы музей паступіў цікавы экспанат: амаль паўтараметровая костка, якая была знойдзена на размытым беразе невялікай рачулкі. Мяркуецца, што яна належала так званаму лясному слану. Гэты від звяроў знік з твару зямлі каля 95 тысяч гадоў таму.

Уладзімір ПЕРНІКАЎ.

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	7.12	18.45	11.33
Віцебск —	7.02	18.34	11.32
Магілёў —	7.02	18.35	11.33
Гомель —	6.58	18.33	11.35
Гродна —	7.27	19.01	11.34
Брэст —	7.27	19.02	11.35

Месяц

Першая квадра.

Месяц у сузор'і Скарпіёна.

Імяніны

Пр. *Арыядны, Ірыны, Соф'і, Барыса, Веньяміна, Івана, Іларыёна, Міхаіла, Уладзіміра, Яўмена.*

К. *Дануты, Тэрэзы, Ігара, Марка.*

НАДВОР'Е на заўтра

Неспрыяльныя дні і гадзіны ў кастрычніку

1, серада, 1.00—3.30
2, чацвер, 22.00—24.00
3, пятніца, 1.00—14.00
6, панядзелак, 0.00—3.00
7, аўторак, 18.30—23.00
8, серада, 1.00—14.30
11, субота, 0.00—2.00
13, панядзелак, 4.00—6.00
15, серада, 6.30—9.30
17, пятніца, 6.30—9.30
19, нядзеля, 9.30—11.00
21, аўторак, 11.00—13.30
23, чацвер, 17.00—20.00
26, нядзеля, 1.00—3.00

Дзве даты

1 кастрычніка

1398 год — заключаны Салінскі дагавор (на востраве Салін на Нёмане), у адпаведнасці з якім Вялікае Княства Літоўскае вымушана было ўступіць Тэўтонскаму ордэну частку тэрыторыі Жамойціі, у той жа час Вітаўт быў аб'яўлены баярамі «Каралём Літвы і Русі».

1946 год — у горадзе Нюрнберг у Міжнародным ваенным трыбунале завяршыўся судовы працэс па справе галоўных нацысцкіх ваенных злачынцаў (пачаў работу 20 лістапада 1945 года). Працэс праводзіў Міжнародны ваенны трыбунал, створаны Лонданскім пагадненнем паміж СССР, ЗША, Францыяй і Вялікабрытаніяй, да якога далучыліся яшчэ 19 дзяржаў. Пад суд былі аддадзены 24 ваенныя кіраўнікі фашысцкай Германіі.

Цытата дня:

«Лепш зразумець мала, чым зразумець дрэнна».

Анатоль Франс (1844—1924), французскі пісьменнік.

У МІНСКУ Ў ДЗВЮХ СЕМ'ЯХ ВЫХОЎВАЮЦЬ ПА АДЗІНАЦЦАЦЬ ДЗЯЦЕЙ

У чатырох сем'ях — па дзевяць дзяцей, у сямі — па восем, у дзесяці — па сем. 36 бацькоў гадуюць па шэсць дзяцей. Больш за ўсё шматдзетных сем'яў (іх у горадзе больш як 4800), у якіх выхоўваюцца па трое дзяцей.

Алеся ШАБАН, «Мінск—Навіны».

Карціна Рэпіна...

Землякі мае, альшанцы — людзі асаблівыя: смелыя, прадпрымальныя! Каб капейку сям'і зарабіць, дзе толькі не ездзілі!.. (Хоць называлася гэта заўжды аднолькава — «паехаць на Алтай»).

Дык вось. Адпрацавалі яны неяк на тым Алтаі, атрымалі грошы, пахавалі, хто куды мог, вяртаюцца дамоў. На перакладных, як кажуць: у Маскве адна перасадка, у Мінску — другая...

Купілі, значыць, туды білеты, парадаваліся, што хутка цягнік, рашылі, што трэба ж яшчэ ў дарогу купіць, трэба ж цягніку вяртанне крыху адзначыць.

Скінуліся, далі аднаму з мужыкоў сетку-авоську, адправілі ў краму. Ганец — чалавек сумленны: усе даручэнні выканаў, усё што трэба купіў... Як на ліха, у гастраноме тым нейкая заваруха ўсчалася — міліцыя, мусіць, злодзея лавіла, а пахапала ледзь не ўсіх...

І адпусціла, лічы, адразу ж — нейкія там хвіліны прайшлі, але цягнік за гэты час — ту-ту, як кажуць.

Адстаў наш альшанец. Стаіць на платформе, патыліцу чухае, думае, што рабіць. І тут, раптам, «падкатваецца» да яго нейкі гаварун, ветліва так пытаецца:

— Можа вам, выпадкам, да Мінска трэба?

Альшанец грошы пад падкладкай памацаў (бо «раскусіў жа» — бандыт з вялікай дарогі) і маўчыць.

А мужык — па-свойму гэты жэст зразумеў. Кажа:

— Не, не бойцеся, грошай я з вас не вазьму. Спадарожніка проста шукаю — хачу, каб жывы чалавек побач быў... Я, ведаеце, у Мінску ў міністэрстве працую, раніцай патэлефанавалі, выклікалі ў Маскву. А цяпер во — назад трэба. Дык вы, калі нам па дарозе, можа саставіце мне кампанію — забавіце, каб не заснуў?

«Ага, залівай-залівай, — думае альшанец, — ведаем мы такіх міністэрскіх... За горад зараз вывезеш...».

А з другога боку і паехаць ахвота — аж сэрца гарыць!.. Павагаўся крыху, сеў!

...Па дарозе, дзякаваць Богу, ніякіх прыгод у іх не было: разазнаёміліся, пагаманілі, з'елі штось разам, вадзіцель з гадзіну паспаў, — альшанец папільнаваў і яго, і машыну... А вось калі ў Мінск прыехалі...

«Ганец» жа на вакзал адразу падаўся — сябрукоў сустракаць (ну каб далей ужо разам...). А мужыкі ўсю дарогу тарнаваліся — шкадавалі яго, думалі дзе ён і як. А тут — дзверы ў вагоне адчыняюцца — глянь, стаіць...

Тут ужо не вытрымаў тата. Закрычаў яму:

— Ты можешь абъяснить, что произошло?!

Дзядзька ўздыхнуў, выцер лоб, сказаў:

— Дзякуй богу, нічога страшнога. Аглабля зламалася, драбіна адна... Людзі — усе ў парадку.

— А при чем здесь мы?! — не сунімаўся тата.

— Ну як жа, — здзівіўся дзядзька, — вам жа крычалі, вас жа прасілі злажыць парасон? Каня ж з-за яго панесла. А вы...

Цяпер ужо да нас дайшло, што і сапраўды вінаватыя: тата, выходзячы на рыбалку, узяў не толькі плашч, але і парасон. Да таго ж — мамін, чырвоны. Вось конь і спужаўся, нарабіў бяды...

Яе (зразумела) нам маглі дараваць. Але ж не адразу. Хутчэй за ўсё, дзядзькі тыя з воза прышлі б «высвятляць адносіны». І наўрад ці зразумелі б, што мы проста не ведалі, што такое парасон.

Таму да ўрокаў беларускай мовы я цяпер стаўлюся больш чым сур'ёзна. І сябрам сваім расказаў, што няведанне яе не вызваляе ад адказнасці: прынамсі, кухталёў на той рыбалцы мы маглі «налавіць» куды болей, чым дзядзька рыбы.

Павел ПЛЯСКОЎ,
г. Мінск.

А каня — не чорт панёс...

Мае бабулі і дзядулі, мае бацькі — па нацыянальнасці рускія. Я — нарадзіўся ў Мінску, у Беларусі, але мовы беларускай амаль што не чую. Хіба толькі ў школе, на ўроках. Настаўніца ў нас добрая, але мае аднакласнікі вучыць гэты прадмет не хочуць, бо лічаць, што ён ім не спатрэбіцца.

Я некалі думаў таксама. Але цяпер — не...

Аднойчы летам мы ўсёй сям'ёй (гэта значыць, мама, тата, наш сабака Томік і я) паехалі ў вёску да маёй хроснай. Цэлы дзень там нешта рабілі, а пад вечар рашылі адпачыць — з'ездзіць на рыбалку.

Да гэтага — рыбы я ні разу не вудзіў, таму дарослыя тата і дзядзька Дзіма паказалі мне, як трэба чапляць чарвяка, як закідваць вуду, як сачыць за паплаўком і што рабіць, калі ён заварушыцца...

Аднак паплаўкі — і мой, і татаў — ляжалі на вадзе спакойна, глядзець на іх было зусім не цікава, таму я больш пазіраў навокал — на дзядзьку Дзіму, што стаяў на другім баку азярца, на кусты, на дарогу. Тым больш што на ёй якраз — з'явілася павозка.

Што далей было, — мы не зразумелі б, мусіць, ніколі. На ваду ўпалі першыя кроплі дажджу, тата стаў даставаць з сумкі плашч і ўсё, што ён браў на гэты выпадак, а конь той на дарозе як ашалеў — панёсся з гэтакай хуткасцю...

— Парасё! Парасё, — закрычала жанчына, што сядзела на возе.

— Т-р-р-р! — у тры горлы раўлі мужыкі.

Не ведаю, што падумаў тут тата, — я ж рашыў, што ў гэтых людзей адначасова здарылася дзве бяды — уцякло парася і паляцелі тармазы ў павозцы.

Чым ім можна дапамагчы, мы, на жаль, не ведалі. Бачылі толькі (хоць глядзець было й страшна), што гравійка зварочвала ўлева, конь — ляцеў напрасткі, а да нас — лічы, з гэткай жа хуткасцю, нёсся наш дзядзька.

— У машыну! Хутчэй! — скамандаваў ён.

Мы з татам нічога не зразумелі, але твар у дзядзькі быў вельмі страшны, і мы адразу ж ускочылі ў машыну.

Я яшчэ падумаў, што ўцякаем — як у кіно. Гэта значыць, дзядзька адразу ж даў па газах, сарваўся з месца і спыніўся толькі ў лесе кіламетры праз тры.

Але і потым, бачачы сябрука, ён раз-пораз прыгаворваў:

— Сыдзі, каб мае вочы цябе не бачылі.

А куды ж ты сыдзеш, калі вакол — як у песні, стэп ды стэп кругом?..

Што да Кампартыі, то неяк яна і без расколу...

Аж не верыцца — такая глыбіна была!..

Яўген НЕСЦЯРОВІЧ,
г. Чэрвень.

Чакай дабра...

Хто пра што — а я пра Вальдэмара.

Ну дык вось: неяк раніцой з балючай галавой выйшаў ён з хаты. Чуе — недзе недалёка грымоцце стаіць. Ды ў сто разоў мацнейшае, чым у ягонай галаве. Цікава! Ён куфайку на плечы і ў лес.

А там — бачыць — паляўнічыя. І незвычайныя (звычайныя ідуць да першага куста, дзе стрэльбы ў кучу і складваюць...). Гэтыя ж вёрст з пяць адмахалі. І галоўнае — чым займаюцца? Па бутэльках страляюць. А што ўжо самае страшэннае — спачатку па пустых, потым (у Вальдэмара сэрца абарвалася)... поўную паставілі. «Бо (яму так патлумачылі, калі целам яе закруў) прыкусіць няма чым. Прынясеш — і табе нальём».

— Ды гадам буду, прынясу! — закрычаў Вальдэмар і стаў ліхаманкава думаць, што ж і адкуль прынесці.

Не далёка, як быццам, дом. Да гіблоты там саленняў-варэнняў. Але ж не сунешся, бо жонка — горш, чым тая міліцыя: арыштуе, пасадзіць і не знай, калі выпусціць... Трэба да маці. Там тая ж з'яда, але мо недачуе, ці недабачыць, а я тым часам каўбасу з шастка і сцягну...

Матчына хата стаяла непадалёк ад ягонай і каўбасы ў запечку там насамрэч віселі. А гаспадыні — дома не было, аб чым сведчыў капач пад дзвярыма (іншых запараў яна не прызнавала)...

Карацей, зайшоў Вальдэмар, схапіў каўбасу і ходу.

Прыйшла ці не следам маці. Адразу ж здагадалася, што ў хаце хтось быў — капач не так пастаўлены — паглядзела на шасток, стала (па-свойму) лічыць каўбасы:

— Пара, пара, пара, не пара! Во злыдзень, — раскусіла адразу ж сына, — я табе пакажу! Толькі з'явіся!

Каб лепшае што! У гэты час, у лесе налілі паляўнічыя сабе і Вальдэмару па чарцы-другой, пакаштавалі той каўбасы, пахвалілі і кажуць:

— А яшчэ прынясеш?

Вальдэмар (ведама ўжо «прыняўшы»!) — наперад і з песнямі: прыбег, капач адставіў, каўбасу сцягнуў...

Старая праз нейкі час зноў у хату, зноў да шастка, да свайго багацця, зноўку давай лічыць:

— Пара, пара, пара... Пара! Во паразіт, заела-такі сумленне, назад аднёс! — узрадавалася старая.

...Бо яно ж добра, калі ўсё сыходзіцца — з каўбасамі, справаздачамі ну і гэтак далей.

А. ЛІПЕНЬ,
Іўеўскі раён.

Рубрыку вядзе Валянціна ДОЎНАР.

Ад яе ж заўсёднае — пішыце!

КЛЁВА!

Практыка

ЯК ПРАВІЛЬНА ПРЫВЯЗАЦЬ РЫБАЛОЎНЫ КРУЧОК

Уменне правільна прывязаць кручок неабходна кожнаму рыбалову, таму пра гэта сёння і пагаворым.

Вузел з лёскі не павінен развязвацца пры намаканні, а лёска на вузле не павінна абрывацца, калі прыкладзенае намаганне складае не меней за 95 працэнтаў яе разрыўной нагрузкі. Лепш за іншыя адказваюць гэтым патрабаванням вузлы ў выглядзе спіральнай спружыны (мал. 1). Такім вузлом можна прывязваць як кручкі з кольцам, так і з лапатачкай. Зацягнуты вузел шчыльна абхоплівае цаўё кручка разам з прыціснутай да яго лёскай. Перагібу лёскі пры гэтым няма, што забяспечвае трываласць злучэння. Калі спіральныя вузлы правільна завязаныя і зацягнутыя, яны кампактныя і хораша выглядаюць.



Вузел са стопарнай пятлёй

Парадак прывязвання лёскі да кручка гэтым вузлом наступны. Лёску прыкласці да цаўя кручка, стварыць паслядоўна петлі а і б (мал. 2). Пятлю б, лёску і кольца (або лапатачку) кручка заціснуць паміж пальцамі (зона кантакту паміж кончыкамі пальцаў пазначаная пункцірам). Злева направа ў адзін рад шчыльна абматаць лёску вакол цаўя кручка, зрабіўшы 5-10 віткоў. Абмотку заціснуць паміж пальцамі, каб яна не аслабла і віткі не пераблыталіся.

Ліквідаваць пятлю б (мал. 3), пацягнуўшы за лёску пятлі а па стрэлцы 1. Ушчыльніць абмотку, пацягнуўшы за канец лёскі па стрэлцы 2. Пацягнуўшы за лёску па стрэлцы 3 (мал. 5), паменшыць пятлю а, увесці ў яе кончык лёскі па стрэлцы 2 і шчыльна зацягнуць пятлю. Пятля павінна застопарыць кончык лёскі, каб вузел не развязаўся. Атрыманы вузел ссунуць да кольца (або лапатачкі) кручка (мал. 5) і павярнуць такім чынам, каб лёска па стрэлцы 3 выходзіла з вузла зверху (з боку джала кручка). Канчаткова зацягнуць вузел па стрэлках 3 і 4.

Свабодны канец лёскі адрэзаць на адлегласці 2-3 міліметры ад стопарнай пятлі вузла. Гэты вузел шырока выкарыстаюць рыбаловы, бо для яго завязвання не патрабуецца ніякіх прылад. З яго дапамогай лёгка і хутка прывязваюць не толькі кручкі, але і мармышкі. Адзіны недахоп — канец лёскі, накіраваны ў бок ад цаўя кручка, на 2-3 міліметры выступае за межы стопарнай пятлі вузла, што часам можа перашкаджаць пры падсечцы. Спіральны вузел без стопарнай пятлі завязваюць з дапамогай швейнай іголкі з такім вушкам, у якое можна прасунуць лёску. Паслядоўнасць завязвання і зацягвання гэтага вузла паказаная на мал. 6—9.

Лёску, кручок і іголку трэба скласці разам (мал. 6) і заціснуць пальцамі. Свабодны канец лёскі завесці за іголку і наматаць на цаўё кручка справа налева 5-10 віткоў лёскі. Абмотку ў выглядзе спіралі заціснуць паміж пальцамі.

Кончык лёскі ўвесці ў вушка іголкі (мал. 7). Не саслабляючы ціску пальцаў, іголку выняць з абмоткі, працягнуўшы канец лёскі ўнутры спіралі (мал. 8). Па чарзе падцягваючы лёску па стрэлках 1 і 2, ушчыльніць віткі спіралі, пры гэтым сачыць, каб яны не пераблыталіся.

Створаны вузел ссунуць да кольца (або лапатачкі) кручка і павярнуць у патрэбнае становішча, як паказана на мал. 9. Канчаткова зацягнуць вузел па стрэлцы 3. Свабодны канец лёскі абрэзаць на адлегласці 0,5 міліметра ад першага вітка спіралі. Абодва спіральныя вузлы зрэшты падыдуць і для прывязвання кручкоў, у якіх няма кольца або лапатачкі. Іх нярэдка спецыяльна выдаляюць для атрымання малапрыкметнай снасці. Каб вузел пры зацягванні не саслізнуў з цаўя, яго карысна палудзіць і нанесці на слой палуды насяканне нажом або надфілем.

Асноўнай вартасцю спіральнага вузла з'яўляецца тое, што лёска ў ім шчыльна прыціснутая віткамі да цаўя і накіраваная ўздоўж яго восі, таму ў час эксплуатацыі практычна не пераціраецца. Кручок з'яўляецца як бы працягам лёскі.





Парады бывалых

ДАЛЁКІ ЗАКІД ЗВЫШЛЁГКАЙ СНАСЦЮ АБО НА ЗАМЕНУ ШТЭКЕРУ

Усе хочуць кідаць далёка звышлёгкія паплаўкі, але не ўсе хочуць карыстацца штэкерным вудзілішчам.

Цяпер усё больш і больш людзей пачынаюць карыстацца «штэкерамі». На мой погляд, гэтая снасць не вельмі зручная як у транспарціроўцы, так і ў карыстанні. Кароткае вудзільна значна зручнейшае, але ўзнікае праблема немагчымасці выкарыстання звышлёгкіх аснастак. Альтэрнатыва ўсё ж ёсць.

Каб далёка кінуць, трэба дадаць паплаўку груз, які б не ўплываў на адчувальнасць аснасткі.

● Пенапласт лепш выкарыстоўваць цвёрды (ад паплаўкоў з марскіх сетак або нешта падобнае) для надання трываласці, ды і плывучасць у яго будзе лепшая.

● Груз лёгка робіцца з ліставога свінцу (абмотка тэлефонных кабеляў) накручваннем яго на цыганскую іголку і наступнай апрацоўкай напільнікам.

● Адтуліна ў пенапластавым шарыку (аліўцы) раю рабіць крыху меншай за падрыхтаваны груз і прамазаць водатрывалым клеем (выбірайце клей, які не расшчапляе пенапласт).

● Не рабіце занадта цяжкія грузы, шарык павінен трымацца на паверхні вады.

● Пасля ўстаноўкі грузу ў пенапласт пакрыйце ўсё водатрывалым лакам (пенапласт лёгка ўбірае ваду).

Падыходзіць для стацыянарных паплаўкоў і тых, якія слізгаюць.

Аснастка выкарыстоўваецца мной ужо гадоў пяць і паказала сябе вельмі і вельмі добра.

М. МАЛЫ.

ЗВЯЗДА
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА
ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь
РЭГІСТРАЦЫЙНЫ НУМАР 1.

Галоўны рэдактар У. НАРКЕВІЧ. РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, С. ГРЫБ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, Т. ПАДАЛЯК, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, І. ШЧУЧЭНКА.

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 51, юрыдычнага — 287 19 68, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 21 03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 74 13 92, Баранавічах: 7 26 02, Магілёве: 32 74 31; бухгалтэрыі: 292 22 03; прыём рэкламы тэл./факс: 287 17 79, *e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by*, рэдактар рэкламнага аддзела — тэл./факс 292 04 52.

http://www.zviazda.by

e-mail: info@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар.

Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку».

Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.

Тыраж 33.136 Індэкс 63850. Зак. № 5361. Нумар падпісаны ў 19.30.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12